Павел Церашковіч

# КУЛЬТУРНАЯ ГЕАГРАФІЯ

Нарысы

Мінск

2018

# УСТУП

Культурная геаграфія – гэта навуковая дысцыпліна, якая даследуе ўзаемадзеянне разнастайных формаў і вынікаў чалавечай дзейнасці і геаграфічнай прасторы. Яе можна прадставіць як форму спалучэння ведаў геаграфіі фізічнай, з аднаго боку, і культурнай антрапалогіі, этналогіі, культуралогіі, рэлігіязнаўства, з другога.

Вытокі культурнай геаграфіі часта звязваюць з Фрыдрыхам Ратцэлем, аўтарам вядомай працы «Антрапагеаграфія» (1882), якога ў роўнай ступені лічаць і географам, і антраполагам (этнолагам). Менавіта ён распрацаваў паняцце ландшафту як месца ўзаемадзеяння чалавека і прыроднага асяроддзя. У 1920–1930-х гг. лідарам культурнай геаграфіі становіцца прафесар Універсітэта ў Бёрклі – Карл Заўэр, які даследаваў якім чынам людзі ствараюць культурны ландшафт і як ландшафт, са свайго боку, уплывае на паводзіны і культуру народаў. Падобныя сюжэты ў той жа час вывучаў рускі этнограф, стваральнік канцэпцыі этнасу Сяргей Шыракагораў.

Развіццё новых кірункаў сацыяльнай тэорыі ў заходняй інтэлектуальнай прасторы (посткаланіяльных даследаванняў, постмадэрнізму і постструктуралізму) прывяло да ўзмацнення ўласна гуманітарнага пачатку і ўтварэння ў 1980-х гг. так званай «новай культурнай геаграфіі». У сваіх метадах інтэрпрэтацыі культуры яна зноў наблізілася да культурнай і сацыяльнай антрапалогіі. Ландшафт яе прадстаўнікамі разглядаўся не як простае адлюстраванне культуры, а ў якасці аб’екта, што меў сімвалічнае значэнне, сэнс якога неабходна разумець у сацыяльным і гістарычным кантэксце. Даследаванні будаваліся з фокусам на культурнай палітыцы разнастайных сацыяльных групаў. «Культурны паварот» у культурнай геаграфіі прыцягнуў увагу да праблем рэпрэзентацыі культуры

ў сродках масавай інфармацыі, мастацтве, культурнай спадчыне, модзе, харчаванні і г. д. Пры гэтым узмацнілася ўзаемадзеянне з такімі традыцыйнымі галінамі геаграфічных ведаў як эканамічная і палітычная геаграфія. Лічыцца, што на сённяшні дзень культурная геаграфія з'яўляецца адным з найбольш дынамічных і перспектыўных напрамкаў сацыяльнай геаграфіі.

У Беларусі, на жаль, культурная геаграфія яшчэ не склалася ў якасці цэласнай з'явы. Ёсць толькі некалькі асобных публікацый якіх з пэўнай доляй умоўнасці можна аднесці да гэтага напрамку. Сярод іх вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Геаграфія культуры Беларусі», створаная выкладчыкам Магілёўскага ўніверсітэта Ігарам Шарухам, а таксама працы вядома беларускага этнографа Віктара Цітова, якія шмат у чым закранаюць праблематыку культурнай геаграфіі, у тым ліку – утварэнне культурнага ландшафту. Аднак усе гэтыя спробы абмежаваныя тэрыторыяй Беларусі.

Існуе вялікая патрэба ва ўласна беларускім асэнсаванні культурнай геаграфіі ў глабальным кантэксце. Гэта тычыцца не толькі самой сферы даследаванняў, але і выкладання геаграфіі ў школе. Звесткі аб культурнай разнастайнасці чалавецтва, якія дае школьны курс, фрагментарныя, заснаваныя на састарэлых тэарэтычных схемах і часцяком проста недаравальна памылковыя. Сваім аб'ёмам яны значна саступаюць фізіка-геаграфічнай і эканамічнай інфармацыі, не звязаны з ёю лагічнымі сувязямі. А між тым геаграфія – фактычна адзіны школьны прадмет, які можа і павінен фармаваць адэкватныя ўяўленні аб адзінстве і культурнай разнастайнасці чалавецтва. Ва ўмовах няспыннага пашырэння глабалізацыі, павелічэння міжнацыянальных кантактаў і ўзаемадзеяння патрэба ў іх будзе толькі ўзрастаць.

Сучасная практыка выкладання культурнай геаграфіі ў свеце не мае нейкага канону, дакладнай ці нават прыблізнай схемы зместу дыдактычнага матэрыялу. Кожны аўтар прапаноўвае сваё бачанне, заснаванае хутчэй на аналізе канкрэтных даследчыцкіх праектаў, чым на абагульненні ведаў. Гэтая кніга з'яўляецца прыкладам культурна-антрапалагічнага бачання культурнай геаграфіі, адаптаванага, напрыклад, для вывучэння курсу вучнямі старэйшых класаў гімназій і ліцэяў.

# Пралог:
# гісторыя адной гравюры

Выява на вокладцы кнігі, якую вы трымаеце ў руках, трапіла на яе выпадкова. Але гэта менавіта той выпадак, які сведчыць, што нічога выпадковага ў гэтым свеце не бывае. У сакавіку 2018 года на запрашэнне Згуртавання беларусаў Вялікай Брытаніі мне на тыдзень выпала трапіць у Лондан. У вольны час я наведаў Нацыянальную Галерэю, пасля чаго самым дзіўным чынам ногі самі прынеслі мяне на невялічкі завулачак пад назваю Сэсіл-стрыт, дзе некалькі крамаў утвараюць сапраўдны рай для аматара старажытных, і не вельмі, картаў, гравюр, плакатаў. Збіранне графікі – маё даўняе захапленне. Рэдка калі з замежнай вандроўкі я вяртаюся без якоганебудзь набытку. Гэтым разам пашанцавала набыць гравюру, датаваную гаспадаром крамы канцом XVIII стагоддзя. Яе вы бачыце на вокладцы.

Але гэта толькі пачатак гісторыі. Сапраўднай прыгодай сталі вывучэнне і расшыфроўка відавочных і патаемных сэнсаў гэтай выявы. Пачнем з таго, што на ёй некалькі надпісаў. Уверсе – «*Military dress of Commander and Common Soldiers in Angola, from De Bry*» (Абмундзіраванне камандзіра і простых салдат у Анголе, ад Дэ Бры). Унізе – «*Plate 193. N 111. Vol. 2, p. 193*» (Выява 193. № 111. Том 2, с. 193) і «*J. Basire Sculp.*» (Дж. Бэсайр, скульп.). Нумары выявы, тома і старонкі сведчаць, што гэта ілюстрацыя для кнігі. З гэтым усё зразумела. Дж. Бэсайр – трэба меркаваць, аўтар гравюры. Чаму ён пазначыў сябе скульптарам? Каб надрукаваць гравюру, выяву спачатку выразалі на меднай пласціне. Прылады працы гравёра і скульптара ў нечым падобныя – абодва яны разьбяры. Добра, разабраліся і з гэтым.

А вось што на самой выяве? Углядаемся. Трое мужчынаў. Атлеты. З адзення – толькі кавалкі тканіны на поясе. У цэнтры, напэўна, камандзір. На галаве – шыкоўнае ўбранне з пер'я, на целе – металічны ланцуг у тры нізкі, у руцэ – лук са стралой, на нагах – сандалі. Па баках стаяць простыя салдаты. Адзін грае на барабане, другі – грукае палкай у рог.



*Дж. Бэсайр.* Абмундзіраванне камандзіра і простых салдат у Анголе. *Гравюра, 1746*

Хто гэта? Ангалезцы? Ці партугальцы, якія вырашылі пагуляць у індзейцаў? Ці гэта баявы лук у руках афіцэра? Не, ён, хутчэй, варты выявы нейкага пухленькага, з кудзеркамі, Купідона. Можа, гэта акцёры? Салдаты, дарэчы, нагадваюць постаці старажытных грэкаў ці рымлян. Ці гэта ўвогуле Ангола? Афрыка? Расліннасць на пярэднім плане пра гэта не сведчыць. Што на другім плане? Нейкае абарончае збудаванне і абрыс стромкага пагорка.

Падключаем рэсурсы інтэрнэта. Першае – паспрабуем лакалізаваць месца падзеі. Абарончае збудаванне на гравюры нагадвае фартэцыю Сан-Мігель у Луандзе, пабудаваную партугальцамі ў канцы XVI стагоддзя. Пра гэта сведчыць характэрная вежачка-бартызана. Падобную можна ўбачыць на бастыёне Нясвіжскага замку. Гэта не выпадкова, бо будаваліся яны амаль адначасова. Да Луанды сюжэт прывязвае і выява пагорка. Амаль ідэнтычная змешчана на гравюры сярэдзіны XVII стагоддзя, прысвечанай пе-



*Бартызана фартэцыі Сан Мігель у Луандзе, сучасны выгляд*

рамовам партугальцаў з ангольскай прынцэсай Нзінгай. Значыць, гэта Луанда, Ангола, Афрыка. Дарэчы, гравюра прысвечаная цікаваму эпізоду падчас перамоваў: партугальцы вырашылі прынізіць прынцэсу і замест крэсла паклалі дыван на падлогу – маўляў, тубыльцам мэбля не патрэбная. Нзінга знайшла выйсце: ролю крэсла выконваў яе слуга, але яна сядзела не ніжэй за еўрапейцаў. Сёння яна ўспрымаецца як папулярная асоба мінулага, барацьбітка за самастойнасць Анголы. У цэнтры Луанды ёй пастаўлены помнік.



*Перамовы прынцэсы Нзінга з партугальцамі. Гравюра, 1657*



A

VOYAGES and TRAVELS:

EUROPE, ASIA, AFRICA, and AMERICA,

MANNERS and CUSTOMS

*Тытульны аркуш «Новага агульнага збору вандраванняў і падарожжаў», 1746*



*Партрэт Джэймса Бэсайра*

Ідзём далей. Інтэрнэт ідэнтыфікуе гравюру. Яна была зробленая для чатырохтамовага выдання «A New General Collection of Voyages and Travels» (Новы агульны збор вандраванняў і падарожжаў), выдадзенага ў Лондане ў 1746–1747 гг. Томасам Астлі. Мастаком-гравёрам быў вядомы брытанскі графік Джэймс Бэсайр. Гэта супадае з надпісам на гравюры. Аднак работа абсалютна не падобная на манеру графікі сярэдзіны XVIII стагоддзя і на творы самога Бэсайра. У чым тут справа? Вось у чым: у 1746 годзе Бэсайру было толькі 16 гадоў. І гэта не аўтарская работа, а копія. Добра, хай будзе копія, але як маладому хлопцу даверылі зрабіць ілюстрацыю для самавітага выдання? І гэта можна патлумачыць: яго бацька, Ісак Бэсайр, таксама быў гравёрам і картографам: сакрэты майстэрства Джэймс засвойваў з дзяцінства. Дарэчы, капіраванне – тыповая практыка тых часоў і абавязковы элемент навучання. Так вучыліся і сам Бэсайр, і, пазней, яго самы вядомы вучань – Уільям Блэйк.

Пра тое, што гравюра – копія, сведчыць спасылка «from De Bry». Томас Астлі не меў дастатковай колькасці арыгінальных ілюстрацый. Таму ён скарыстаўся славутай серыяй кніг Тэадора дэ Бры «Вялікія вандраванні», якая выдавалася ў канцы XVI–XVIIст. Дэ Бры нарадзіўся ў Льежы ў 1528 г. З прычыны пераследу з боку іспанскай інквізіцыі, ён, пратэстант, уцёк у Франкфурт-на-Майне дзе і правеў значную частку свайго жыцця. Дэ Бры быў ювелірам, гравёрам, выдаўцом. У 1590 г. ён пачаў друкаваць апісанні геаграфічных адкрыццяў Амерыкі, Афрыкі і Азіі. Пазней справу працягнулі яго сыны, і агулам серыя складалася з 30 тамоў на лаціне, нямецкай, англійскай і французскай мовах. Надзвычайны поспех ёй забяспечыла тое, што кнігі мелі вялікую колькасць ілюстрацый, зробленых самім дэ Бры. Шмат малюнкаў прадавалася асобна, што забя-




*Аўтапартрэт Тэадора дэ Бры, 1597*

спечвала яшчэ большую аўдыторыю. Сярод іх – на сёння ўжо амаль хрэстаматыйныя выявы першых сустрэч еўрапейцаў і амерыканскіх індзейцаў, жудасных катаванняў індзейцаў іспанцамі (своеасаблівая помста ім за вымушаную эміграцыю) і не менш жудасныя карціны нібыта пашыранага сярод індзейцаў канібалізму. Творы дэ Бры сталі, па сутнасці, першай крыніцай агульнаеўрапейскага маштабу, якая давала візуальнае ўяўленне пра свет народаў, наконт якіх раней толькі хадзілі чуткі. Ён стаў першым, хто стварыў вобраз «іншага». І тое, што праз 150 гадоў Астлі быў вымушаны выкарыстаць яго выяву англезцаў, сведчыць, што канкурэнтаў у дэ Бры не было.



*Іспанцы палююць на індзейцаў з сабакамі. Гравюра з выдання дэ Бры, 1598*

Праблема, аднак, палягала ў тым, што дэ Бры ніколі не быў ні ў Амерыцы, ні ў Афрыцы і г. д. Больш за тое, хутчэй за ўсё, ён рэдка калі, а можа, і ніколі не бачыў жыхароў гэтых аддаленых зямель. Дэ Бры апіраўся на замалёўкі нешматлікіх, калі не адзінкавых, мастакоў, што наведалі Новы свет, але збольшага – на апісанні. Менавіта таму мастак вырашыў у якасці ўзору выкарыстаць вы-



*Канібалізм сярод тупінамба ў Бразіліі. Гравюра з выдання дэ Бры, 1593*

явы старажытных грэкаў і рымлян – зразумела, такімі, якімі іх сабе ўяўлялі ў той час еўрапейцы. Вось чаму англезцы Бэсайра так да іх падобныя. І што? Большасць чытачоў і гледачоў твораў дэ Бры і Астлі гэтак сама, як і яны, англезцаў не бачылі.

У гэтым сюжэце, зразумела, трошкі ў гіпертрафаванай форме, выяўляецца сутнасць дысцыпліны, якой прысвечана дадзеная кніга. Культурная геаграфія – а выданні дэ Бры і Астлі, без сумненняў да яе гісторыі адносяцца – ёсць не навука пра «іншага», а гісторыя нашых уяўленняў пра яго. Яго, «іншага», цалкам нам спасцігнуць не дадзена. І мэта гэтай кнігі – зрабіць прорву паміж намі і «іншым» як мага меншай.

# Раздзел 1.
# Канцэпцыя культуры ў культурнай геаграфіі і антрапалогіі

*Вызначэнне паняццяў культура і культурная геаграфія.*
*Культура як сродак задавальнення праблем чалавечага існавання. Культура першаснага жыццезабеспячэння. Соцыянарматыўная культура. Біялагічнае і культурнае аднаўленне. Культура пазнання свету.*
*Культура як форма адаптацыі. Прагматычнае і сімвалічнае значэнне культурнага ландшафту. Адаптацыйныя стратэгіі. «Свае» і «чужыя»: адаптацыя да сацыяльнага асяроддзя. Этнацэнтрызм, расізм і шавінізм. Этнічныя стэрэатыпы і ўстаноўкі.*
*Асноўныя метадалагічныя прынцыпы: універсалізм і культурны рэлятывізм.*

## ***Вызначэнне паняццяў «культура» і «культурная геаграфія»***

Назва дысцыпліны «Культурная геаграфія» складаецца са слоў, як здаецца, добра вядомых. Геаграфія асацыюецца з картамі, горнымі хрыбтамі, марскімі затокамі, радовішчамі карысных выкапняў, сучаснымі мегаполісамі і кліматычнымі зонамі. Інакш кажучы, геаграфія – гэта навука аб Зямлі, яе стыхіях і насельніках. Што да слова *культура*, то адразу ўспамінаюцца барочныя палацы, жывапісныя творы часоў Рэнесансу ці оперныя мелодыі Джузэпэ Вердзі. Дык што, культурная геаграфія – гэта геаграфія чагосьці прыгожага, твораў мастацтва? У пэўнай ступені – так, але… шмат хто прыгадае, што людзей падзяляюць на культурных, значыць выхаваных, і не зусім, ці зусім не выхаваных, а значыць – не культурных. І што рабіць з гэтым? Ці значыць гэта, што магчыма

зрабіць карту з геаграфічнымі зонамі выхаванасці і нявыхаванасці, культуры і бескультур'я? І ці ёсць у свеце ўніверсальная норма культурнасці, выхаванасці? У нашай традыцыі зрокавы кантакт падчас сяброўскай размовы ёсць паказчыкам шчырасці яе ўдзельнікаў, а ў японскай, напрыклад, ён абсалютна не дапушчальны, гэта вяршыня нявыхаванасці. У розных народаў маецца рознае ўяўленне пра нябачную прыватную прастору асобы. У амерыканцаў, напрыклад, яна значна большая за нашу: у гіпермаркетах мяне часта здзіўляла, што іншыя наведнікі, праходзячы паміж мной і стэлажамі з таварамі, заўсёды прасілі прабачэння, бо парушалі маю прастору. Гэткую сітуацыю цяжка сабе ўявіць у нашых умовах, але ці азначае гэта, што амерыканцы культурнейшыя за нас?

Падобныя сумненні можна выказваць бясконца. Адзінае выйсце – гэта паглядзець у аўтарытэтных энцыклапедыях, каб атрымаць вызначэнне таго, што ёсць культура. Але і тут нас чакае расчараванне: знайсці ўніверсальнае паняцце наўрад ці ўдасца. І гэта невыпадкова. Яшчэ ў канцы 18 ст. вядомы нямецкі мысляр Ёган Готфрыд Гердэр у роспачы адзначыў: «Няма нічога менш вызначанага, чым гэтае слова «культура», і няма нічога больш зманлівага, чым стасаваць яго да цэлых стагоддзяў і народаў!» Сучасныя спецыялісты ў галіне культуралогіі скажуць вам, што існуе некалькі соцень вызначэнняў культуры, і нават лік таго, як можна падыходзіць да яе вызначэння, ідзе на дзясяткі.

Гэта, аднак, не сведчыць пра тое, што ёсць нейкае адно дакладнае вызначэнне, а ўсе астатнія – недакладныя. Проста розныя навуковыя дысцыпліны і навуковыя школы карыстаюцца рознымі дэфініцыямі і рознымі падыходамі. У гэтым тэксце мы будзем карыстацца так званым агульным дэзаксіялагічным вызначэннем культуры. Агульнае азначае, што ў культуру ўключаюцца ўсе, без выняткаў, формы чалавечай актыўнасці і ўсе яе вынікі. Дэзаксіялагічнае (аксіялогія – навука аб каштоўнасцях) азначае, што ўсё, і актыўнасць і яе вынікі, лічыцца праявамі культуры, без падзелу на культурнае, менш культурнае і зусім некультурнае. Такі падыход характэрны для культурнай антрапалогіі – навукі вельмі блізкай да культурнай геаграфіі. Ён звязаны з фундаментальным метадалагічным прынцыпам культурнага рэлятывізму, сфармуля-

ваным яшчэ ў пачатку XX стагоддзя вядомым амерыканскім антраполагам Францам Боасам. Ён азначае прынцыповую адмову ад пошукаў нейкіх універсальных нормаў культуры і прызнанне абсалютнай каштоўнасці культуры кожнага асобнага народа на Зямлі. Агульначалавечая культура можа быць уяўленая як абстракцыя ці як сукупнасць культур усіх народаў свету, у якіх ствараецца тое, што ўспрымаецца як агульначалавечае. З гэтага пункту погляду культурная геаграфія – гэта навука, якая даследуе ўзаемадзеянне разнастайных формаў і вынікаў чалавечай дзейнасці (культуры), з аднаго боку, і геаграфічнай прасторы – з другога.

### *Культура як сродак задавальнення праблем чалавечага існавання*

Змест паняцця «культура» найлепшым чынам раскрываецца праз яе класіфікацыю, г. зн. падзел на часткі. Як і вызначэнняў культуры, так і яе класіфікацый ёсць шмат. Існуе, умоўна кажучы, традыцыйная класіфікацыя, якая склалася яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. Згодна з ёй культуру падзяляюць на матэрыяльную (гаспадарчыя заняткі, жытло, ежа, адзенне, транспартныя сродкі і г. д.) і духоўную (рэлігійныя вераванні, мастацтва). Гэткая класіфікацыя, шчыра кажучы, не вельмі зручная: шмат якія формы чалавечай актыўнасці – напрыклад, сямейнае жыццё – цяжка адназначна аднесці да матэрыяльнай або духоўнай культуры. Але шмат якія навукоўцы, у тым ліку і складальнікі беларускіх падручнікаў па геаграфіі, карыстаюцца ёй па традыцыі і сёння.

Існуюць і больш дэталізаваныя і адмысловыя падыходы да класіфікацыі культуры. Адзін з іх, на якім грунтуецца і гэтая кніга, разумее культуру як сродак вырашэння найбольш значных праблем чалавечага існавання.

Зыходзячы з гэтага, вылучаюць, па-першае, культуру першаснага жыццезабеспячэння. У гэтым выпадку культура разглядаецца як сродак задавальнення таго, што славуты брытанскі антраполаг польскага паходжання Браніслаў Маліноўскі вызначаў як «падставовыя патрэбы чалавека». Сюды адносіцца ўвесь тэхналагічны ланцужок здабывання, прыгатавання і спажывання ежы, а так-



*Чалавек племені яган у традыцыйным убранні. Фота пачатку XX ст.*

сама сродкі абароны чалавека ад неспрыяльных умоў прыроднага і сацыяльнага асяроддзя – звычайна, жыллё і адзенне. Чаму звычайна? Таму што нам вядомыя шмат якія народы, якія не будавалі жылля, а адзенне выконвала выключна дэкаратыўную функцыю ці ўвогуле адсутнічала. Разам з тым, вядомы народ, які вынайшаў абсалютна ўнікальны і эфектыўны спосаб аховы свайго цела ад неспрыяльных умоў прыроднага асяроддзя. Гаворка ідзе пра карэнных жыхароў Вогненнай Зямлі – *Яган*, якія жылі ў халодным, вільготным клімаце з моцнымі вятрамі. Звычайнае адзенне тут хутка мокне, высушыць яго цяжка. *Яган* намазвалі цела цюленевым тлушчам, змешаным з попелам і вохрай. Атрымлівалася прыгожа і цёпла. Плюс – дождж быў не страшны.

***#Даведка***
*Яган (саманазва – ямана) – самы паўднёвы народ нашай планеты. Людзі народа яган займаліся марскім паляваннем і рыбалоўствам. Мужчыны шмат часу праводзілі ў чаўнах у адкрытым моры. Людзі народа яган не будавалі жылля, але ўвесь час карысталіся пераноснымі вогнішчамі. Адсюль, дарэчы, і назва мясцовасці – Вогненная Зямля. Вядома, што ў выніку адаптацыі да мясцовага клімату ў людзей народа яган з'явіліся асаблівасці метабалізму: тэмпература цела ў іх на адзін градус вышэйшая за звычайную. Згодна з перапісам 2002 г. у Чылі налічвалася 1685 чалавек, якія адносілі сябе да народа яган.*

Такім чынам, яшчэ раз: культура першаснага жыццезабеспячэння – гэта каб чалавек быў сыты, апрануты і меў дах па над галавою. Ці дастаткова гэтага для жыцця? Калі гэты чалавек адзін ці гэта адна сям'я, здаецца, што так. Асабліва калі жывуць яны на бяз-

людной выспе. Але людзі звычайна жывуць у вялікіх групах – соцыумах, якія налічваюць дзясяткі, сотні, тысячы, мільёны і мільярды чальцоў. Большая частка з іх у сучасных умовах не ведаюць адно аднаго асабіста і наўрад ці сустрэнуцца на працягу жыцця. Але, калі гэткая сустрэча адбудзецца, два прадстаўнікі аднаго соцыуму паразумеюцца паміж сабою, бо выконваюць адны і тыя ж правілы і нормы паводзінаў. Узятыя разам, яны складаюць соцыянарматыўную культуру. Гэта не толькі правілы і нормы, зафіксаваныя ў законах. Гэта шматлікія правілы паводзінаў, якія, часцей за ўсё, нідзе не запісаныя, якімі кіруюцца, бо «так прынята». Дзякуючы ім прадстаўнікам аднаго соцыуму паразумецца прасцей, чым з замежнікам. І гэта тое, што робіць так шмат клопату, калі вы трапляеце за мяжу.



*Карта рассялення народа яган*

***#З уласнага досведу антрапалагічных назіранняў***
*Падчас стажыроўкі ў Пітсбургскім універсітэце мой кіраўнік запрасіў мяне да сябе дадому на вячэру. Што рабіць у такім выпадку, асабліва калі вас запрашае чалавек, з якім вы бачыліся толькі адзін-два разы? Добра, што мяне папярэдзілі: трэба запытацца, што прынесці з сабою. І гаворка не пра «дзяжурныя» ў нашай традыцыі кветкі-цукеркі. Маім пытаннем прафесар быў абсалютна не здзіўлены, здзіўлены быў я ягоным адказам: «Я так разумею, што наўрад ці Вы што-небудзь прыгатуеце, вазьміце пляшку віна». Другое маё пытанне было адносна часу вячэры. Кіраўнік адказаў: «А шостай». Зразумела, выхаваны ў нашай традыцыі, за пятнаццаць хвілін да шостай я ўжо быў каля яго дома, двойчы абышоў суседні квартал і хвіліна ў хвіліну, а 18.00, пагрукаў у дзверы. Гэтым разам моцна здзіўлены быў ужо гаспадар: наступны госць з'явіўся хвілін праз пяцьдзясят, а за стол мы селі калі прыйшоў апошні – недзе каля васьмі. Увесь стол быў застаўлены тым, што прынеслі госці, – ежай у тым, у чым яе гатавалі: у патэльнях, рондалях, салатніцах і г. д.*

Але вось мы маем грамадства – сытае і добра апранутае, пазбаўленае вострага кватэрнага пытання, здольнае да эфектыўнай камунікацыі і супрацоўніцтва. Ці значыць гэта, што культура задаволіла ўсе патрэбнасці чалавека? Калі гаворка ідзе пра жыццё адной генерацыі – то пэўна што так. Але чалавецтва існуе тысячагоддзі і нават, як сёння лічаць, мільёны гадоў. І гэткае існаванне ёсць вынікам *культуры фізічнага і культурнага аднаўлення чалавецтва*. Для фізічнага аднаўлення дастаткова мець жанчын і мужчынаў, якія хацелі б і былі б здольныя да нараджэння дзяцей. Але, каб народжаная істота зрабілася чалавекам, адной фізіялогіі недастаткова. Рэч у тым, што ў свеце, напэўна, няма іншага такога біялагічнага віду, дзіцяняты якога настолькі працяглы час былі б залежныя ад дарослых. Гадаванне іх патрабуе адмысловых спосабаў дагляданні, выхавання і навучання. Пры гэтым, чым больш развіваецца гісторыя чалавецтва, тым больш працяглым становіцца гэты перыяд. Шмат якія спецыялісты ўвогуле лічаць, што культура з'яўляецца вынікам менавіта гэтай біялагічнай асаблівасці *homo sapiens*, бо ці не большая частка мадэляў паводзінаў чалавека перадаецца пазабіялагічным шляхам – праз выхаванне і навучанне. Прыклады істот, якія паўтарылі лёс героя славутай казкі Рэд'ярда Кіплінга «Маўглі», сведчыць пра тое, што гэткія мадэлі павінны быць засвоеныя ў дзіцячым узросце. Без гэтага чалавек як біялагічная істота не можа ператварыцца ў прадстаўніка *homo sapiens*. Універсальным грамадскім інстытутам, які забяспечвае фізічнае і культурнае аднаўленне чалавецтва на працягу ўсяго яго існавання, з'яўляецца шлюб і сям'я.

Ну, добра – нарэшце мы маем добра забяспечанае, выхаванае грамадства, з сем'ямі і дзеткамі. Ці дастаткова гэтага дзеля існавання? Пэўна, што так, але чагосьці ўсё адно не хапае. Чаго? Усведамлення сэнсу існавання. Здавалася б, дробязь, і не ўсім гэта цікава, але гэта менавіта тое, што вылучае чалавека з жывёльнага свету, бо і жывёлы клапоцяцца пра дзіцянят, маюць правілы паводзінаў, здабываюць ежу і будуюць сабе гнёзды, мурашнікі і г. д. Аднак сэнс існаванню надае ўласцівая толькі чалавеку *культура пазнання свету*. Універсальнай і найбольш старажытнай формай яе на працягу дзясяткаў тысяч гадоў была рэлігія. З яе пастурова вылучыліся

іншыя: мастацтва і літаратура, і ў апошнюю чаргу – навука. Цікава, што рацыянальнае пазнанне свету, як адзначаў амерыканскі антраполаг Лэслі Ўайт, пачынаецца з найбольш аддаленых ад чалавека аб'ектаў і толькі на самых апошніх ступенях развіцця звяртаецца на найбольш набліжаных. Гэта азначае, што самая старажытная галіна рацыянальных ведаў – гэта астранамічныя назіранні, вынікам якіх і стала ўзнікненне матэматыкі. А вось пачатак навуковага даследавання чалавечай псіхікі (і сапраўды, што можа быць бліжэй?) адносіцца да канца XIX ст. А пра тое, як функцыянуе чалавечы мозг, мы маем павярхоўныя ўяўленні нават сёння. Культура пазнання свету не толькі прадпісвае сэнс чалавечаму існаванню, але і ўтварае сістэму агульных каштоўнасцяў, якія аб'ядноўваюць прадстаўнікоў пэўнай культуры.

### *Культура як форма адаптацыі. Прагматычнае і сімвалічнае значэнне культурнага ландшафту*

Кожны народ займае пэўную геаграфічную прастору. Яе яшчэ называюць этнічнай тэрыторыяй – прасторай кампактнага пражывання, з якой звязаныя этнагенез і этнічная гісторыя. Безумоўна, працэсы глабалізацыі, міграцыі ўносяць свае карэктывы ў гэтую аксіёму. Але масавыя міграцыі, падчас якіх пэўныя народы ці іх значная частка гублялі сваю першапачатковую тэрыторыю, мелі месца і раней. Дастаткова нагадаць гісторыю цыганоў, армян, габрэяў, якія рассяліліся далёка за межы сваёй радзімы. У кожным выпадку, можна сцвярджаць, што кожны народ сама меней меў уласную этнічную тэрыторыю ў мінулым. Армяне і эстонцы лічаць, што жывуць на сваёй этнічнай тэрыторыі некалькі тысячагоддзяў, англа-аўстралійцы ці англа-новазеландцы – менш за два стагоддзі. Але незалежна ад працягласці гэтага тэрміну паміж людзьмі і асяроддзем адбываецца складанае ўзаемадзеянне, якое называюць адаптацыяй. Вынікам яго з'яўляецца культура, якую можна вызначыць як універсальную форму адаптацыі. А этнас нярэдка ўвогуле вызначаюць як форму культурнай рэакцыі на экалогію. Такі сэнс, дарэчы, закладзены і ў этымалогіі (першапачатковым сэнсе) слова «культура», якое на лаціне (*cultura*) азначала апрацоўку глебы, ця-

пер абазначае пэўную форму ўзаемадзеяння чалавека з прыродай. Кожная культура ў гэтым кантэксце можа быць прадстаўленая як частка, унікальны кампанент адаптыўнага генафонду чалавецтва. А яе захаванне – як умова выжывання ўсіх прадстаўнікоў віду *homo sapiens*.

Тэрмін «асяроддзе» мае некалькі аспектаў: ён уключае асяроддзе фізічнае (рэльеф паверхні, клімат, глебы, карысныя выкапні), біятычнае (жывёльны і раслінны свет) і сацыяльнае (адносіны паміж рознымі сацыяльнымі і этнічнымі групамі). Працэс культурнай адаптацыі мае складаны характар: з аднаго боку, народ прыстасоўваецца да ўмоў навакольнага асяроддзя, з другога – прыстасоўвае яго для сваіх патрэбаў. Прыстасаванне, у сваю чаргу, мае біялагічны і культурны бакі. Біялагічнае прыстасаванне патрабуе працяглага часу. Сёння мы часцей сустракаемся з праявамі біялагічнага прыстасавання, якое адбылося шмат тысячагоддзяў таму. Сярод іх, напрыклад, цёмны колер скуры ў негроідаў, які прадухіляе апёкі ад сонечнага выпрамянення, ці эпікантус (складка верхняга павека) у мангалоідаў, якая ахоўвае вока ад стэпавага пылу. Менш заўважная, але істотная біялагічная адаптацыя можа адбывацца і на працягу жыцця асобнага чалавека. Дзеткам мігрантаў, напрыклад, лягчэй прыстасавацца да мясцовых кліматычных асаблівасцяў, чым іх бацькам, якія нарадзіліся і выраслі ў іншай мясцовасці. Развіццё медыцыны і фармакалогіі ў XX ст. спрыяла падвышэнню магчымасцяў біялагічнай адаптацыі, а сучасныя біятэхналогіі ствараюць яшчэ большыя перспектывы.

Аднак трэба падкрэсліць, што біялагічная адаптацыя мае другаснае значэнне. Чалавек заняў ці не найбольшую з усіх біялагічных відаў геаграфічную прастору і вяршыню сусветнай харчовай піраміды дзякуючы менавіта таму, што галоўную ролю ў адаптацыі адыгрывае культура. Больш за тое, менавіта культура забяспечыла настолькі вялікую хуткасць адаптацыі чалавека, што яе немагчыма знайсці ў ніводнай іншай жывой істоты на нашай планеце. Адаптыўныя здольнасці культуры выяўляюцца ў тым, што яна непараўнальна больш гнуткая, чым інертныя біялагічныя механізмы прыстасавання. Дзякуючы культуры людзі адаптаваліся да надзвычай разнастайных формаў прыроднага асяроддзя,

у тым ліку тых, якія раней былі бязлюднымі: арктычныя пустыні, высакагор'і і г. д.

У працэсе адаптацыі людзі не толькі выкарыстоўваюць пасіўныя сродкі культурнай адаптацыі (адзенне, жыллё), але ў працэсе жыццядзейнасці істотна змяняюць навакольную прастору, надаюць ёй рысы культурнага ландшафту. Шматлікія сувязі ў ім маюць не толькі прагматычна-гаспадарчы характар. Кожнаму народу падаецца, што яго асяроддзе – найпрыгажэйшае ў свеце. У выніку ўтвараецца глыбокая эмацыянальная сувязь з прасторай, апетай у фальклорных тэкстах, мастацкай літаратуры, выяўленчым мастацтве, кінематографе. Абстрактнае, з пункту погляду ўсяго чалавецтва, паняцце геаграфічнага асяроддзя для кожнага ператвараецца ў «Родны кут», «Бацькаўшчыну», «Отчизну», «Motherland», «Vaterland».

### *«Свае» і «чужыя»: адаптацыя да сацыяльнага асяроддзя*

Праблема прыстасоўвання да сацыяльнага асяроддзя выяўляецца ў тым, што на працягу ўсёй сваёй гісторыі пэўным групам людзей даводзілася мець стасункі з «іншымі» – людзьмі, якія інакш размаўлялі, выглядалі, паводзілі сябе. Па меры павелічэння шчыльнасці насельніцтва актуальнасць гэтай праблемы ўвесь час узрастала. Асаблівай вастрыні яна дасягнула са з'яўленнем агрэсіўнай барацьбы за кантроль над жыццёва неабходнымі рэсурсамі, станаўленнем першых цывілізацый, калі адрозненні пачалі выяўляцца ў першую чаргу ў доступе да найноўшых тэхналогій у вайсковай сферы і сферы гаспадарання. З тых часоў склаліся асноўныя формы стаўлення да «іншага». Сярод іх найбольш універсальнай з'яўляецца этнацэнтрызм – лад мыслення, пры якім уласная культура разглядаецца ў якасці сродку ацэньвання іншых. Этнацэнтрызм ёсць непазбежным сродкам адаптацыі, бо ён натуральным шляхам умацоўвае ўнутранаю групавую салідарнасць. Пры гэтым далёка не заўсёды маецца на ўвазе вызначэнне ўласнай культуры як безумоўна вышэйшай за іншыя. У шэрагу выпадкаў, характэрных для пэўных народаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы ці Балканаў, уласная культура «стыгматызуецца» як безнадзей-

на адсталая, ніжэйшая за сваіх магутных суседзяў. Разам з тым, даволі часта этнацэнтрызм выяўляецца ў ксенафобіі – інтэнсіўнай і ірацыянальнай варожасці да іншых народаў і культур. Яна, у сваю чаргу, можа спалучацца з расізмам – уяўленнем аб культурнай перавазе прадстаўнікоў адной біялагічнай расы над другой, ці/і з шавінізмам – падобным уяўленнем у адносінах да ролі ўласнага народа ці цывілізацыі, які ўспрымаецца ў якасці вышэйшага за ўсе астатнія. У сённяшніх умовах мы часцей за ўсё сустракаемся не з гэтымі крайнімі праявамі, а з так званым маўклівым этнацэнтрызмам, які не прадугледжвае безумоўнай перавагі ўласнай культуры, а разглядае яе як норму не для ўсіх, уласцівую выключна дадзенаму народу. У штодзённым жыцці адносіны з «іншымі» будуюцца на падставе так званых этнічных стэрэатыпаў – спрошчаных, схематызаваных уяўленнях аб сваім і іншых народах. Сэнс стэрэатыпаў у тым, што яны рэпрэзентуюць пэўную мадэль паводзінаў пры стасунках з «іншым». Часта яны фіксуюць гістарычны досвед адносінаў. У стаўленні да аднаго і таго ж «іншага» ён можа істотна адрозніваецца ў розных народаў. Параўнаем, напрыклад, рускую прыказку «Незванный гость хуже татарина» і беларускую – «Татары – добрыя гаспадары». Этнічныя стэрэатыпы звычайна маюць эмацыйную афарбоўку, дакладна выяўлены ацэначны характар. У адпаведнасці з імі ўтвараюцца псіхалагічныя ўстаноўкі, якія адлюстроўваюць гатоўнасць да пэўнай формы ўзаемадзеяння з прадстаўнікамі «іншага».

### *Асноўныя метадалагічныя прынцыпы: універсалізм і культурны рэлятывізм*

Ці не найлепшы сродак барацьбы за праявамі расізму, шавінізму, ксенафобіі – навукі аб біялагічнай і культурнай разнастайнасці: культурная геаграфія, культурная антрапалогія, этналогія і этнаграфія. Яны маюць падобныя метадалагічныя прынцыпы, сярод якіх галоўныя – гэта ўніверсалізм і культурны рэлятывізм. Універсалізм азначае, што ўсе народы ў роўнай ступені разглядаюцца як людзі, частка біялагічнага віду *homo sapiens*. Гэта адносіцца да ўсіх без выключэння, без уліку адноснага развіцця тэхналогіі.

Культурны рэлятывізм, ужо згаданы вышэй, быў мэтанакіравана сфармуляваны як супрацьлеглы этнацэнтрызму. Ён арыентуе на асэнсаванне культуры «іншых» зыходзячы з уласцівай ёй сістэмы каштоўнасцяў. Абодва прынцыпы, як падкрэсліваў Майкл Говард, сцвярджаюць: «кожны народ – каштоўная крыніца ведаў пра чалавека: пра тое, што азначае выжыванне з пункту погляду культуры, пра яго сацыяльную і біялагічную спадчыннасць. Кожны народ можа даць цікавы матэрыял пра патэнцыяльныя магчымасці чалавечага роду і аб межах гэтых магчымасцяў».

Такія сцвярджэнні нярэдка выклікаюць здзіўленне і сарказм: «Ну чаму могуць навучыць нас, грамадзян глабальнай цывілізацыі і носьбітаў найноўшых тэхналогій, веды нейкіх там дзікуноў, што бадзяюцца дзесьці ў джунглях, апантаныя адзіна пошукамі ежы?»

Прывяду некалькі прыкладаў. Першы – сеноі.

***#Даведка***

*Сеноі – ізаляваны народ, які жыве ў цяжкадаступных джунглях горнай Малайзіі. Асноўны занятак – лядная сістэма земляробства, якая спалучаецца з паляваннем, збіральніцтвам, рыбалоўствам. Сеноі вырошчваюць рыс, бананы, хлебнае дрэва і гарбузы. Жывуць у невялікіх вёсках. Жытло з бамбуку ўсталёўваюць на палі, каб яго не затапіла падчас частых дажджоў. Сёння агульная колькасці сеноеў дасягае 60 тыс. чалавек.*

Кілтан Сцюарт, якая вывучала сеноеў у другой палове 1930-х гг., звярнула ўвагу на дзіўныя традыцыі, якія пазней назвалі «ўсвядомленымі снамі». Сутнасць яе ў тым, што сеноі з дзяцінства навучаюцца кантраляваць свае паводзіны ў снах. Кожную раніцу



*Сеноі*



*Карта рассялення сенояў*

бацькі патрабуюць ад дзяцей распавядаць ім, што дзеці прыснілі ўночы, і даюць парады, як сябе паводзіць, напрыклад, пры сустрэчы з драпежнікам, як адгадаваць крылы, калі падаеш, і г. д. Даследчыкі таксама звярнулі ўвагу, што сярод сенояў практычна няма выпадкаў псіхічных захворванняў, а самі яны вылучаюцца пазітыўным настроем, добразычлівасцю, адкрытасцю. Прыёмы, апісаныя Кілтан Сцюарт, пазней пачалі паспяхова выкарыстоўваць у псіхатэрапеўтычнай практыцы ў ЗША ды іншых краінах.

Яшчэ адзін прыклад – інуіты, ад якіх сучасная цывілізацыя пазычыла тып зімовай вопраткі, вядомай сёння пад назвай «куртка Аляска».

***#Даведка***
*Інуіты – карэннае насельніцтва крайняй Поўначы Канады, ЗША, а таксама Грэнландыі. Інуіты традыцыйна займаліся паляваннем на кітоў, маржоў, цюленяў, белых мядзведзяў, аўцабыкоў, лавілі рыбу. Вялі качавы лад жыцця. У якасці цяглавай сілы выкарыстоўвалі сабачыя запрэжкі. Будавалі ўнікальнае жыллё з блокаў ільду – «іглу». Агульная колькасць інуітаў дасягае 130 тыс. чалавек.*

Прататып курткі-«аляскі» ў інуітаў называўся «анарак». Гэта была верхняя вопратка, пашытая звычайна з двух слаёў скураў футрам унутр. Анарак заўсёды рабілі з капюшонам, па краі якога выпускалі футра. Спецыяльныя анаракі выраблялі для чоўнаў-



*Інуіты ў традыцыйным адзенні*



*Інуіцкі «анарак» у сучасным выкананні*

каякаў – іх шмаравалі тлушчам, каб не прамакалі. У пачатку 1950-х гг. аналагічнае адзенне пачалі вырабляць у Паўночнай Амерыцы з сінтэтычных тканін, а з канца 1950-х курткі «аляска» сталі адным з найбольш папулярных фасонаў зімовага адзення ва ўсім свеце. Інуіты таксама сталі вынаходнікамі сонечных акуляраў – дакладней, таго, што іх замяняе: пласціны з косці з вузкай шчылінай. Пры вялікай колькасці лёду і снегу, падчас яснага надвор'я летам, сонца, якое знаходзіцца вельмі нізка, моцна слепіць вочы. З інуітамі звязаныя і некаторыя фізіялагічныя асаблівасці: іх харчаван-



*Інуіт у традыцыйных «сонечных акулярах»*



*Карта рассялення інуітаў*

не складаецца з вялікай колькасці мяса і яшчэ большай – тлушчу і мізэрнай долі вітамінаў, што ў цэлым, аднак, адмоўна не ўплывае на стан іх здароўя.




*Біялагічна актыўны дадатак акаі*

Да апошняга сюжэту блізкая гісторыя ягад «акаі». Гэта плады пальмы, якая часта сустракаецца ў басейне Амазонкі. Ягады акаі складаюць значную (да 42%) частку харчовага рацыёну бразільскай этнічнай групы кабоклу. Даследчыкі заўважылі, што, нягледзячы на жыццё ў экватарыяльным клімаце, сярод іх вельмі рэдка сустракаюцца скураныя захворванні. У пачатку 2000-х гг. высветлілася, што гэта звязана з ужываннем ягад акаі, якія адносяцца да ліку найбольш моцных антыаксідантаў – рэчываў, што супрацьдзейнічаюць развіццю анкалагічных захворванняў. Сёння акаі з’яўляюцца адным з самых папулярных біялагічна актыўных дадаткаў у свеце.

***#Даведка***
*Кабоклу – нашчадкі змешаных шлюбаў партугальцаў і карэннага індзейскага насельніцтва Амазонкі. Гэтая група ўзнікла падчас так званай «каўчукавай ліхаманкі», калі сюды трапіла вялікая колькасць перасяленцаў. Ад індзейскіх продкаў кабоклу атрымалі ў спадчыну традыцыі спажывання ягад акаі. Сёння кабоклу складаюць каля 12% насельніцтва Бразіліі.*

Трэба падкрэсліць, што прынцып культурнага рэлятывізму сфарміраваўся як прынцып навуковага даследавання. У гэтым яго асноўны сэнс. З дапамогаю яго мы можам зразумець і растлумачыць значэнне самых незвычайных і дзіўных (з нашага погляду) культурных з’яў. Але гэта не азначае, што ўсе яны прымальныя з пункту погляду такіх універсальных каштоўнасцяў, як правы чалавека на жыццё і самавызначэнне. Сёння часта можна пачуць, што іх абмежаванне адпавядае нейкім «нацыянальным ці народным традыцыям». Такія сцвярджэнні не маюць аніякага дачынення да канцэпцыі



*Кабоклу*



*Карта рассялення кабоклу*

культурнага рэлятывізму. Больш за тое, іх аўтары, часцей за ўсё пра яе нават ніколі не чулі і не здагадваюцца пра яе існаванне.

## Падсумаванне

Цэнтральнае месца ў культурнай геаграфіі і антрапалогіі займае адмысловая канцэпцыя культуры. Згодна з ёй культура – гэта ўсе формы чалавечай актыўнасці. Асобна вылучаюцца культура забеспячэння падставовых патрэбаў чалавека, сацыянарматыўная культура, сферы біякультурнага аднаўлення і пазнання свету. Адначасова, культура з’яўляецца самым эфектыўным сродкам адаптацыі да прыроднага асяроддзя, у выніку якога ствараюцца культурныя ландшафты. Інструментамі адаптацыі да сацыяльнага асяроддзя – адносінамі з «іншым» – робяцца этнічныя стэрэатыпы і ўстаноўкі. Яны нярэдка суправаджаюцца праявамі этнацэнтрызму, расізму і шавінізму. Эфектыўнымі сродкамі барацьбы з імі з’яўляюцца метадалагічныя прынцыпы ўніверсалізму і культурнага рэлятывізму.

# Раздзел 2.
# Геаграфія біялагічнай разнастайнасці чалавецтва: расы

*Расавыя прыкметы.*
*Экватарыяльная, ці негроідная, раса і яе расавыя тыпы.*
*Амерыканска-азіяцкая, ці мангалоідная, раса і яе расавыя тыпы.*
*Еўразійская, ці еўрапеоідная, раса і яе расавыя тыпы.*
*Пераходныя расавыя тыпы.*
*Ізаляваныя расавыя тыпы.*

### *Расавыя прыкметы*

Сучасныя біялагічныя даследаванні, у тым ліку расшыфроўка генома чалавека пераканаўча сведчыць, што ўнутрывідавыя генетычныя адрозненні, якім адпавядаюць расавыя, – статыстычна мізэрныя. Гэта яшчэ раз пацвярджае сапраўднасць галоўнага метадалагічнага прынцыпу ўніверсалізму: чалавецтва адзінае з біялагічнага гледзішча. Разам з тым, культурнае значэнне, часта негатыўнае, якое надаюць расавым адрозненням, непараўнальна большае.

Расы – гэта вялікія групы людзей, што маюць падобныя расавыя прыкметы. Расавыя прыкметы ўключаюць колер скуры, колер і будову валасоў, форму твару і г. д. Частка расавых прыкметаў відавочная для кожнага чалавека, другая – вядомая толькі спецыялістам.

Пачнём з колеру скуры. Гэта – ці не найбольш істотная прыкмета: на яе звяртаюць увагу часцей за ўсё. Адначасова менавіта з гэтай прыкметай існуе ці не найбольшая колькасць памылак, стэрэатыпаў і забабонаў. На працягу стагоддзяў чалавецтва падзялялі на «белую» і «каляровыя» расы. Згодна з гэтым пашыраным стэрэатыпам «еўрапейцы» маюць белую скуру, «негры» – чорную, «азіяты» – жоўтую, а амерыканскія індзейцы – чырвоную. Ніякага дачынення

да рэальнасці такая прымітыўная класіфікацыя не мае: ані жоўтых, ані чырвоных расаў няма ўвогуле. Так званыя «еўрапейцы» могуць быць цямнейшымі за афрыканцаў, а самымі светласкурымі з'яўляюцца паўночныя групы тых, каго завуць «азіятамі».

У сапраўднасці колер вызначаецца колькасцю скуранога пігменту – меланіну, які мае карычневы колер. Меланін прадухіляе шкоднае ўздзеянне ўльтрафіялету: там, дзе сонечнага выпрамянення болей, колер скуры будзе цямнейшым, там, дзе меней, – наадварот. Таму колер скуры можа адрознівацца толькі ўзроўнем пігментацыі. Жоўты колер – гэта ўвогуле фантазія. Чырвоны – вынік таго, што пэўная колькасць амерыканскіх індзейцаў фарбавала твар вохрай. Трэба заўважыць, што ступень пігментацыі перадаецца з пакалення ў пакаленне нават пры змене ўмоў прыроднага асяроддзя.

Наступная расавая прыкмета – валасяное покрыва. Пачнём з валасоў. Яны адрозніваюцца колерам (ад светлага да чорнага), а таксама сваёй структурай: могуць быць прамымі, хвалепадобнымі, кучаравымі, мяккімі і нягнуткімі. Пры гэтым пераважная большасць насельніцтва планеты мае валасы цёмнага колеру. Бландзінкі і бландзіны – хутчэй з разраду рэдкага выключэння. Да гэтай расавай прыкметы адносіцца і так званае трацічнае валасяное покрыва – вусы і барада ў дарослых мужчынаў. Ступень яго развіцця вельмі моцна адрозніваецца ў розных расавых групаў: у мангалоідаў і негроідаў яно звычайна нязначнае, а самымі «барадатымі» мужчынамі на зямлі з'яўляецца невялікі народ айны, які жыве на поўначы Японіі.

Вялікая колькасць расавых прыкметаў сканцэнтраваная на паверхні твару. Сярод іх форма – дакладней, разрэз – вачэй. Найбольш адметны ён у мангалоідаў. Гэта так званы эпікантус – складка верхняга павека, дзякуючы якой вочы маюць «вузкі» разрэз. Гэта адаптыўная прыкмета, якая сфармавалася ва ўмовах існавання ў стэпах і паўпустынях: вока з эпікантусам лепш абароненае ад пылу. Вочы адрозніваюцца таксама колерам, які ў пэўнай ступені адпавядае колеру валасоў: сярод светлавалосых часцей сустракаюцца блакітнавокія, а сярод цёмнавалосых – заўсёды і цёмны колер вачэй.

Істотныя адрозненні існуюць і ў форме носа. Насы могуць быць шырокімі і вузкімі, моцна выступаць і не вельмі. Шырокі нос – гэта

адаптыўная прыкмета, якая сфарміравалася ў спякотным клімаце. Вялікае слізістае покрыва садзейнічае ахалоджванню паветра, якое трапляе ў арганізм. Таму такі тып носа характэрны для негроідаў, а самымі шыроканосымі на планеце лічацца аўстралійскія абарыгены. А вось доўгія і тонкія насы, як лічыцца, больш падыходзяць для халоднага клімату, бо яны дазваляюць даўжэй саграваць паветра. Але далёка не ва ўсіх паўночных народаў яны такія. Форма вуснаў таксама мае адаптыўны характар: у народаў, якія жывуць у спякотным клімаце яны больш шырокія.

Форма твару істотна вар'іруецца ў розных расавых тыпаў. Яна можа быць авальнай ці круглявай. Асобная прыкмета – выпінанне скул. У найбольшай ступені яна прысутнічае сярод мангалоідаў.

Як ужо гаварылася, пераважная колькасць расавых прыкметаў сканцэнтраваная на паверхні твару, але адрозненні выяўляюцца і ў іншых параметрах. Сярод іх – рост. Самымі нізкарослымі лічацца прадстаўнікі так званага негрыльскага расавага тыпу. Гэта, напрыклад, мбуці ў экватарыяльнай Афрыцы ці аэта на Філіпінах, у якіх сярэдні рост дарослых мужчынаў не дасягае 150 см. З іншага боку ёсць некалькі народаў з ростам, значна большым за сярэдні. Да іх адносяцца шылук, масаі і дзінка ва Усходняй Афрыцы з сярэднім ростам 181–182 см. Адрозненні існуюць і ў будове цела: некаторыя антраполагі вылучаюць даліхаморфны тып з вузкім целам і доўгімі рукамі і нагамі (тыя ж самыя шылук і дзінка) і брахіморфны, у якіх, адпаведна, усё наадварот.



*Масаі – адзін з самых высакарослых народаў свету*

Шэраг прыкметаў мае прыхаваны характар. Сярод іх так званыя папілярныя лініі – рэльефныя лініі на далоневых і падэшвенных паверхнях скуры. Іх варыяцыяй займаецца спецыяльная навуковая

дысцыпліна дэрматагліфіка. А адрозненні ў будове зубоў вывучае аданталогія.

На падставе супастаўлення ўсіх гэтых прыкметаў спецыялісты вылучаюць вялікія расы, якія, у сваю чаргу, падзяляюць на расавыя тыпы ці малыя расы.

### *Экватарыяльная, або негроідная, раса*

Для вялікай экватарыяльнай, або негроіднай, расы характэрны цёмны колер скуры, валасоў і вачэй, шырокі нос і шырокія вусны. А вось будова валасоў можа істотна адрознівацца: яны могуць быць кучаравымі і хвалепадобнымі. Гэта адносіцца таксама да вусоў і барады: у большасці негроідаў яны слаба выяўленыя, але не ва ўсіх. Што ж да адрозненняў у росце, то яны ці не самыя вялікія ў параўнанні з іншымі расамі.

У межах вялікай экватарыяльнай расы вылучаюць некалькі расавых тыпаў.

Найбольш пашыраны з іх – *негрскі*. Да яго колькасна адносіцца пераважная частка негроідаў. Геаграфічна ён характэрны для Субсахарскага рэгіёна Афрыкі. Для гэтага тыпу ўласцівы высокі рост, цёмны колер скуры, кучаравыя валасы, слабае развіццё трацічнага валасянога покрыва.



*Негрскі расавы тып*



*Мбуці ў Цэнтральнай Афрыцы*

Найбольш характэрная рыса *негрыльскага* расавага тыпу – вельмі маленькі рост. Ад класічных неграў іх таксама адрозніваюць больш тонкія вусны і большае развіццё трацічнага валасянога покрыва.

На поўдні Афрыкі традыцыйна жылі прадстаўнікі самага спецыфічнага расавага тыпу негроідаў – *бушменскага*. Яны адрозніваюцца значна больш светлым колерам скуры, шырокімі скуламі, падобнымі да тых, што характэрныя для манголоідаў, і, часткова, эпікантусам – манголоідным разрэзам вока. Паходжанне бушменаў да гэтага часу застаецца загадкавым.



*Бушменскі расавы тып*



*Меланезійскі расавы тып*

Па-за межамі Афрыкі традыцыйна існавалі яшчэ тры групы негроіднага насельніцтва. Самая шматлікая з іх – *меланезійская* малая раса, пашыраная ў Меланезіі (адсюль і назва) і на Новай Гвінеі. У меланезійцаў колер скуры і будова валасоў падобная на класічных негроідаў. Але ў іх больш тонкія вусны, значна больш выяўленае развіццё трацічнага валасянога покрыва. Найбольш тыповае адрозненне – нос, часта з гарбінкай, які моцна выдаецца наперад.

Да негроіднай расы адносіцца і *аўстралійскі* расавы тып – карэннае насельніцтва Аўстраліі. Але ў іх спецыфічны колер скуры: цёмны з адценнем попелу, доўгія хвалепадобныя валасы, моцнае развіццё трацічнага валасянога покрыва і надзвычай шырокі нос.



*Аўстралійскі расавы тып*



*Ведоідны расавы тып*

У пэўнай ступені да іх падобны *ведоідны* тып, характэрны для асобных групаў насельніцтва на поўдні Індастана, у Рэспубліцы Шры-Ланка, Інданезіі. Яго прадстаўнікі таксама маюць хвалепадобныя валасы, але больш цёмны колер скуры і меншае развіццё трацічнага валасянога покрыва.

***Амерыканска-азіяцкая, або мангалоідная, раса***

Вялікая амерыканска-азіяцкая, або мангалоідная, раса – бадай што самая аднастайная з усіх вялікіх. Для яе прадстаўнікоў характэрны цёмныя прамыя, часта шорсткія, валасы, слабае развіццё трацічнага валасянога покрыва, цёмны колер вачэй, эпікантус (складка верхняга павека), шырокія скулы, нос і вусны сярэдняй шырыні. Колер скуры вар'іруецца ад вельмі светлага да вельмі цёмнага. Большая частка мангалоідаў – параўнальна невысокага росту.

*Амерыканскі* расавы тып (карэннае насельніцтва Амерыкі, з выняткам поўначы) – найбольш спецыфічнае адгалінаванне мангалоіднай расы. Ад класічных мангалоідаў іх адрознівае форма носа (тонкі, «арліны», які моцна выдаецца наперад), амаль суцэльная ад-



*Амерыканскі расавы тып*

сутнасць эпікантуса, у асобных выпадках (напрыклад, тэхуэльчэ на поўдні Аргенціны) высокі рост.

Астатнія мангалоідныя тыпы вельмі блізкія паміж сабою. Так, для *паўночна-азіяцкага* тыпу (карэннае насельніцтва Сібіры) уласцівы светлы колер скуры, прамыя, мяккія валасы; даволі часта



*Паўночна-азіяцкі расавы тып (эвенкі, Расія)*

сустракаюцца вочы светлага адцення. Характэрныя рысы адаптацыйнага паходжання – значнае развіццё падскурнага тлушчу, у тым ліку – на твары (так званы «пляскаты» твар), маленькі нос і вусны, моцнае развіццё эпікантуса. Прадстаўнікі *арктычнага* расавага тыпу (карэнныя жыхары Чукоткі, Аляскі, Грэнландыі, у тым ліку інуіты) жывуць у падобных прыродных умовах, але адрозніваюцца



*Арктычны расавы тып*



*Далёкаўсходні расавы тып (мяо, Кітай)*

больш цёмнай пігментацыяй скуры. Відаць, яны сфарміраваліся антрапалагічна ў больш цёплым клімаце.



*Паўднёвазіяцкі расавы тып (батакі, Інданезія)*

Пераважная большасць мангалоідаў належыць да *далёкаўсходняга* расавага тыпу. Гэта насельніцтва Кітая, Карэі, Японіі. У іх большая пігментацыя скуры, большыя насы і вусны, менш развітыя скулы. *Паўднёвазіяцкая* малая раса яшчэ больш цемнаскурая, з яшчэ больш шырокімі вуснамі і насамі. Характэрная рыса – параўнальна рэдкае пашырэнне эпікантуса.

***Еўразійская, ці еўрапеоідная, раса***

У адрозненне ад негроідаў і мангалоідаў, вялікая еўразійская ці еўрапеоідная раса – у найменшай ступені аднастайная. Даць агульную характарыстыку ёй вельмі складана. Для еўрапеоідаў, напрыклад, тыповыя вялікія варыяцыі ў колеры скуры: ад вельмі светлага да вельмі смуглага. Істотна адрозніваюцца рост, колер валасоў і вачэй, ступень развіцця трацічнага валасянога покрыва. Бадай, працей вызначаць еўрапеоідаў проста як тых людзей, у якіх няма мангалоідных і негроідных прыкметаў.



*Інда-міжземнаморскі расавы тып (кабілы, Алжыр)*

Адзінае, што больш-менш аб'ядноўвае еўрапеоідаў, – гэта выцягнутая форма твару, тонкія нос і вусны.

Самы вялікі паводле колькасці прадстаўнікоў расавы тып – *інда-міжземнаморскі*. Гэта насельніцтва Паўднёвай Еўропы (з выняткам Балканаў), Паўночнай Афрыкі, Бліжняга і Сярэдняга Усходу і большай часткі паўвострава Індастан. Для яго характэрны цёмны колер скуры, вачэй, валасоў (пераважна, хвалепадобных), слабае развіццё трацічнага валасянога покрыва.



*Балкана-каўказскі расавы тып (чарнагорцы)*

Характэрная рыса *балкана-каўказскага* расавага тыпу – вельмі моцнае развіццё трацічнага валасянога покрыва. Цёмны колер вачэй і валасоў спалучаецца ў іх са светлым колерам скуры. Прадстаўнікоў гэтага тыпу адрознівае параўнальна высокі рост, «арліны» нос, які моцна выдаецца наперад.

На паўночным захадзе Еўропы размешчаны *атланта-балтыйская* малая раса. Менавіта яе прадстаўнікоў часта лічаць увасабленнем еўрапеоідаў. Для іх характэрны высокі рост, светлы колер скуры, валасоў, вачэй, выцягнуты твар, тонкі доўгі нос і тонкія вусны.



*Атланта-балтыйскі расавы тып (нарвежцы)*

Да яго вельмі падобны і *сярэднееўрапейскі* расавы тып. Гэта насельніцтва Заходняй, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Ад папярэдняга ён адрозніваецца трошкі больш насычанай пігментацыяй і меншым ростам. Да гэтага расавага тыпу адносяць і большыню беларусаў.



*Сярэднееўрапейскі расавы тып (курпы, Польшча)*

*Беламора-балтыйскі расавы тып (эстонцы)*



Самы малараспаўсюджаны паводле колькасці прадстаўнікоў – *беламора-балтыйскі* расавы тып. Для яго характэрна, як лічаць спецыялісты, найбольш светлая пігментацыя скуры, вельмі светлы колер валасоў, сярэдняе развіццё трацічнага валасянога покрыва. Да гэтага тыпу адносяць народы Балтыі, карэлаў, вепсаў, часткова – беларусаў.

***Пераходныя расавыя тыпы***

У рэгіёнах гістарычна працяглых кантактаў паміж вялікімі расамі ўтварыліся пераходныя расавыя тыпы. Іх не трэба блытаць з групамі метысаў, якія ўтварыліся на тэрыторыі, пераважна, Амерыкі параўнальна нядаўна. Гаворка пра іх пойдзе крыху пазней.

У рэгіёне кантактаў еўрапеоідаў і манголоідаў узніклі дзве малыя расы: *уральская* і *паўднёва-сібірская*. Для ўральскай характэрна перавага еўрапеоідных рысаў; разам з тым даволі часта сустракаюцца эпікантус, характэрны смуглы колер скуры, цёмная пігментацыя валасоў. Да яе адносяцца народы Паволжа. У паўднёва-сібірскім тыпе, наадварот, пераважаюць манголоідныя рысы (шырокія





Уральскі расавы тып (марыйцы, Расія)

Паўднёва-сібірскі расавы тып (кыргызы)

скулы, эпікантус, цёмныя шорсткія валасы), якія спалучаюцца з еўрапеоідным тыпам твару і формай носа. Да паўднёва-сібірскай расы адносяць казахаў, кыргызаў, хакасаў.

У зонах старажытных кантактаў еўрапеоідаў з негроідамі таксама ўтварыліся два пераходныя тыпы: *эфіопскі* і *паўднёва-індыйскі*. Эфіопскі – адзін з самых своеасаблівых. Для яго характэрны цёмны, падобны да таго, што ў негроідаў,





Паўднёва-індыйскі расавы тып (тамілы, Шры-Ланка)

Эфіопскі расавы тып

колер скуры; цёмныя хвалепадобныя, часта кучаравыя валасы ў спалучэнні з еўрапеоідным, вельмі выцягнутым тыпам твару. Будовай цела прадстаўнікі гэтага тыпу падобныя да народаў шылук і дзінка; сярэдні рост мужчынаў большы за 185 см. Паўднёва-індыйскі, або дравідыйскі, тып блізкі да яго вонкава. Пігментацыя скуры тут яшчэ больш насычаная, вусны больш шырокія, нос меншы, а рост – істотна меншы.

***Ізаляваныя расы***

Апроч вялікіх рас і пераходных тыпаў, ёсць некалькі народаў, якія з расавага гледзішча з'яўляюцца абсалютна не падобнымі да ўсіх астатніх.

Сярод іх – прадстаўнікі курыльскай, або *айнскай*, малой расы. Айны – невялічкі народ, карэннае насельніцтва Курыльскіх выспаў і вострава Хакайда. У іх дастаткова цёмны колер скуры (сведчанне паўднёвага паходжання), цёмныя хвалепадобныя і адначасова шорсткія валасы, даволі часта – эпікантус, шырокі нос і вусны. Самая характэрная прыкмета – найбольш моцнае трацічнае валасяное покрыва. Іншымі словамі, айнскія мужчыны – самыя барадатыя ў свеце.



*Курыльскі расавы тып (айны, Японія)*

У асобную, ізаляваную расу вылучаюцца і *палінезійцы*. Лічыцца, што яны спалучаюць рысы ўсіх вялікіх рас. У палінезійцаў смуглы колер скуры, цёмныя хвалепадобныя, часам кучаравыя вала-



*Палінезійскі расавы тып (маоры, Новая Зеландыя)*

сы, слабае развіццё трацічнага валасянога покрыва, шырокі твар з выяўленымі скуламі, шырокі нос, вузкія, еўрапеоіднага тыпу вусны, высокі рост.

Прыведзеная вышэй класіфікацыя (заснаваная на падыходах Максіма Левіна і Якава Рагінскага) – толькі адна з больш чым трох дзясяткаў. У некаторых з іх колькасць малых рас даходзіць да 70. Да гэтага трэба дадаць, што расавыя прыкметы не з'яўляюцца нязменнымі. Такі паказчык, як рост цела, можа істотна змяніцца на працягу ўсяго некалькіх пакаленняў. Так, сярэдні рост беларускіх хлопцаў, якіх забіралі ў войска ў 1860-х гг., рэдка калі перавышаў 160 см. Жанчыны-беларускі былі яшчэ меншымі, грацыльнага (вузкацелага) складу. Класіфікацыі расавых тыпаў не ўлічваюць маштабных працэсаў метысацыі, якія адбыліся перадусім у Паўночнай і асабліва ў Паўднёвай Амерыцы. У выніку змяшэння еўрапеоідаў, негроідаў, мясцовага індзейскага насельніцтва, у меншай ступені мангалоідаў, тут узніклі новыя, надзвычай разнастайныя паводле сваіх прыкметаў расавыя групы. Кожная з іх мае асобнае імя (як кабоклу) у кожнай канкрэтнай краіне.

Шмат якія сучасныя антраполагі ўвогуле лічаць, што ад расавых класіфікацый трэба адмаўляцца, бо, на іх думку, раса – гэта не біялагічная, а выключна сацыяльная з'ява. Расы – гэта прадукт сацыяльнага ўяўлення, канструявання, сцвярджаюць яны. У пэўнай ступені з гэтым можна пагадзіцца, асабліва калі згадаць «нявызначанасць» расавых прыкметаў еўрапеоідаў.




*Геаграфічнае размеркаванне расавых тыпаў*

Але татальная адмова ад няхай супярэчлівых і недакладных, але ўсё-такі навуковых класіфікацый непазбежна прывядзе да наіўнага і абсалютна небяскрыўднага падзелу на «белую» і «каляровыя», у тым ліку «жоўтую», расы. Праблема, паўторым яшчэ раз, палягае не ў біялогіі, а ў тым значэнні, якое надаецца яе вонкавым і ўсім вядомым праявам. Веданне разнастайнасці дазваляе лепш уявіць і ўсвядоміць чалавечае адзінства.



POLICE

UK Self Defined Ethnicity Codes

| CODE | CLASS | RACE | DETAILS |
|---|---|---|---|
| W1 | UK White | IC1 | White Skinned Caucasoid from the United Kingdom? |
| W2 | White European | IC1 | White Skinned Caucasoid from elsewhere in Europe? |
| W9 Ancestry IC1<br>W9 Ancestry IC2 | Other White | IC1<br>IC2 | White Skinned Caucasoid or Olive Skinned Melanochroid? |
| B1 | Caribbean | IC3 | Black Skinned West Indian also Guyana Negroid? |
| B2 | African | IC3 | Black Skinned African also Ethiopian, Kenyan Negroid? |
| B9 | Other Black | IC3 | Black Skinned Negroid from elsewhere? |
| A1 | Indian | IC4 | Brown Skinned Asiatoid Indian mainland? |
| A2 | Pakistani | IC4 | Brown Skinned Asiatoid from North West India? |
| A3 | Bangladeshi | IC4 | Brown Skinned Asiatoid from North East India? |
| A9 | Other Asian | IC4 | Brown Skinned Asiatoid from elsewhere? |
| O1 | Chinese | IC5 | Yellow Skinned Mongoloid? |
| O9 | Any Other | IC6 | Mixed Up Mongoloid from elsewhere? |
| M1 | White & Black Caribbean | IC6 | Mixed Up Non-White from the West Indies? |
| M2 | White & Black African | IC6 | Mixed Up Non-White from Africa? |
| M3 | White & Asian | IC6 | Mixed Up Non-White from Asia? |
| M9 | Any Other Mixed | IC6 | Mixed Up Non-White from elsewhere? |
| NS | Unknown | IC7 | Not Stated (NS) |

Race Equality Secret Service (RESS)

*Інструкцыя вызначэння расавай прыналежнасці, створаная для брытанскіх паліцэйскіх*

## Падсумаванне

Усё чалавецтва адносіцца да аднаго і таго ж біялагічнага віду *homo sapiens*. Разам з тым, групы людзей адрозніваюцца паміж сабою шэрагам расавых прыкметаў: колерам скуры, вачэй, валасоў, формай твару, носа, вуснаў і г. д. У залежнасці ад спалучэння прыкметаў чалавецтва падзяляюць на вялікія расы і малыя расавыя тыпы. Усе вялікія расы – унутрана неаднастайныя. У найбольшай ступені гэта датычыць еўразійскай, або еўрапеоіднай расы, да якой належаць таксама і беларусы.

# Раздзел 3.
# Лінгвістычная разнастайнасць чалавецтва ў геаграфічным вымярэнні

*Асноўныя катэгорыі вымярэння лінгвістычнай разнастайнасці. Моўныя сем'і і групы.*
*Індаеўрапейская моўная сям'я. Германскія, раманскія, славянскія, індыйскія і іранскія мовы. Малыя групы індаеўрапейскіх моваў: кельцкая, балтыйская, грэцкая, албанская, армянская. Месца беларускай мовы ў індаеўрапейскай сям'і.*
*Сіна-тыбецкая моўная сям'я. Кітайская мова і яе дыялекты.*
*Нігера-кангалезская моўная сям'я.*
*Аўстранезійская моўная сям'я.*
*Афра-Азійская моўная сям'я. Семіцкія мовы.*
*Дравідзійская моўная сям'я.*
*Цюркская моўная сям'я. Мангольскія, карэйская і японская мовы.*
*Аўстаразіяцкая і тайская моўныя сем'і.*
*Уральская моўная сям'я.*
*Ізаляваныя мовы.*

Моўная разнастайнасць чалавецтва не меншая за расавую. Лінгвістыка – навука, якая вывучае мовы, называе колькасць ад 5000 да 7000 разнастайных моваў. Чаму менавіта ад 5000 да 7000? Чаму няма дакладнай колькасці? Праблема ў тым, што адзінай думкі, як вызначыць асобную мову, няма. Хоць, здаецца, кожны чалавек можа лёгка растлумачыць, што такое асобная мова: калі ты каго-небудзь разумееш – мова адна, а калі не разумееш – значыць, мовы розныя. Аднак, калі беларус будзе размаўляць з украінцам, то праблем з разуменнем у іх, бадай, не ўзнікне. Але ж ці гэта значыць, што ў беларусаў з украінцамі адна мова? А вось кітайцы

поўначы, якія размаўляюць на мандарынскай кітайскай, не разумеюць носьбітаў кантонскага (паўднёвага) кітайскага дыялекту. Але ці значыць гэта, што адзінай кітайскай мовы не існуе?

Мова – надзвычай складаная з'ява, і таму даць ёй вызначэнне не надта проста. Сучасная лінгвістыка разумее пад мовай сістэму ўмоўных сімвалаў, якія могуць выяўляцца гукамі, жэстамі, графічнымі знакамі. Гэтая сістэма забяспечвае ўстойлівую камунікацыю паміж прадстаўнікамі пэўнага грамадства, дазваляе кожнаму выяўляць свае думкі, з'яўляецца падмуркам ідэнтычнасці. Мова – адна з базавых характарыстык менавіта чалавека: жывёлы таксама могуць камунікаваць паміж сабою з дапамогай пэўных гукаў ці жэстаў, рухаў, але ўнікальнасць чалавечай мовы палягае ў тым, што з абмежаванай колькасці сімвалаў яна стварае неабмежаваную колькасць сэнсаў.

Культурную геаграфію і антрапалогію цікавіць у лінгвістыцы тое, якім чынам можна класіфікаваць чалавечую разнастайнасць. Рэч у тым, што шмат якія мовы падобныя паміж сабой. А гэтае падабенства з'яўляецца наступствам іх агульнага паходжання ад нейкай старажытнай пра-мовы. Такія мовы лінгвісты аб'ядноўваюць у моўныя сем'і. У залежнасці ад ступені падабенства ў межах моўных сем'яў вылучаюць моўныя групы і падгрупы. Некаторыя мовы не маюць сваякоў у моўным свеце. Іх называюць ізаляванымі.



*Уільям Джонс – першаадкрывальнік індаеўрапейскай моўнай сям'і.*

Па звестках выдання *Этналогія: мовы свету* ў 2017 г. існавала 7099 моваў. З іх 86 былі ізаляванымі, а астатнія падзяляліся да 237 моўных сем'яў. Але ёсць і іншыя погляды, згодна з якімі існуе 420 моўных сем'яў.

Адкрыццё моўных сем'яў адбылося дзякуючы развіццю параўнальнага мовазнаўства. У канцы XVIII ст. даследчык санскрыту, шатландскі навуковец Уільям Джонс прыйшоў да высновы аб яго падабенстве з лацінай, грэцкай і кельцкімі мовамі. Санскыт – гэта мова старажыт-

ных індыйскіх помнікаў рэлігійнай літаратуры, у тым ліку «Рыгведы», «Сама-веды», а таксама філасофскіх трактаў «Упанішады». А ў сярэдзіне XIX ст. у даследчыкаў склалася ўяўленне аб падабенстве індыйскіх, іранскіх і большасці еўрапейскіх моваў. Гэтую з'яву абазначалі як індагерманскія, а пазней – як індаеўрапейскія мовы. Пазней сфарміравалася ўяўленне і пра падабенства фіна-ўгорскіх, алтайскіх і іншых моваў.

Пра колькасць моўных сем'яў спецыялісты могуць спрачацца, здаецца, бясконца, але наўрад ці яны аспрэчаць тое, што да 10 найбуйнейшых з іх адносіцца не менш як 95% жыхароў планеты.

### *Індаеўрапейская моўная сям'я*

Мы пачнём з *індаеўрапейская моўнай сям'і*. Па-першае, яна самая вялікая паводле колькасці носьбітаў – каля 44% насельніцтва планеты (прыкладна да 3340 млн чалавек) – і займае самую вялікую геаграфічную прастору: большую частку Еўразіі, абедзве Амерыкі і Аўстралію. Акрамя таго, індаеўрапейская моўная сям'я – наша родная, а сваякоў трэба добра ведаць.

Беларуская мова ўваходзіць у склад *славянскай моўнай групы*. Яна – адна з самых складаных і падзяляецца на тры падгрупы. Ва *ўсходнеславянскую*, апроч беларускай, уключаюць украінскую і ру-




*Пашырэнне індаеўрапейскіх моваў у свеце*

скую. Асобна вылучаюць яшчэ і русінскую мову. Русіны жывуць у заходняй Украіне і памежных раёнах Славакіі і Польшчы. Ва Украіне іх мова афіцыйна лічыцца дыялектам. Агульная колькасць русінаў, паводле розных падлікаў, дасягае 600 тыс. чалавек.

Да *заходнеславянскай падгрупы* адносяць польскую, чэшскую і славацкую мовы, а таксама кашубскую, шлёнскую і лужыцкую. Але статус трох апошніх да гэтага часу няпэўны: адны лічаць іх мовамі, другія – дыялектамі. Лужычане, або сорбы, жывуць ва ўсходняй Германіі. Агульная колькасць носьбітаў мовы складае да 50 тыс. чалавек. Пры гэтым вылучаюцца два варыянты лужыцкія мовы: верхнелужыцкі і ніжнелужыцкі. Кашубская мова пашыраная на поўначы Польшчы, у ваколіцах Гданьска. Яна мае афіцыйны статус мовы этнічнай меншасці. Размаўляе на ёй больш за 100 тыс. чалавек. Кашубскую мову вывучаюць у школах і ўніверсітэце. Найбольш складанае становішча ў шлёнскай мовы. Яна пашыраная на поўдні Польшчы і ў суседняй Чэхіі. Колькасць тых, хто лічыць сябе шлянзакамі, пастаянна павялічваецца і дасягае амаль 800 тыс. чалавек. Але афіцыйнага статусу іхняя мова не мае. Сярод заходнеславянскіх моваў асобнае становішча займае славацкая мова: лічыцца, што славакаў здольныя досыць добра разумець усе славяне.

Самая шматлікая паводле колькасці моваў – *паўднёваславянская падгрупа*. У яе склад уваходзяць балгарская, македонская, сербская, харвацкая, чарнагорская, баснійская і славенская мовы. Да гэтай жа падгрупы адносяць і царкоўна-славянскую мову, кадыфікаваную ў IX ст. Кірылам і Мефодзіем, якая доўгі час была мовай царквы, асветы і справаводства сярод значнай часткі славянскіх народаў, у тым ліку і беларусаў. Сербская, харвацкая, чарнагорская і баснійская мовы – вельмі блізкія паміж сабой. Харвацкая выкарыстоўвае лацінскі алфавіт, сербская, баснійская і чарнагорская часцей выкарыстоўваюць кірыліцу, але іх носьбіты ад ужывання лацінскага алфавіта не адмаўляюцца.

Беларусь збольшага знаходзіцца ў атачэнні славянскіх народаў. Але з поўначы нашы суседзі – прадстаўнікі адной з самых невялікіх частак індаеўрапейская сям'і – *балтыйскай моўнай групы*. У яе склад уваходзяць дзве сучасныя мовы: літоўская і латышская. Літоўская мова – бадай што адна з самых унікальных. Лінгвісты




*Моўныя групы і асобныя мовы ў Еўропе*

сцвярджаюць, што яна паводле некаторых сваіх рысаў найбольш блізкая да старажытнага санскрыту. Менавіта таму, той хто хоча авалодаць санскрытам, спачатку вывучае літоўскую мову. Дадам, што яна мае таксама своеасаблівае дачыненне і да нас: у беларускай і літоўскай мове каля 1800 агульных (аднакарэнных) слоў.

Параўнальна невялікай з'яўляецца і *кельцкая моўная група*. Яна складаецца з ірландскай, валійскай (уэльскай), гэльскай, карнуэльскай, мэнскай і брэтонскай моваў. Ірландская мова, з лёсам якой часта параўноўваюць беларускую, з'яўляецца адной з дзяржаўных моваў у Ірландыі. Яе ведае каля 2 млн чалавек , але ў штодзённым жыцці на ёй размаўляе да 100 тыс. чалавек. Валійцы сваёй дзяржавы не маюць, але ў апошнія дзесяцігоддзі шмат чаго дамагліся ў адраджэнні роднай мовы. На ёй размаўляе больш за 560 тыс. чалавек, яна мае афіцыйны статус у Злучаным Каралеўстве. Калі, напрыклад, вы падаеце паперы на атрыманне візы, іх можна запоўніць на валійскай мове, нароўні з англійскай. Гэльская мова – адна з тых, на якіх размаўляюць шатландцы. Колькасць яе носьбітаў, якія жы-

вуць пераважна на поўначы, складае каля 60 тыс. чалавек. Большасць жа шатландцаў размаўляе на шкоцкім дыялекце англійскай мовы («скотс»), але карэнныя англічане яго разумеюць з цяжкасцю. Зусім мала засталася людзей, якія ведаюць карнуэльскую (ад назвы паўвыспы Корнуэл на захадзе Вялікабрытаніі) і мэнскую (на выспе Мэн паміж Англіяй і Ірландыяй) мовы. Але пры гэтым гадоў трыццаць таму карнуэльскую мову лічылі мёртвай, а сёння на ёй ужо гаворыць каля сотні чалавек. Няпроста склаўся лёс і ў брэтонскай мовы. Брэтонцы жывуць на паўвыспе Брэтань у Францыі. На працягу стагоддзяў ажыццяўляўся ўціск брэтонскай мовы. Толькі ў 2008 г. яна атрымала сімвалічны статус рэгіянальнай. Колькасць носьбітаў брэтонскай мовы скарачаецца. На сённяшні дзень гэта каля 200 тыс. чалавек пераважна сталага ўзросту.

*Германская група моваў* – адна з самых вялікіх паводле колькасці тых, хто на іх размаўляе. Галоўным чынам таму, што ў яе склад уваходзіць англійская мова. Калі не лічыць карыстальнікаў так званай «глобіш» – міжнароднай мовы сучаснасці, англійская мова родная для прыкладна 400 млн чалавек. Больш за 100 млн чалавек у Германіі, Аўстрыі, Швейцарыі і Італіі (Паўднёвы Тыроль) размаўляе на нямецкай мове. Дакладней будзе сказаць – на яе дыялектах, бо яны істотна адрозніваюцца. Вельмі блізкая да нямецкай люксембургская мова, замацаванню асаблівасцяў якой спрыяе яе афіцыйны статус нацыянальнай мовы. Нямецкае паходжанне мае гутарковая і літаратурная мова ўсходнееўрапейскіх габрэяў – ідыш. Аснова ў ёй была нямецкая, ад старажытнага іўрыту была запазычаная частка лексікі і алфавіт, значную ролю адыгрываюць таксама лексічныя і сінтаксічныя запазычанні з украінскай, беларускай і польскай моваў. На ідыш размаўлялі таксама габрэі ў нашай краіне: у 1920–1930-х гг. ідыш быў нават адной з дзяржаўных моваў у БССР. Галандская мова, як лічаць лінгвісты, выяўляе рысы падабенства з ніжненямецкімі дыялектамі і англійскай мовай. Дастаткова блізкая да галандскай фрызская мова, на якой размаўляюць насельнікі (усяго каля 500 тыс. чал.) ланцужка выспаў каля паўночнага ўзбярэжжа Нідэрландаў і Германіі. З іншага боку, каля 1,3 млн насельнікаў Нідэрландаў, Бельгіі і Германіі размаўляюць на лімбургскай мове, якую часта называюць пераходнай ад нямец-

кай да галандскай. Ад галандскай, па сутнасці, паходзіць афрыкаанс – мова нашчадкаў перасяленцаў з Нідэрландаў у Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы, Намібіі і Батсване.

Асобнае становішча займаюць паўночныя германскія мовы: шведская, нарвежская, дацкая, ісландская і фарэрская. Апошняя – самая маленькая паводле колькасці носьбітаў германская мова (разам каля 50 тыс. чалавек). Фарэрцы жывуць на архіпелагу ў паўночнай частцы Атлантычнага акіяна, паміж Нарвегіяй і Ісландыяй. Фарэрская мова блізкая да ісландскай; яна жывая, на ёй вядзецца выкладанне, у тым ліку і ва ўніверсітэце. Фарэрцы – адзін з самых маленькіх народаў у свеце, які мае ўласны ўніверсітэт.

*Раманская група моваў* паводле колькасці носьбітаў (да 800 млн чал.) перавышае германскую. Усе раманскія мовы паходзяць ад старажытнай лаціны і даволі блізкія паміж сабой. Самая пашыраная – іспанская мова. На ёй размаўляе да 470 млн чалавек. Акрамя Іспаніі, яна пашыраная ў краінах Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыкі, а таксама ў Афрыцы (Экватарыяльная Гвінея) і Азіі (часткова на Філіпінах). Трэба адзначыць, што ў краінах Лацінскай Амерыкі склаліся мясцовыя варыянты іспанскай мовы, якія ўсё больш і больш адрозніваюцца паміж сабой. Вялікую геаграфію пашырэння мае таксама і партугальская мова (усяго да 260 млн чалавек), якою карыстаюцца ў Бразіліі, Анголе, Мазамбіку, Гвінеі-Бісау і ў Макаа (цяпер у складзе Кітая). На французскай мове размаўляе больш за 150 млн чалавек , у тым ліку, апроч самой Францыі, у Бельгіі (Валонія), Швейцарыі, Канадзе, а таксама ў шэрагу афрыканскіх краін: Алжыры, Сенегале, Габоне і інш. Прамым нашчадкам старажытнай лаціны лічыцца італьянская мова, на якой размаўляюць у Італіі і Швейцарыі. Шматлікія грамады мігрантаў-італьянцаў існуюць у Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы. Усяго налічваюць да 90 млн носьбітаў гэтай мовы. Асобна вылучаюцца ўсходнераманскія мовы: румынская, раманшская і малдаўская. Што тычыцца апошняй, то яе статус да гэтага часу спрэчны. Яна надзвычай блізкая да румынскай. Але існуе меркаванне, што малдаўская мова ўсё ж асобная. Як відаць, шмат якія раманскія мовы пашыраныя далёка за межамі каланіяльных метраполій. Разам з тым, у саміх Іспаніі, Францыі ды Італіі захавалася вялікая колькасць




*Мовы іранскай і індыйскай моўных групаў*

рэгіянальных раманскіх моваў. Найбольш стракатая сітуацыя ў Італіі, дзе літаратурная мова заснаваная на тасканскім дыялекце. Ад яго моцна адрозніваюцца сардская мова (на выспе Сардзінія), сіцылійская (на Сіцыліі), рэтараманскія (у Альпах). Апошняя мае статус дзяржаўнай у Швейцарыі, нароўні з нямецкай, французскай і італьянскай. У Францыі асобна вылучаюцца аксітанская (правансальская) і карсіканская мовы (на выспе Корсіка), у Іспаніі – каталанская (блізкая да аксітанскай) і галісійская (блізкая да партугальскай). Становішча гэтых моваў складанае: цэнтральныя ўлады разглядаюць іх як дыялекты, а не як самастойныя мовы.

У межах індаеўрапейская моўнай сям'і ёсць некалькі моваў, якія не маюць блізкіх сваякоў і вылучаюцца ў асобныя групы: *албанскую, армянскую і грэцкую.* Албанская мова з'яўляецца афіцыйнай у Албаніі і Косаве. Армянская група ўключае ў сябе старажытныя і сучасную формы армянскай мовы. Характэрная рыса – унікальны алфавіт, які быў створаны ў пачатку V ст. н. э. Грэцкая група таксама складаецца з гістарычных формаў, вельмі адрозных ад сучасных, і афіцыйных сучасных: грэцкай і кіпрскай грэцкай.

На мовах (каля 90) *іранскай моўнай групы* размаўляюць да 200 млн чалавек . Самыя пашыраныя з іх – іранская (або фарсі),

падобная да яе дары ў Афганістане, курдская, афганская (або пушту), таджыкская, талышская. Да гэтай групы адносіцца таксама мёртвая авестыйская мова, на якой былі напісаныя сакральныя тэксты старажытнай рэлігіі зараастрызму. Асобна ад асноўнага масіву іранскіх моваў разглядаецца асецінская мова на Паўночным Каўказе.



*Дравідыйская моўная сям’я*

Найбольшую колькасць носьбітаў мае *індыйская моўная група*, агулам – каля 900 млн чалавек . Большасць з тых, хто размаўляе на іх, жыве ў чатырох дзяржавах: Індыі, Пакістане, Бангладэш і Непале. Найбуйнейшая мова гэтай групы – хіндустанская (усяго да 330 млн), у межах якой адрозніваюць самую вялікую з афіцыйных моваў Індыі, хіндзі, і афіцыйную мову Пакістана, урду. Яны вельмі падобныя паміж сабой. Адрозненні выяўляюцца ў алфавіце: хіндзі выкарыстоўвае свой, унікальны, урду – заснаваны на арабскай графіцы. Бенгалі (да 300 млн) – афіцыйная мова ў Бангладэш і другая паводле колькасці носьбітаў мова ў Індыі. На панджабі размаўляе да 100 млн чалавек . Гэта самая пашыраная мова ў Пакістане. Вялікай колькасцю носьбітаў вылучаюцца таксама маратхская (73 млн), гуджарацкая (49 млн) і мова непалі (афіцыйная ў Непале, 17 млн).

*Мовы дравідыйскай сям’і* пашыраны на поўдні Індыі і поўначы Шры-Ланкі. На іх размаўляе каля 220 млн чалавек . Найбольш вядомыя мовы – тэлугу (звыш 81 млн чалавек ), тамільская (70 млн) і ка́нада (43 млн).

### *Сіна-тыбецкая моўная сям’я*

Сіна-тыбецкая моўная сям’я займае другое месца ў свеце паводле колькасці носьбітаў – каля 1340 млн чалавек, або 17,3% насельніцтва

планеты. Яна ўключае ў сябе да 400 розных моваў, якія падзяляюцца на 40 групаў. Найбольш вядомыя з іх тыбетскія мовы – каля 6 млн носьбітаў. Тыбетцы жывуць на вялікай, цяжкадаступнай тэрыторыі, таму ў іх вылучаюцца 25 асобных моваў і больш за 200 разнастайных дыялектаў. Больш за 30 млн чалавек размаўляе на мовах бірманскай групы. Кітайская група ўключае ў сябе вялікую колькасць дыялектаў, адрозненні паміж якімі, на думку лінгвістаў, падобныя да тых, што, напрыклад, існуюць паміж раманскімі мовамі. Найбольш пашыраным з'яўляецца хань, або так званы мандарынскі кітайскі (паходзіць ад старажытнай назвы чыноўнікаў у Кітаі), які мае афіцыйны статус у самім Кітаі, на Тайвані і ў Сінгапуры. Гэта самая вялікая ў свеце мова па колькасці носьбітаў – усяго да 885 млн чалавек .




*Сіна-тыбецкая моўная сям'я*

Акрамя гэтага, вылучаюцца мовы/дыялекты ў (77 млн), уе, або кантонская (66 млн), мінь (60 млн), сянг, або хунань (36 млн), хака (34 млн) і ган (20 млн).

Асаблівасцю *цюркскай моўнай сям'і* з'яўляецца вялікая ступень падабенства паміж 35 мовамі: практычна ўсе іх носьбіты добра разумеюць адно аднаго. Цюркі расселеныя на вялікай тэрыторыі: ад Турцыі на захадзе да ўзбярэжжа паўвыспы Таймыр у Сібіры, дзе жыве адзін з самых маленькіх цюркскіх народаў – долганы. Найбуйнейшымі паводле колькасці носьбітаў з'яўляюцца турэцкая (70 млн), узбекская (32 млн), азербайджанская (26 млн), казахская (15 млн) мовы. Больш як 600 гадоў на тэрыторыі Беларусі жывуць цюркамоўныя з паходжання татары. Агульная колькасць цюркамоўных народаў складае да 170 млн чалавек .




*Цюркскія, мангольская, карэйская і японская мовы*

Некаторыя даследчыкі лічаць, што існуе падабенства паміж, з аднаго боку, цюркскімі і, з другога боку, мангольскімі (каля 5,7 млн чалавек) ды тунгускімі (народы Сібіры, 75 тыс.), а таксама карэйскай (80 млн) і японскай (128 млн) мовамі. З гэтага яны робяць выснову аб існаванні алтайскай моўнай сям’і, але далёка не ўсе спецыялісты яе падзяляюць.

Значная колькасць народаў Паўднёва-Усходняй Азіі адносіцца да двух моўных сем’яў:




*Аўстразіяцкая моўная сям’я*



*Тайская моўная сям'я*

*аўстразіяцкай* і *тайскай*. Самыя вядомыя мовы першай – в'етнамская (75 млн носьбітаў) і кхмерская (16 млн), другой – тайская (20 млн) і лао (3 млн).

*Аўстранезійская моўная сям'я* мае надзвычай шырокую геаграфію: ад Гавайскіх выспаў на ўсходзе да Мадагаскара на захадзе. Большасць тых, хто размаўляе на гэтых мовах, жывуць на Малайскім архіпелагу і Філіпінах, а іх агульная колькасць дасягае 386 млн чалавек. У склад моўнай сям'і ўваходзіць больш за 1200 моваў. Самыя вялікія паводле колькасці носьбітаў – малайская мова, пашыраная




*Аўстранезійская моўная сям'я*

ў Інданезіі, Малайзіі, Брунеі і Сінгапуры (каля 77 млн), яванская (да 98 млн), філіпіна, або тагалог (28 млн), малагасійская на Мадагаскары (18 млн).

*Афра-азійская моўная сям'я* аб'ядноўвае народы Паўночнай Афрыкі і Заходняй Азіі. У яе склад уваходзіць каля 300 моваў, а колькасць носьбітаў рознымі крыніцамі вызначаецца ад 380 да 485 млн чалавек. Самая вялікая група гэтай сям'і – семіцкая, да

*Афра-азійская моўная сям'я*




якой адносяцца арабскія мовы (каля 300 млн чалавек), амхара (мова найбуйнейшага народа Эфіопіі, 23 млн), тыгрыння (Эфіопія, 7 млн) і іўрыт (каля 5 млн). Да гэтай групы належыць таксама мальтыйская мова (каля 0,5 млн) – адзіная семіцкая мова ў Еўрасаюзе. Што тычыцца арабскіх моваў, то трэба ведаць што сакральная арабская мова Карана адрозніваецца ад размоўных арабскіх гаворак у розных краінах. Яшчэ больш яны розняцца паміж сабой. Асобную групу афра-азійскіх моваў складаюць берберскія мовы, на якіх размаўляюць насельнікі Сахары. Самы вялікі народ гэтай групы – кабілы (каля 5 млн). На поўдзень ад Сахары жывуць носьбіты чадскіх моваў; сярод іх мова хаўса з'яўляецца роднай для 27 млн чалавек. Адначасова яна, гэтак сама як і суахілі, выконвае ролю мовы пасярэдніка ў Заходняй Афрыцы, і ёю валодаюць яшчэ 150 млн чалавек. А на тэрыторыі Афрыканскага Рогу пашыраны кушыцкія мовы: арома (41 млн), самалі (16 млн) і інш.

*Нігера-кангалезская моўная сям'я* аб'ядноўвае большасць афрыканскіх народаў Субсахарскага рэгіёна. Да яе належаць больш за 1,5 тыс. моваў і каля 700 млн носьбітаў. Прыкладна палова з іх размаўляе на мовах банту. Бадай, самая вядомая



*Нігера-кангалезская моўная сям'я*

*Уральская моўная сям'я*



з іх – мова суахілі, якую выкарыстоўваюць у якасці мовы міжнацыянальных зносінаў у рэгіёне вялікіх афрыканскіх азёр. Ёй валодае да 80 млн чалавек . Найбольш вялікімі паводле колькасці носьбітаў з'яўляюцца мовы ёруба (больш за 30 млн чалавек) у Нігерыі і Беніне, ігба (24 млн) у Нігерыі, шона (10 млн) у Зімбабве.

Асобнае месца сярод народаў Еўразіі займаюць носьбіты *ўральскіх моваў*. Гэта невялікая сям'я: толькі 25 млн чалавек і 38 моваў. Большасць уральскіх народаў жыве на поўначы: гэта фіны (5,4 млн), эстонцы (1,1 млн), марыйцы (450 тыс.), удмурты (340 тыс.). Самы вялікі народ гэтай сям'і, венгры (13 млн), жывуць у цэнтры Еўропы. Тут яны з'явіліся ў X ст. Іх міграцыя завяршыла эпоху вялікага перасялення народаў. Цікава, што бліжэйшыя моўныя сваякі венграў – ханты (30 тыс.) і мансі (12 тыс.) – жывуць у Заходняй Сібіры. Па некаторых звестках, напрыклад, мяркуючы па назвах рэк і азёр (Лахва, Свір) фіна-ўгорскага паходжання, сваякі продкаў сучасных эстонцаў і фінаў у старажытнасці жылі і на тэрыторыі Беларусі – прынамсі, на Віцебшчыне. Пісьменнік Іван Ласкоў нават прапаноўваў гіпотэзу фіна-ўгорскага паходжання беларусаў, але большасць даследчыкаў ставіцца да яе скептычна.

Гэта далёка не ўсе моўныя сем'і. Ёсць яшчэ каўказская моўная сям'я, да якой адносіцца грузінская мова; пама-ньюнга (мовы карэннага насельніцтва Аўстраліі); транс-гвінейская, якая складаецца з больш як 300 моваў жыхароў Папу. Але якой бы дасканалай ні была лінгвістычная класіфікацыя, па-за межамі яе абавязкова застанецца некалькі моваў. І праблема тут не ў недахопах навуковага метаду, а ў тым, што ёсць мовы, у якіх сваякоў няма. Іх яшчэ называюць ізаляванымі. Бадай, самым вядомым сярод іх прыкладам ёсць мова баскаў – народа, які жыве на тэрыторыі Іспаніі і Францыі. Усе спробы знайсці сваякоў басконскай мовы, у тым ліку ў выглядзе мовы грузінскай ці чачэнскай, плёну не далі. Часцей за ўсё яе вызначаюць як мову, якая ўтварылася да рассялення індаеўрапейцаў у Еўропе. Сёння на эўскары (так баскі называюць сваю мову) размаўляе да 750 тыс. чалавек, а агульная колькасць баскаў складае каля 1,2 млн чалавек.

Моўная разнастайнасць, падобна да разнастайнасці біялагічнай, ёсць неабходнай умовай захавання адаптацыйных уласцівасцяў чалавецтва. На жаль, колькасць ужываных моваў скарачаецца. Знікненне кожнай – страта не толькі здольнасці да выжывання, але і моўных скарбаў, якіх можа не быць больш нідзе. У мове яган – народа, які згадваўся ў першым раздзеле, ёсць слова, унесенае ў сусветную кнігу рэкордаў як самае змястоўнае з усіх вядомых на зямлі. Уявіце сябе, што адным гэтым словам азначаецца «сітуацыя, калі два чалавекі чагосьці жадаюць і кожны чакае, што другі пачне гэтага дамагацца, але ні адзін, ні другі гэтага не робіць». У 2012 годзе заставалася толькі адна асоба на ўсёй планеце, якая валодала мовай яган.

## Падсумаванне

Шматмоўе – адна з самых яскравых праяваў культурнай разнастайнасці чалавецтва. На планеце налічваецца каля 7000 моваў. Іх класіфікацыя – г. зн. падзел на моўныя сем'і, групы і падгрупы – складае падмурак уяўленняў аб культурнай разнастайнасці. Да 10 найбуйнейшых моўных сем'яў належыць 95% насельніцтва планеты. Самай вялікай паводле колькасці носьбітаў з'яўляецца індаеўрапейская моўная сям'я, у якую ўваходзіць і беларуская мова.

# Раздзел 4.
# Стратэгіі жыццезабеспячэння

*Гістарычныя тыпы здабывання ежы.*
*Спажывецкія стратэгіі. Паляванне і збіральніцтва: агульная характарыстыка. Конныя і водныя паляўнічыя і збіральнікі.*
*Вытворчыя стратэгіі. Неалітычная рэвалюцыя: сацыяльныя і культурныя наступствы. Ручная апрацоўка зямлі (хорцікультура).*
*Пастаралізм: намадызм, трансхуманцыя.*
*Ворыўная апрацоўка зямлі (агракультура). Тэхналогіі.*
*Сацыяльныя наступствы пераходу да ворыўнай апрацоўкі зямлі. Цывілізацыі.*
*Індустрыялізаваныя спосабы вытворчасці прадуктаў харчавання. Сацыяльныя наступствы пераходу да індустрыялізаванай вытворчасці харчавання.*

Некалькі стагоддзяў развіцця ведаў аб культурнай разнастайнасці чалавецтва прывялі спецыялістаў да аднаго вельмі істотнага заключэння: як бы гэта ні гучала банальна, але структура грамадства, форма сацыяльнай няроўнасці, тып сямейных адносінаў і нават уяўленні пра звышнатуральныя з'явы залежаць урэшце ад таго, якім чынам людзі забяспечваюць свае падставовыя патрэбы існавання і, у першую чаргу, здабываюць харчаванне. Іншымі словамі, стратэгія жыццезабеспячэння вызначае лад жыцця чалавечага грамадства.

На працягу сваёй гісторыі чалавецтва выпрацавала пяць такіх стратэгій, шостая нараджаецца на нашых вачах.

### *Паляванне і збіральніцтва*

Паляванне і збіральніцтва – найстарэйшая з усіх стратэгій: больш за 90% часу свайго існавання людзі былі паляўнічымі і збі-

ральнікамі. Яна, у адрозненне ад усіх астатніх, яшчэ завецца стратэгіяй прысвойвання, бо некалі ўсё неабходнае для жыцця людзі атрымлівалі ад прыроды ў натуральным выглядзе.



Аўстраліец на паляванні

Нягледзячы на фанабэрыстае стаўленне «цывілізаваных» народаў да «дзікуноў» – паляўнічых і збіральнікаў, веды пра іх маюць надзвычай вялікае значэнне. Па-першае, менавіта ў тыя часы адбылося станаўленне ці не большасці сацыяльных інстытутаў чалавечага грамадства, якія ў мадыфікаванай форме працуюць і сёння. Па-другое – што можа паказацца дзіўным, – шмат якія мадэлі паводзінаў гэтых народаў могуць быць запатрабаваныя ў самай бліжэйшай будучыні для вырашэння сацыяльных выклікаў будучага грамадства чацвёртай індустрыяльнай рэвалюцыі.

Разам з тым, нашы ўяўленні пра паляўнічых і збіральнікаў, на жаль, далёка не поўныя. Рэч у тым, што на працягу прынамсі апошніх дзесяці тысячагоддзяў больш тэхналагічна развітыя народы выціскалі іх з камфортнага экалагічнага асяроддзя. На момант пачатку сістэматычных даследаванняў, г. зн. прыкладна 150 гадоў таму, паляўнічыя і збіральнікі жылі ў тых мясцовасцях, дзе, апроч іх, ніхто выжыць не мог. Гэта такія рэгіёны, як пустыні і паўпустыні



Бушмены сан на стаянцы

поўдня Афрыкі і Аўстраліі, экватарыяльныя вільготныя лясы Афрыкі і Паўднёва-Усходняй Азіі, зоны тундры ў Паўночнай Амерыцы і Еўразіі.

Напрыклад, паляўнічыя і збіральнікі сан жывуць у пустыні Калахары, дзе сярэднегадавая норма ападкаў складае каля 100 мм. Асаблівасцю клімату з’яўляюцца моцныя тэмпературныя кантрасты ў зімовы перыяд, калі ўдзень паветра праграваецца да ўзроўню вышэй за+30°С, а ўначы паніжаецца да +5–6°С і суправаджаецца моцнымі туманамі. У пустыні бедны раслінны і жывёльны свет, не хапае крыніц вады.



*Баяка ў Цэнтральнай Афрыцы*

Нягледзячы на істотныя адрозненні асяроддзя існавання, ва ўсіх паляўнічых і збіральнікаў навукоўцы заўважылі падобныя рысы ладу жыцця. Практычна ўсе яны вялі качавы лад жыцця, што дыктавалася міграцыяй жывёл-аб’ектаў палявання, зменай паравін года і г. д. Сталых паселішчаў і, адпаведна, сталага жытла ў іх не існавала. Разам з тым, грамады паляўнічых і збіральнікаў часта мелі стабільныя маршруты вандраванняў і неаднаразова спыняліся ў адных і тых самых месцах. Для іх была характэрная малая колькасць і шчыльнасць насельніцтва. Калі нашы далёкія продкі таксама трымаліся такой стратэгіі, усё насельніцтва тэрыторыі Беларусі складала каля 2 тыс. чалавек. У гэтых грамадствах існаваў дакладна вызначаны гендарны падзел працы: мужчыны займаліся паляваннем, жанчыны – збіральніцтвам. Асноўную сацыяльную адзінку складалі грамады-абшчыны звычайна колькасцю па 40–80 чалавек. Грамадствы паляўнічых і збіральнікаў былі пабудаваныя на прынцыпах эгалітарызму (роўнасці), у іх адсутнічала сацыяльная няроўнасць, не было персаналізаваных палітычных роляў (кіраўнікоў). Яны

свядома пазбягалі канфліктаў як унутры грамадаў, так і паміж імі. У іх адсутнічала сацыяльная і гендарная няроўнасць. Тыповай формай сям'і была так званая нуклеарная сем'я, якая складалася з бацькоў і непаўналетніх дзяцей. Тыповыя формы рэлігійнага жыцця прадугледжвалі магчымасць беспасрэднага доступу асобы да сферы звышнатуральнага.

На працягу стагоддзяў у еўрапейскім мысленні дамінаваў вобраз паляўнічага-збіральніка як «гаротнага дзікуна», адвечна галоднага валацугі, апантанага толькі пошукамі ежы. Лічылася, што недахоп вольнага часу не дазваляў ім займацца культурай, мастацтвам, навукай, што і было прычынай адсутнасці прагрэсу. Антрапалагічныя даследаванні 1970–1990-х гг., накіраваныя на падрабязнае вывучэнне гэтай стратэгіі жыццезабеспячэння, у тым ліку – на хранаметраж гаспадарчых заняткаў, прадэманстравалі, што ў сапраўднасці сітуацыя зусім іншая. Высветлілася, што нават не ў самых спрыяльных экалагічных умовах паляўнічыя і збіральнікі выдаткоўваюць на забеспячэнне сябе ўсім неабходным прыкладна па 4–5 гадзін у дзень. Пры гэтым, з пункту погляду сучаснай дыеталогіі, яны мелі надзіва збалансаваную сістэму харчавання, якое складалася з мяса дзікіх жывёл, дзікай гародніны і садавіны, арэхаў, мёду. Яны мелі вялікую колькасць вольнага часу, які выдаткоўваўся на выхаванне дзяцей, зносіны са сваякамі, а таксама на заняткі літаратурнай і мастацкай творчасцю. Высветлілася таксама, што прадстаўнікі гэтых грамадстваў валодалі, па сутнасці, энцыклапедычнымі ведамі ў галіне геаграфіі, заалогіі, батанікі, медыцыны і г. д. Іх сярэдняя працягласць жыцця складала каля 40 гадоў, галоўным чынам у выніку вельмі высокай дзіцячай смяротнасці. Але больш за 10% паляўнічых і збіральнікаў дажывала да 60 гадоў і болей.

Асаблівасцю паляўнічых і збіральнікаў была экалагічная ўстойлівасць: іх існаванне не наносіла непапраўнай шкоды прыродзе. Гэты тэзіс апошнім часам аспрэчваецца палеантолагамі і археолагамі, якія сцвярджаюць, што знікненне так званай «мегафаўны» (мамантаў, напрыклад) пасля заканчэння апошняга зледзянення было вынікам паляўнічай актыўнасці нашых продкаў. Хутчэй за ўсё, так яно і было. Але нічога падобнага не заўважана за часы вывучэння паляўнічых і збіральнікаў у апошнія 100–150 гадоў.

Пры наяўнасці вялікай ступені падабенства паміж асобнымі тыпамі паляўнічых і збіральнікаў існавалі і пэўныя адрозненні. Там, дзе аснову харчавання складалі прадукты збіральніцтва, у большай ступені выяўлялася эгалітарная прырода грамадства. А там, дзе большай была роля палявання, – наадварот.

Асобны выпадак – гэта грамадствы, якія былі заснаваныя на рыбалоўстве і знаходзіліся ў рэгіёнах з багатымі прыроднымі рэсурсамі. У гэтых умовах з'яўляліся сталыя паселішчы, адбывалася сімвалічнае і рэальнае расслаенне насельніцтва, павялічваліся ўнутраныя і міжпляменныя канфлікты. Найбольш тыповы прыклад – карэннае насельніцтва паўночна-заходняга ўзбярэжжа Паўночнай Амерыкі (тлінкіты, хайда, квакіутл).

### *Хорцікультура (гародніцтва), або ручная апрацоўка зямлі*

На змену стратэгіі паляўнічых і збіральнікаў пасля заканчэння перыяду зледзянення прыходзіць першая вытворчая стратэгія – хорцікультура (гародніцтва). Яна заснаваная на вырошчванні культурных раслін без ужывання цяглавой сілы жывёл, выключна рукамі чалавека. Адсюль і адна з назваў стратэгіі: ручная апрацоўка зямлі. Тыповай прыладай была простая завостраная палка, саджальны кол.



*Ручная апрацоўка зямлі ў сучаснай Індыі*

Хорцікультура нам вядомая збольшага ў выніку вывучэння народаў, якія жывуць у зоне вільготных экватарыяльных лясоў – там, дзе для іншых формаў сельскай гаспадаркі спрыяльных умоваў няма. Тыповымі культурамі з'яўляюцца клубневыя рас-

ліны, у першую чаргу ямс і таро, а таксама, кукуруза, рыс, пшаніца. Звычайна на адным і тым самым полі вырошчвалі некалькі розных відаў раслін. Характэрнай тэхналогіяй была распрацоўка ляда: калі высякаўся кавалак лесу і драўніна спальвалася, што на некалькі гадоў забяспечвала добры ўраджай. Пасля гэтага такім самым чынам даводзілася распрацоўваць новую дзялянку. Такую тэхналогію яшчэ называюць «рухомая апрацоўка зямлі». Яна нагадвае тое, як рабілі ляда і ў Беларусі яшчэ ў XVI ст. Але трэба ведаць, што беларусамі гэтая тэхналогія ўжывалася ва ўмовах іншай стратэгіі жыццезабеспячэння. Асаблівасцю хорцікультуры з’яўляецца тое, што пры ёй жывёлагадоўля або адсутнічае, або адыгрывае другарадную ролю. Пры гэтым захоўваецца значная роля палявання і збіральніцтва.



*Ямс – тыповая культура ў ручной апрацоўцы зямлі*

Пераход да першай вытворчай стратэгіі выклікаў вельмі істотныя змены ў ладзе жыцця. У адпаведнасці з археалагічнай перыядызацыяй гісторыі чалавецтва яны прыпадаюць на эпоху но-



*Паселішча ручных земляробаў у Папуа – Новай Гвінеі*

вага каменнага веку і атрымалі назву «неалітычная рэвалюцыя». Гэта самая маштабная рэвалюцыя ў гісторыі чалавецтва, якая закранула ўсе сферы існавання. Магчыма, толькі тое, што адбываецца ў наш час у сувязі з развіццём штучнага інтэлекту, рабатызацыі і біятэхналогій, будзе здольнае настолькі ж радыкальна паўплываць на лад жыцця людзей.

Самае галоўнае, што адбылося, – чалавецтва перайшло да аселасці, жыцця ў стацыянарных паселішчах. Гэта рашучым чынам паўплывала на колькасць і шчыльнасць насельніцтва. Апошняя павялічылася ў 30–40 разоў. Тыповай адзінкай сацыяльнага жыцця становіцца вясковая абшчына з насельніцтвам у сярэднім 200–500 чалавек. На змену нуклеарным прыходзяць вялікія шматпакаленныя сем'і з вялікай колькасцю дзяцей. Такія сямейныя калектывы найлепшым чынам падыходзілі да патрэбаў ручной апрацоўкі зямлі.

Ці не найбольшыя змены закранулі сістэму палітычнай арганізацыі грамадства. У значнай колькасці выпадкаў (але далёка не ва ўсіх) кіраванне канцэнтравалася ў руках правадыра, які адначасова выконваў усе магчымыя функцыі ўлады: судовую, заканадаўчую, вайсковую і рэлігійную. Маёмаснае расслаенне было яшчэ неістотным, але сваяцкая блізкасць да сям'і правадыра рабілася падмуркам размеркавання прэстыжу – сацыяльна прызнанага ўзроўню павагі. Тыповай рысай хорцікультуралісцкіх грамадстваў стала рэзкае павелічэнне канфліктаў, культ гвалту і вайны. Часта войны насілі рытуальны характар, удзел у якіх быў абавязковай умовай сацыялізацыі новага пакалення.

Пераход да вытворчай стратэгіі выклікаў істотныя змены ў структуры харчавання: яно стала менш збалансаваным – у прыватнасці, істотна скарацілася ўжыванне бялковай ежы ў параўнанні з паляўнічымі і збіральнікамі. Новыя выклікі ствараў таксама пераход да аселасці. Запасы ежы нязменна прыцягвалі пацукоў, мышэй і іншых пераносчыкаў інфекцый. Іх пашырэнню спрыяла канцэнтрацыя людзей у адным месцы, адсутнасць санітарыі. Спадарожнікамі пераходу да ручной апрацоўкі зямлі сталі невядомыя раней хваробы: грып, сібірская язва, воспа і адзёр. Дзіцячая смяротнасць знізілася, але агульная працягласць жыцця не стала

большай. Істотна змяніўся лад жыцця, у тым ліку інтэнсіўнасць і працягласць часу працы.

### *Пастаралізм*

Пастаралізм – гэта стратэгія жыццезабеспячэння, заснаваная на гадоўлі хатніх жывёл. Храналагічна ўзнікненне пастаралізму адпавядае фарміраванню хорцікультуралізму. Гэта варыянт неалітычнай рэвалюцыі, які палягаў у пераходзе да вытворчай стратэгіі там, дзе апрацоўка зямлі была немагчымая: у арыдных рэгіёнах ці ў горнай мясцовасці. Уласна з'яўленне пастаралізму звязваюць з так званай другаснай прадуктовай рэвалюцыяй у жывёлагадоўлі: калі жывёл пачалі выкарыстоўваць не толькі дзеля вытворчасці мяса, але і малака, воўны, а таксама ў якасці цяглавай сілы і транспартнага сродку. Калі не лічыць сабак ды катоў, у якіх былі іншыя функцыі, то першымі ўласна прадуктыўнымі жывёламі былі козы і авечкі. Яны маюць унікальную здольнасць харчавацца раслінамі, непрыдатнымі не толькі для чалавека, але і для большасці іншых жывёл. Пазней былі прыручаныя коні і буйное быдла. Рэгіянальны характар мае прыручэнне вярблюдаў, якаў, аленяў.



*Пастаралісты на поўначы Нігерыі*

Класічныя пастаралісты, у адрозненне ад сучасных жывёлагадоўцаў, не займаюцца нарыхтоўкай кармоў для жывёлы. Таму часцей за ўсё пастаралісты вядуць качавы лад жыцця, які яшчэ завецца «намадызм». Спецыфічнай формай пастаралізму з'яўляецца трансхуманцыя – напалову аселая жывёлагадоўля. Яна практыкуецца, напрыклад, у горнай мясцовасці, калі летам жывёлу адганяюць на высакагорныя пашы, а зімуе яна ў далінах. Ці, напрыклад,



*Пастаралісты ў сучаснай Індыі*

ва Усходняй Афрыцы ў дажджлівы сезон жывуць у стацыянарных паселішчах, а ў сухі – вандруюць.

У сувязі з качавым ладам жыцця пастаралісты па некаторых паказчыках шмат чым нагадваюць паляўнічых і збіральнікаў: для іх характэрная невялікая колькасць і шчыльнасць насельніцтва (у 3–5 разоў меншая ад земляробаў). Разам з тым, у пастаралістаў фарміравалася маёмаснае расслаенне, якое выяўлялася ў рознай колькасці ўласнай жывёлы. У некаторых яе часцяком было столькі, што гэта значна перавышала іх патрэбнасці ў харчаванні. У палітычных адносінах пастаралісты маглі мець як нецэнтралізаваную палітычную сістэму, так і цэнтралізаваную, кшталту грамады з правадыром.

Асаблівасцю пасталізму з'яўляецца тое, што ён вельмі часта меў сімбіёзны характар: пастаралісты былі вымушаныя кантактаваць з земляробчымі народамі, каб праз гандаль атрымліваць неабходныя прадукты харчавання – напрыклад, збожжа.



*Юрта – тыповае жыллё пастаралістаў Цэнтральнай Азіі (Кыргызстан)*

### *Агракультура, або плужная (ворыўная) апрацоўка зямлі*

Агракультура, або плужная (ворыўная) апрацоўка зямлі, як стратэгія жыццезабеспячэння заснавана на трох тэхналагічных дасягненнях, невядомых ручным земляробам: выкарыстанні цяглавой сілы жывёл, натуральных угнаенняў і ірыгацыі. Агракультура азначае спалучэнне апрацоўкі зямлі і жывёлагадоўлі. У адрозненне ад хорцікультуры для яе характэрнае вырошчванне збожжавых культур: пшаніцы, жыта, рысу, кукурузы. Ад пастаралізму агракультура адрозніваецца тэхналогіяй нарыхтоўкі кармоў для жывёлы, перавагай малочнай жывёлагадоўлі і мясной свінагадоўляй.



*Плужная апрацоўка зямлі ў Старажытным Егіпце*

Асноўнай вытворчай адзінкай становіцца сялянская гаспадарка, заснаваная на прынцыпах натуральнага гаспадарання. Гэта значыць, што ўсё ці амаль усё неабходнае для жыцця выраблялася ў межах самой гаспадаркі. Гаспадарчай адзінцы адпавядала вялікая шматпакаленная сям'я, якая, падобна як і ў ручных земляробаў, найлепшым чынам адпавядала тыпу вытворчасці. Разам з тым эфектыўнасць сялянскай гаспадаркі была невысокая. Часта здараліся няўрод і голад.



*Плужная апрацоўка зямлі ў сучаснай Індыі*

Для грамадства, заснаванага на агракультуры, характэрна найбольш рэзка выяўленае расслаенне. Пераважную большасць, да 90–95%, складалі вытворцы харчавання – сяляне, якія былі найбольш дыскрымінаванай групай насельніцтва. У некаторых выпадках становішча сялян – рабоў і прыгонных – мала чым адрознівалася ад жывёлы. Меншасць грамадства складалі сацыяльныя групы тых, хто на прафесійным узроўні адказваў за абарону грамадства (ваяры) і яго доступ да звышнатуральнага свету (святары). Дзве гэтыя групы кантралявалі палітычную ўладу, якая часцей за ўсё належала непасрэдна адной сям'і і перадавалася ў спадчыну. Сацыяльныя адрозненні наўмысна падкрэсліваліся і выяўляліся ў ладзе жыцця, адзенні, мове і нават у знешнім выглядзе.



*Апрацоўка зямлі ў горным В'етнаме*

Характэрнай прыкметай агракультуры з'яўляецца тое, што на яе падмурку ўтвараліся цывілізацыі, прыкметамі якіх ёсць гарады, пісьмовасць і дзяржава. Трэба падкрэсліць, што ў некаторых выпадках цывілізацыі ўзнікаюць і на аснове ручной апрацоўкі зямлі: напрыклад, дакалумбавыя цывілізацыі Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыкі.

### *Індустрыялізаваная стратэгія жыццезабеспячэння*

Развіццё індустрыяльнай вытворчасці ў канцы XVIII–XX ст. карэнным чынам адбілася і на вытворчасці харчавання. Індустрыялізаваная стратэгія жыццезабеспячэння ў гэтай галіне ўключае ўжыванне механічных сродкаў апрацоўкі зямлі, сімвалам якіх стала пашырэнне ўніверсальных сельскагаспадарчых машын – трактароў. У жывёлагадоўлю прыйшлі індустрыялізаваныя тэхналогіі

вытворчасці (птушкафабрыкі, механізаваныя фермы). Яны праніклі нават у кансерватыўную сферу здабычы рыбы, дзе на змену традыцыйнай лоўлі прыйшлі тэхналогіі аквакультуры.



*Плантацыя шпінату*

Тэхналагічныя інавацыі выклікалі надзвычай істотныя сацыяльныя змены: упершыню ў гісторыі чалавецтва большасць людзей аказалася выключанай з вытворчасці харчавання. На сённяшні дзень у эканамічна развітых краінах ёй займаецца ўсяго некалькі адсоткаў насельніцтва. І гэтага цалкам дастаткова, каб пракарміць усіх астатніх. Пераважную большасць складаюць працаўнікі, занятыя ў індустрыі і сферы паслуг. Сацыяльныя адрозненні – галоўным чынам маёмасныя – не робяцца меншымі, але яны падкрэсліваюцца ў значна меншай ступені, чым раней. У палітычнай сферы характэрнае спаборніцтва дэмакратычных і аўтарытарных / таталітарных формаў кіравання. Уяўленні аб звышнатуральным становяцца менш актуальнымі для значнай часткі насельніцтва. На змену вялікім сем’ям прыходзіць нуклеарная сям’я, падобна як у паляўнічых і збіральнікаў. Яна найлепшым чынам адпавядае прынцыпу мабільнасці, здольнасць да якой забяспечвае большы поспех у спаборніцтве на рынку працы.



*Сучасная птушкафабрыка*

Прыведзеныя намі стратэгіі жыццезабеспячэння адлюстроўваюць ступені тэхналагічнага і сацыяльнага развіцця чалавецтва. Час-



*Сучасная рыбная ферма*

та іх разглядаюць у якасці ступеняў прагрэсу, ці то пераходу ад горшага да лепшага. Аднак уважлівыя даследаванні ладу жыцця паляўнічых і збіральнікаў, пра якія гаварылася раней, ставяць пад пытанне такі погляд. Іншымі словамі – ці можна лічыць пераход ад здабыўчай стратэгіі да вытворчай прагрэсам? І нават калі гэта ўсё-ткі пераход да лепшага, ці не з'яўляюцца выдаткі ад яго большымі за выгоды?

Паглядзіце, напрыклад: паляўнічыя і збіральнікі вялі качавы лад жыцця, а мы сёння толькі марым, каб падчас адпачынку куды-небудзь з'ездзіць. А іх заняткі – рыбалоўства і збіральніцтва (грыбоў, ягад) ці не з'яўляюцца ўлюбёнымі ў сённяшніх гараджан-беларусаў? Яны жылі ў экалагічна чыстым асяроддзі, харчаваліся экалагічна чыстай ежай, балансам карысных рэчываў у якой мы можам толькі пазайздросціць. Яны не ведалі большасці хваробаў, ад якіх сёння паміраюць людзі. Яны мелі больш вольнага часу, і кожны з іх быў творцам, а не пасіўным спажыўцом мастацтва. І, самае галоўнае, яны не пакутавалі ад атруты зайздрасці – непазбежнага спадарожніка сацыяльнай няроўнасці – і не гінулі мільёнамі ў бессэнсоўных войнах толькі дзеля таго, каб задаволіць капрызы нейкай, звычайна пакрыўджанай прыродай, асобы, апантанай прэтэнзіяй на кіраванне светам. Так, яны не ведалі дасягненняў сучаснай цывілізацыі, у іх не было найноўшых мадэляў смартфонаў, акаўнтаў у сацыяльных сетках, магчымасці за некалькі гадзін перанесціся на іншы кантынент і нават такіх элементарных рэчаў, як водаправод і каналізацыя. І што – маючы гэта, мы сталі больш шчаслівымі? Хіба ўсё гэтае ўвасабленне прагрэсу вартае тысячагоддзяў стаўлення адных людзей да другіх як да быдла ці ўшчэнт знявечанай экалогіі планеты? Гэтыя пафасныя пытанні ставяцца тут не дзеля таго, каб заклікаць вярнуцца назад. Няма большага глупства ў свеце, чым

паверыць, што гэта магчыма. Можа быць, найбольшыя злачынствы на свеце якраз і былі зробленыя дзеля марнай надзеі вярнуцца ў тое шчаслівае дзяцінства чалавецтва.

Праблема не ў гэтым. Вывучэнне ступеняў тэхналагічнага развіцця чалавецтва сведчыць пра тое, што пераход ад адной ступені да другой заўсёды прыводзіў да кардынальных зменаў у ладзе жыцця. Самым радыкальным пераходам была неалітычная рэвалюцыя, і выглядае так, што не менш радыкальным, а хутчэй за ўсё нават больш, будзе той, які пачынаецца цяпер, на нашых вачах. Паслядоўнае развіццё тэхналогій, заснаваных на штучным інтэлекце і робататэхніцы, створыць прынцыпова новую стратэгію жыццезабеспячэння, для якой чалавек, як вытворца сродкаў здавальнення падставовых патрэбаў, будзе непатрэбны. Апошнім часам з'яўляюцца публікацыі пра тое, што ўсё гэта стварае перадумовы для здзяйснення мараў стваральнікаў камуністычнай ідэалогіі. І пішуць гэта людзі, якіх цяжка падазраваць у наіўнасці ці непрафесійнасці. Але ў аўтара гэтых радкоў чамусьці няма да гэтага веры. З той простай прычыны, што кожная новая тэхналагічная рэвалюцыя прыводзіла да ўзмацнення сацыяльнай няроўнасці: не толькі ў тым асобным грамадстве, дзе яна адбылася, але і ў маштабах усяго чалавецтва: у форме падзелу на людзей цывілізаваных і не вельмі, а таксама розных варвараў і дзікуноў. Уся гісторыя антрапалагічнага назірання над логікай «тэхналагічнага прагрэсу» чалавецтва сведчыць, што і ў гэтым выпадку цяжка будзе чакаць чаго-небудзь іншага.

## Падсумаванне

На працягу свайго існавання чалавецтва стварыла пяць асноўных спосабаў задавальнення падставовых патрэбаў існавання – перадусім, здабывання ежы. Кожны з іх уплываў на сістэму сацыяльных адносінаў, формы сацыяльных інстытутаў і ў цэлым на лад жыцця людзей. Кожны пераход ад адной да другой сістэмы выклікаў кардынальныя змены ў існаванні чалавецтва. Наколькі гэта вядома нам сёння, найбольш істотныя перамены ў жыцці людзей выклікала неалітычная рэвалюцыя – пераход да вытворчых стратэгій жыццезабеспячэння.

# Раздзел 5.
# Геаграфія традыцыйных формаў эканамічнай актыўнасці чалавецтва

*Прыродныя рэсурсы. Гістарычныя формы кантролю рэсурсаў. Вытворчасць. Культурныя і прыродныя фактары спецыфікі вытворчай дзейнасці. Формы арганізацыі вытворчасці.*
*А. Чаянаў і яго канцэпцыя функцыянавання сялянскай гаспадаркі.*
*Падзел працы. Полава-ўзроставы і спецыялізаваны падзел працы.*
*Размеркаванне. Абмен і яго гістарычныя тыпы.*
*Пераразмеркаванне. «Біг мэн», «потлач», дабрачыннасць.*

***Кантроль рэсурсаў***

Кожная стратэгія жыццезабеспячэння пабудаваная на эксплуатацыі прыродных рэсурсаў. Пад імі разумеюцца геаграфічная прастора, карысныя выкапні, глебавае покрыва, водныя крыніцы, жывёльны і раслінны свет – іншымі словамі, усё, што можа быць выкарыстана ў межах пэўнай стратэгіі. Адпаведна, у кожнай з іх існуюць пэўныя правілы, больш ці менш фармалізаваныя і жорсткія, адносна таго, якія рэсурсы і якім чынам могуць быць выкарыстаныя. Спосаб выкарыстання рэсурсаў шмат у чым залежыць ад таго, хто прымае рашэнні аб іх выкарыстанні, а дакладней – хто іх уласнік.

На працягу чалавечай гісторыі формы і аб’екты ўласнасці істотна мяняліся. Для земляробаў галоўную каштоўнасць уяўляла сабой зямля, прыдатная да апрацоўкі, для пастаралістаў – статкі жывёлы, а ў індустрыяльную эпоху найбольш каштоўнымі становяцца карысныя выкапні, патрэбу ў якіх раней немагчыма было сабе нават уявіць. Істотна змяняліся і суб’екты ўласнасці на рэсурсы.

У грамадствах паляўнічых і збіральнікаў асноўным прыродным рэсурсам была ўся геаграфічная прастора і, у першую чаргу, жывёлы і расліны, якія з'яўляліся харчовымі рэсурсамі. З пункту погляду сённяшніх уяўленняў аб кантролі рэсурсаў, ніякай уласнасці – у індывідуальнай ці ў калектыўнай форме – у іх фактычна не існавала. Надзвычай нізкая шчыльнасць насельніцтва і качавы лад жыцця рабілі проста немагчымым як-небудзь эфектыўна кантраляваць прастору. Тым не менш грамады паляўнічых і збіральнікаў усё-ткі мелі пэўныя ўяўленні аб межах паляўнічых тэрыторый і імкнуліся іх не парушаць. Хоць, разам з тым, у народа канг у Калахары, напрыклад, дазвалялася заганяць жывёлу са «сваёй» тэрыторыі на прасторы суседзяў.



*Людзі канг выбіраюцца на паляванне*

Нярэдка адносіны да пэўнай прасторы асэнсоўваліся не ў катэгорыях уласнасці, а ў паняццях сакральнага абавязку. Сярод аўстралійскага племені пінтубі сваёй лічылася прастора, на якой спрадвеку выконваліся пэўныя рэлігійныя цырымоніі. Яны разглядаліся як абавязак чалавека ў дачыненні да пэўнай часткі прыроды. Чым больш насычанымі былі рэсурсы, тым большая ўвага надавалася іх кантролю. Прыклад гэтаму – сітуацыя на поўночна-заходнім узбярэжжы Паўночнай Амерыкі, надзвычай багатым рыбнымі рэсурсамі. Тут індзейскія плямёны рыбаловаў, якія перайшлі да аселага ладу жыцця, наладзілі дастаткова выразны кантроль сваёй прыроднай прасторы.

У пастаралістаў, чый качавы лад жыцця нагадваў паляўнічых і збіральнікаў, дакладных уяўленняў аб уласнасці на пэўную прастору не існавала. Яны маглі ўзнікаць адносна надзвычай багатых пашаў і, што яшчэ часцей, адносна крыніцаў вады. У кожным выпадку існавалі ўяўленні аб маршрутах качэўя асобных групаў – так, каб не перашкаджаць іншым. Спецыфічныя сітуацыі ўзнікалі на тэрыторыях непасрэднага кантакту пастаралістаў і сялян-земляробаў.

Праблема ў тым, што сярод земляробаў, як ручных, так і плужных, усталяваліся больш дакладныя і жорсткія ўяўленні аб

уласнасці і на зямлю, і, там, дзе гэта было істотна, на крыніцы вады. Сярод хорцікультуралістаў зямля звычайна была ва ўласнасці вясковай грамады-абшчыны. Асобныя сем'і апрацоўвалі пэўныя кавалкі зямлі, але магчымасць распараджацца ёю амаль адсутнічала. У эпоху старажытнарымскай цывілізацыі ў галіне агракультуры ўзнікла паняцце аб прыватнай уласнасці, у тым ліку на зямлю. Яно азначала магчымасць прадаваць, дзяліць часткі, перадаваць у спадчыну і г. д. Аднак шмат дзе ва Усходняй Еўропе і Беларусі абшчынная ўласнасць на зямлю захоўвалася і ва ўмовах панавання ворыўнай апрацоўкі зямлі.



*Ручныя земляробы часта вылучаюцца ваяўнічасцю. Народ янамама, Паўднёвая Амерыка*

У часы індустрыяльнага грамадства права прыватнай уласнасці робіцца не толькі дамінантным, але і пашыраецца на рэсурсы, якія раней каштоўнымі не лічыліся ці пра якія проста не ведалі. Гэта ў першую чаргу датычыцца выкапнёвых паліўных рэсурсаў, кошт якіх значна перавысіў кошт земляробчых плошчаў. Але найбольшую каштоўнасць набылі прасторы не з нейкімі ўнікальнымі прыроднымі якасцямі, а тыя, што звязаны з падвышанай канцэнтрацыяй насельніцтва – тэрыторыі сучасных гарадскіх агламерацый.

### *Вытворчасць*

Прыродныя рэсурсы ў вельмі рэдкіх выпадках могуць быць выкарыстаныя чалавекам у той форме, у якой яны сустракаюцца ў прыродзе. Працэс трансфармацыі прыродных аб'ектаў у патрэбныя чалавеку рэчы называецца вытворчасцю. На яе характар уплываюць наяўнасць той ці іншай стратэгіі жыццезабеспячэння, прысутнасць неабходных прыродных рэсурсаў, а таксама пэўныя

культурныя традыцыі. У першую чаргу гэта тычыцца ўстойлівых традыцый харчавання. Напрыклад, шмат якія пастаралісцкія народы могуць жыць у асяроддзі з вялікімі рыбнымі рэсурсамі, але звычайна яны не харчуюцца рыбай. З іншага боку, яны могуць гадаваць коней на мяса. Тое ж самае маглі б рабіць і беларусы, але яны не маюць такой традыцыі. Самі беларусы ў харчаванні аддаюць перавагу свініне, якая знаходзіцца пад забаронай спажывання сярод габрэяў і мусульманскіх народаў.

У сучаснай індустрыялізаванай стратэгіі жыццезабеспячэння вытворчасцю займаюцца спецыялізаваныя прадпрыемствы. Аднак на працягу большай часткі гісторыі чалавецтва базавай адзінкай вытворчасці была хатняя гаспадарка, якая часцей за ўсё была аўтаномная – натуральная і самадастатковая. Па сваім эканамічным і сацыяльным сэнсе яна прынцыпова адрознівалася ад сучасных прадпрыемстваў, мэта якіх – дасягненне прыбытку. Мэта ж хатняй гаспадаркі – забеспячэнне ўсіх, хто ў яе ўваходзіць, харчаваннем і іншымі сродкамі жыццезабеспячэння.

У 1920-х гг. вядомы расійскі даследчык Аляксандр Чаянаў падрабязна даследаваў мадэлі функцыянавання хатняй сялянскай гаспадаркі. Ён прыйшоў да высновы, што існуе норма самаэксплуатацыі, якая вызначаецца суадносінамі колькасці працаўнікоў у гаспадарцы і «едакоў» (тых, хто не працуе). Чым большай будзе колькасць другіх, тым больш будуць працаваць першыя, і наадварот. Калі прапорцыя будзе не на карысць працаўнікоў, гаспадарка можа запрашаць дадатковых работнікаў. Калі не хапае зямлі, каб усіх пракарміць, то неабходна арандаваць дадатковую. Калі ж баланс дасягнуты і ўсе сытыя, інтэнсіўнасць працы будзе зніжацца. Сялянская гаспадарка імкнецца дасягнуць сярэдняга ўзроўню дабрабыту,



*Аляксандр Чаянаў – стваральнік эканамічнай тэорыі сялянскай гаспадаркі*

каб адпавядаць традыцыям эгалітарызму, створаным яшчэ ў часы паляўнічых і збіральнікаў.

### *Падзел працы*

Істотную ролю ў вытворчасці заўсёды адыгрываў падзел працы. Першапачаткова ён меў полава-ўзроставы характар. У грамадствах паляўнічых і збіральнікаў ён выяўляўся ў тым, што паляваннем займаліся мужчыны, а збіральніцтвам – жанчыны. Разам з тым ёсць шмат фактаў, якія сведчаць, што гэтае правіла магло і парушацца. Напрыклад, у плямёнаў аэта на Філіпінах жанчыны займаюцца паляваннем нароўні з мужчынамі. Другі аспект падзелу працы – узроставы, які азначае, што ў вытворчасці не прымаюць удзел пэўныя ўзроставыя групы: дзеці і людзі сталага веку. Характэрнай асаблівасцю грамадстваў з такім падзелам працы была адсутнасць прафесійнай спецыялізацыі. Гэта значыць, што ўсе мужчыны без вынятку станавіліся выключна паляўнічымі, а жанчыны – збіральніцамі.



*Ручная апрацоўка зямлі – амаль заўсёды жаночы занятак*



*А ганчарства – мужчынскі*

На змену выключнаму панаванню полава-ўзроставага

падзелу працы паступова прыходзіў працоўны, або прафесійны, падзел. Пачатак яму быў пакладзены ў асноўным у перыяд усталявання агракультурнай стратэгіі, калі ўзніклі больш-менш вялікія групы людзей, не занятых у вытворчасці харчавання, – рамеснікі, гандляры, ваяры, святары, чыноўнікі. А ў эпоху індустрыялізаванай стратэгіі пад яго падпадаюць ужо практычна ўсе, хто заняты ў вытворчасці. Чым больш дэталізаваным будзе падзел працы, тым больш кваліфікаваным у сваёй сферы будзе работнік, і, адпаведна, лепшай будзе якасць вытворчасці. Разам з тым, і пры гэтай форме, нават у самых тэхналагічна развітых грамадствах, захоўваюцца ўяўленні аб гендарна прымальных формах працоўнай актыўнасці. Яны часта залежаць ад традыцыйных уяўленняў аб прымальнасці. Напрыклад, у Еўропе, у тым ліку і ў Беларусі, швейная прамысловасць лічыцца «жаночай» формай занятасці. А ва Усходняй і Паўднёва-Усходняй Азіі такіх уяўленняў няма. Разам з тым, ва ўсім свеце сёння цяжка ўявіць сябе мужчыну на пасадзе выхавацеля ў дзіцячым садку ці сакратара пры кіраўніку бізнес-кампаніі.

***Размеркаванне***

Пасля таго, як прыродныя рэсурсы пераўтвараюцца ў рэчы, прыдатныя для спажывання чалавекам, пачынаецца працэс іх размеркавання. Чым тэхналагічна складанейшым з'яўляецца грамадства, тым складанейшым робіцца гэты працэс. Вылучаюцца тры асноўныя яго формы: абмен, пераразмеркаванне і рынкавы абмен.

Абмен – найбольш старажытная форма размеркавання, якая ўключае ў сябе абмен рэчамі ці паслугамі ў прыкладна роўным памеры, без выкарыстання грошай. Такую форму пераразмеркавання яшчэ называюць запазычаным словам «рэцыпрокнасць», і, адпаведна, гаворка можа ісці пра «рэцыпрокныя адносіны». Антраполагі вылучаюць тры формы абмену: просты, збалансаваны і негатыўны. Просты абмен узнікае ў тых выпадках, калі бакі працэсу маюць вялікую ступень даверу адзін да аднаго. У дадзеным выпадку дарэнне чаго-небудзь не азначае абвязку тэрміновага дарэння ў адказ. Да простага абмену адносяць дачыненні паміж генерацыямі (пакаленнямі) у сямейнай групе. Прыкладам простага абмену можа

быць традыцыйны звычай беларусаў – бонда, калі суседзям дарылі невялікую частку сабранага мёду, мяса, калі рэзалі парсюка, і г. д., што прадугледжвала магчымасць, але не абавязковасць падобных учынкаў у вызначаны час.

Збалансаваны абмен, у адрозненне ад простага, прадугледжваў пэўныя дакладныя правілы яго ажыццяўлення. Вызначаліся памеры ўзаемных падарункаў, тэрміны прыняцця падарункаў у адказ (калі гэта не рабілася адначасова). Да такой формы абмену можна аднесці талаку, характэрную для традыцыйных адносінаў беларусаў і шмат якіх іншых народаў Усходняй Еўропы. На талаку запрашалі суседзяў і сваякоў, калі была патрэба тэрмінова зрабіць справу, якая патрабавала адначасова вялікай колькасці працоўных рук: напрыклад, пабудаваць новы дом ці сабраць ураджай. Гаспадар, які запрашаў на талаку, быў абавязаны добра пачаставаць удзельнікаў пасля заканчэння работы. Акрамя гэтага, ён быў гатовы ў любы момант, калі яго запросяць, прыняць удзел у талацэ ў адказ.

Шырока вядомы ў антрапалогіі прыклад збалансаванага абмену ў Меланезіі пад назвай «кула-рынг». Гэта рытуальны абмен пацеркамі і бранзалетамі, зробленымі з каштоўных ракавінак, сярод жыхароў Трабарыяндскіх выспаў. Самі па сабе пацеркі і бранзалеты не маглі стаць уласнасцю каго-небудзь. Яны былі сімваламі даверу пры ажыццяўленні рэчамі практычнага прызначэння. Жыхары кожнай выспы, якія ўваходзілі ў «кула-рынг», спецыялізаваліся на пэўным кшталце вытворчасці: адны лепей рабілі чаўны ці посуд, другія дасягалі дасканаласці ў гадоўлі свіней ці вырошчванні салодкай бульбы – ямсу.




*Карта распаўсюджвання «кула-рынг»*

Перыядычна на адной з выспаў адбываўся кірмаш. Але як вынайсці эквівалент чоўну ў свіннях? Ці гаршку? Грошай у трабарыяндцаў не было. Нават калі яны ёсць, набыццё чаго-небудзь каштоўнага выклікае псіхалагічнае напружанне і сёння. Заўсёды ўзнікае пытанне: ці не задорага набыў, ці не занадта танна прадаў? Рытуал «кула-рынг» здымаў псіхалагічнае напружанне. Галоўная ўвага надавалася не ямсу ці чоўнам, але пацеркам і кара́лям, а перадусім – апавяданням пра тое, якія цудоўныя людзі імі часова валодалі і хто будзе наступным іх захавальнікам.



*Човен, упрыгожаны ракавінкамі каўры для ўдзелу ў «кула-рынг»*

Своеасаблівым варыянтам збалансаванага абмену з’яўляецца так званы маўклівы, або дыстанцыйны, абмен. Ён адбываецца паміж народамі ці сацыяльнымі групамі, занятымі рознымі стратэгіямі жыццезабеспячэння. Напрыклад, семангі, жыхары Малайскага паўвострава, – паляўнічыя і збіральнікі. Неабходныя ім рэчы – такія, як прылады палявання ці соль, – яны атрымліваюць ад суседніх земляробчых народаў. Працэс адбываецца наступным чынам: у агульнавядомым, спецыяльна прызначаным месцы семангі пакідаюць свае «тавары» і вяртаюцца праз пэўны час, каб забраць тое, што з’явіцца ў адказ. Такім чынам яны пазбягаюць таго ж самага псіхалагічнага напружання, якое ўзнікае ў працэсе абмену.

Даволі часта ў сітуацыі рэцыпрокных адносінаў паміж народамі розных стратэгій жыццезабеспячэння ўзнікае сітуацыя негатыўнага ці неэквівалентнага абмену. Тыповым бывае тое, што ў такіх выпадках тэхналагічна больш развіты народ атрымлівае перавагу. Адзін з класічных прыкладаў – мбуці, паляўнічыя і збіральнікі з экватарыяльнай Афрыкі. Мбуці – адзін з нешматлікіх народаў свету, які

не ўмеў самастойна здабываць агонь. Яго (вугельчыкі ў гаршках) яны атрымлівалі ад суседзяў-земляробаў у абмен на прадукты, на здабыццё якіх патрабавалася шмат часу (мёд, мяса казулі і г. д.). Трэба адзначыць, што падобная сітуацыя характэрная не толькі для абмену, але і для гандлёвых аперацый на працягу ўсёй гісторыі чалавечай цывілізацыі: тэхналагічная адсталасць дорага каштуе яе носьбітам.

Пераразмеркаванне – гэта такі варыянт абмену, пры якім тавары або паслугі, якія знаходзяцца ў распараджэнні якой-небудзь асобы ці групы, размяркоўваюць паміж больш шырокай групай у адпаведнасці з пэўнымі прынятымі нормамі і правіламі. Тыповы прыклад пераразмеркавання – гэта падаткаабкладанне, без якога не можа існаваць дзяржава.

Разам з тым, вядомыя выпадкі, калі пераразмеркаванне можа існаваць і без дзяржаўнай улады.




*Карта народаў паўночна-заходняга ўзбярэжжы Паўночнай Амерыкі*

Сярод іх «потлач» – звычай, шырока распаўсюджаны сярод індзейскіх плямёнаў паўночна-заходняга ўзбярэжжа Паўночнай Амерыкі, а найперш сярод народа квакіютль. Гэтая цырымонія праводзілася з нагоды вяселля, нараджэння, пахавання ці проста дзеля пацвярджэння статуса правадыра або іншай уплывовай асобы. Падчас яе гаспадар рабіў падарункі сваім сваякам, чальцам клана ці супляменнікам. Чым большымі былі памеры падарункаў, тым большай павагай ён карыстаўся. Часцей за ўсё раздаваліся стрэльбы і коўдры, якія лічыліся прыкметай заможнасці. У некаторых выпадках колькасць падарункаў дасягала тысяч. З нагоды надзвычай істотных падзей арганізатар потлачу быў павінен увогуле раздаць усю сваю маёмасць. Аднак найбольш паважаным лічыўся нават не той, хто раздаваў уласнасць, а той, хто яе дэманстратыўна

знішчаў. На думку навукоўцаў, потлач узнік ва ўмовах хуткага маёмаснага расслаення ў другой палове XIX стагоддзя, якое ўступала ў канфлікт з пануючай эгалітарысцкай мараллю. Згодна з ёю ў грамадстве павінна панаваць роўнасць, і таму дэманстрацыя абыякавасці да багацця выклікала павагу. Разам з тым, у шэрагу выпадкаў атрыманне падарунка падчас потлачу азначала і абавязак прынесці падарункі ў адказ падчас наступнай цырымоніі. Мэта гэтага палягала не ў тым, каб зрабіць арганізатара потлачу яшчэ багацейшым, а ў тым, каб зрабіць сам кланавы (племянны) потлач большым, чым у суседзяў.



*Потлач у сучаснай Канадзе*

Іншы варыянт дадзяржаўнага пераразмеркавання сустракаўся ў Меланезіі і Новай Гвінеі. Навукоўцы назвалі яго «біг мэн» (вялікі мужчына). У большасці выпадкаў гэта сапраўды быў фізічна моцны мужчына, які выконваў функцыю нефармальнага лідара вясковай супольнасці. Ён нікому і нічога не мог загадаць, але да яго парадаў прыслухоўваліся, і ён карыстаўся аўтарытэтам. Апошняе дасягалася не фізічнымі ці разумовымі здольнасцямі, але перадусім арганізацыяй сумесных бясед-застолляў.



*«Біг мэн»*

Пры гэтым найбольшы ўклад у застолле рабіў сам «біг мэн». Дзеля гэтага ён звычайна меў некалькі жонак – бо гадаваннем свіней займаліся

менавіта жанчыны. Разлік тут просты: больш жонак, больш свіней, больш супляменнікаў можна пачаставаць, а значыць, большую павагу і прэстыж можна мець у грамадстве. Гэткая з'ява яшчэ мае назву «прэстыжная эканоміка». Дарэчы, сустракаецца яна і ў сённяшніх тэхналагічна высокаразвітых грамадствах.

Да сучасных формаў пераразмеркавання трэба аднесці дабрачыннасць. Вядома, дабрачыннасць не ўзведзена ў абавязковае правіла, але даволі часта людзі, якія дасягнулі надзвычайнага поспеху ў прадпрымальніцтве, значную частку сваіх прыбыткаў выдаткоўваюць на дапамогу бедным, адсталым краінам, на развіццё адукацыі і культуры. Адзін з найбольш тыповых прыкладаў – гісторыя Эндру Карнэгі. Ён нарадзіўся ў 1835 г. у беднай шатландскай сям'і. Калі Эндру было трынаццаць гадоў, бацькі вырашылі паспытаць шчасця ў Амерыцы і перасяліліся ў Пітсбург, у штат Пенсільванія (у гэтым горадзе аўтар гэтых радкоў правёў палову 1996-га года, і таму добра ведае гісторыю Карнэгі). Усім эмігрантам спачатку бывае вельмі няпроста, і Эндру пачаў сваю працоўную дзейнасць матальшчыкам на ткацкай фабрыцы. Пазней ён стаў тэлеграфістам, ашчаджаў грошы пры любым выпадку і з часам пачаў іх укладаць у бізнес. Спачатку гэта была вытворчасць спальных чыгуначных вагонаў, пазней – стальных мастоў і рэек, увогуле металургія.



*Прадпрымальнік і філантроп Эндру Карнэгі*

Ва ўзросце 65 гадоў Карнэгі прадаў свой бізнес за 480 млн долараў (памножце на 10, каб зразумець, колькі б гэта было сёння) і заняўся дабрачыннасцю. Было заснавана некалькі фондаў, якія дзейнічаюць і па сённяшні дзень; пабудаваны славуты Карнэгі-хол – першая ў ЗША канцэртная зала, у якой мог выступаць вялікі сімфанічны аркестр; вялізны мастацкі музей ды ўніверсітэт у Пітсбургу і, што

самае галоўнае, 2500 (так, дзве з паловай тысячы) бібліятэк, вялікіх і малых, на кожнай з якіх ёсць гранітная пліта над уваходам з надпісам: «Дар Эндру Карнэгі. Уваход вольны». І гэта зрабіў чалавек, які закончыў толькі пяць класаў звычайнай школы!

## Падсумаванне

На працягу гісторыі чалавецтва мяняліся ўяўленні аб тым, што можа быць каштоўным рэсурсам і як яго можна кантраляваць. Чым больш тэхналагічна складаным становіцца грамадства, тым больш жорсткімі робяцца і формы кантролю.

Большую частку чалавечай гісторыі асноўнаю адзінкай вытворчасці была сямейная гаспадарка. Яна мела пераважна натуральны характар: вырабляла ўсё ці большасць з таго, што было патрэбна для жыцця чалавека.

Самая старажытная форма падзелу працы – падзел паводле ўзроставых і гендарных прыкметаў. Нягледзячы на тое, што ў сучасным грамадстве пануе спецыялізаваны падзел працы, у ім па-ранейшаму захоўваюцца асаблівасці мужчынскай і жаночай занятасці.

Тыповымі формамі размеркавання і пераразмеркавання ў сучасным грамадстве з’яўляецца гандаль і збор падаткаў. Разам з тым, здаўна гэтыя функцыі выконвалі разнастайныя формы абмену, дарэнне і г. д.

# Раздзел 6.
# Геаграфія і эвалюцыя
# формаў сацыяльнай стратыфікацыі

*Крытэрыі вымярэння сацыяльнай няроўнасці.*
*Гістарычныя формы сацыяльнай стратыфікацыі.*
*Эгалітарныя грамадствы.*
*Рангавыя грамадствы.*
*Стратыфікаваныя грамадствы. Каставыя сістэмы.*
*Класавыя грамадства.*
*Гендарная стратыфікацыя.*

Кожнае грамадства, незалежна ад узроўню яго тэхналагічнага развіцця, непазбежна сутыкаецца з праблемай адрозненняў між людзьмі. Гэтыя адрозненні могуць мець натуральны характар: адзін можа быць старэйшым, другі маладзейшым, яшчэ нехта – прыгажэйшым, спрытнейшым, разумнейшым. Розныя катэгорыі адрозненняў атрымлівалі розную ступень павагі ў грамадстве, інакш кажучы – мелі розную прэстыжнасць. У іх лік уваходзяць і ўжо вядомыя адрозненні паводле моўных і расавых прыкметаў. З эпохі ўтварэння старажытных цывілізацый дадаліся адрозненні ў доступе да ключавых каштоўнасцяў: улады, багацця і прэстыжу. Той, хто меў уладу, звычайна быў і самым заможным, і, адпаведна, самым паважаным. Чым больш тэхналагічна развітым робіцца цывілізаванае грамадства, тым больш павялічваецца бездань паміж заможнымі і жабракамі. У сённяшнім свеце больш за ⅔ жыхароў планеты (71%) мае ўсяго 3% багацця, а 8% заможных – 84%. Пры гэтым самыя заможныя – так званыя доларавыя мільянеры (гэта ўсяго 0,7% жыхароў планеты) – кантралююць 45,2% сусветнага багацця. Але ў гісторыі грамадства так было далёка не заўсёды. Больш за тое, самую вялікую частку свайго існавання адрозненні паміж людзьмі былі зусім іншымі.

У культурнай антрапалогіі і геаграфіі вылучаюцца тры тыпы формаў сацыяльнай няроўнасці: эгалітарныя грамадствы, рангавыя грамадствы і стратыфікаваныя грамадствы.

### *Эгалітарныя грамадствы*

Эгалітарныя грамадства – гэта часцей за ўсё грамадствы, заснаваныя на тэхналогіі палявання і збіральніцтва. Для іх характэрная адсутнасць сацыяльнай дыферэнцыяцыі па доступе да ўлады і багацця і адносна невялікія адрозненні паводле прэстыжу. Роўнасць у доступе да ўлады тлумачыцца тым, што ў паляўнічых і збіральнікаў не было персанальных уладных пазіцый (правадыроў, князёў, прэзідэнтаў і г. д.). Роўнасць у маёмасных адносінах была звязаная з адсутнасцю як самога багацця, так і магчымасці яго назапашваць. Гэтыя народы вялі качавы лад жыцця, а на сабе шмат несці проста было немагчыма. Адрозненні паводле прэстыжу выяўляліся ў паважлівым стаўленні да людзей сталага ўзросту. Пры гэтым усе пажылыя людзі карысталіся роўнай павагай, незалежна ад сваіх асабістых якасцяў: адрозненні паміж звычайнымі пенсіянерамі і пенсіянерамі «рэспубліканскага» ці «саюзнага» значэння, як гэта было ў СССР, які таксама на словах дэкляраваў эгалітарыстскую мараль, адсутнічалі.

Безумоўна, як і ў любым іншым грамадстве, паляўнічыя і збіральнікі не былі аднолькавымі, але натуральныя адрозненні нельга было трансфармаваць ва ўладу ці багацце. А вось у сённяшні час добрыя спартсмены ці мадэлі з індустрыі моды могуць дзякуючы



*Размеркаванне мяса, здабытага пасля палявання, у народа баяка, Цэнтральная Афрыка*



*Танцавальны фестываль у аўстралійскіх абарыгенаў*

сваім прыродным якасцям стаць заможнымі людзьмі, а пры жаданні і атрымаць палітычную ўладу. Эгалітарныя ж грамадствы арыентаваны на падкрэсліванне і замацаванне сваёй эгалітарнасці. Тыповая сітуацыя – «танцавальныя фестывалі» ў аўстралійскіх абарыгенаў.

Еўрапейцаў заўсёды здзіўляе, якім чынам там вызначалі найлепшых танцораў: пад увагу не браліся ні артыстычнасць, ні працягласць танца. Прынцып зусім іншы: усе, хто ўдзельнічаў, – найлепшыя.

### *Рангавыя грамадствы*

Рангавыя грамадствы – параўнальна рэдкая з’ява. У іх існавалі пэўныя адрозненні ў магчымасцях доступу да палітычнай улады і багацця, але найбольшае значэнне надавалася не ім, а адрозненням паводле прэстыжу, не звязаным з узроставымі катэгорыямі. Такімі былі плямёны паўночна-заходняга ўзбярэжжа Паўночнай Амерыкі, ужо знаёмыя нам з цырымоніі «потлач». Прэстыж у іх размяркоўваўся паводле прынцыпу сваяцкай блізкасці да асобы правадыра. Ён адрозніваўся ад супляменнікаў памерамі сваёй маёмасці, але значную яе частку рэгулярна раздаваў, каб пацвердзіць свой сацыяльны статус.



*Дэкор адзення ў народа хайда адлюстроўваў прыналежнасць да пэўнага рангу*

Градацыі прэстыжу выяўляліся з дапамогаю тытулаў, што перадаваліся ў спадчыну, а таксама мелі візуальнае выяўленне: розным катэгорыям дазвалялася насіць рознае адзенне, якое адлюстроўвала іх прыналежнасць да пэўнага рангу. Чым ранг быў прэстыжнейшы, тым большую колькасць упрыгожанняў з воўчых зубоў ці ракавінак можа было нашыць на адзенне. Да гэтага дадавалася і сістэма «прэстыжных» імёнаў, якія мелі прадстаўнікі спадчыннай эліты.

***Стратыфікаваныя грамадствы***

Неалітычная рэвалюцыя заклала падмурак падзелу грамадства паводле доступу адначасова і да ўлады, і да багацця, і да прэстыжу. Канчаткова ён замацаваўся на тэхналагічным узроўні ворыўнай апрацоўкі зямлі індустрыяльнага ды і постіндустрыяльнага грамадстваў. Іх у сукупнасці адносяць да стратыфікаваных грамадстваў. Але, разам з тым, канкрэтныя праявы і формы такой стратыфікацыі адрозніваюцца вельмі істотна.

***Каставыя грамадствы***

Па-першае, традыцыйна вылучаюць так званыя «каставыя» грамадствы, тыповыя для даіндустрыяльнай ступені развіцця. Для каставых грамадстваў характэрная найбольшая з усіх вядомых замкнёнасць сацыяльных групаў: сацыяльныя адрозненні наўмысна падкрэсліваюцца і культывуюцца. Яны выяўляюцца ва ўсім – ладзе жыцця, імёнах, адзенні і нават фізічным выглядзе.

Звычайна ў каставых грамадствах вылучаюцца наступныя групы: вытворцы ежы (сяляне), якія складаюць да 80–90% насельніцтва; тыя, хто прафесійна бароніць іх ад знешніх ворагаў (ваяры), і тыя, хто на прафесійнай аснове забяспечвае сувязь грамадства са звышнатуральным светам (святары). Пры гэтым палітычная ўлада належыць прадстаўнікам дзвюх апошніх групаў – часцей за ўсё адной асобнай сям'і – і перадаецца ў спадчыну. Каста святароў, якім належала ўлада ў грамадстве мая, падкрэслівала сваю выключнасць спецыяльным адзеннем, якое маглі насіць толькі яны; формай вушэй (іх выцягвалі так, каб яны краналіся плячэй); формай галавы (іх

дзецям адмысловымі прыладамі мянялі форму чэрапа, пакуль яго косткі былі яшчэ мяккія) і нават зубамі, у якіх рабілі інкрустацыю з нефрыту (!).

Часта, каб вызначыць сваё вяршэнства над сялянамі, уладныя касты стваралі адмысловыя ідэалогіі. Так, сярод шляхты Рэчы Паспалітай у XVII ст. замацавалася ўсведамленне свайго паходжання ад старажытных ваяўнічых сарматаў. З гэтым быў звязаны і своеасаблівы тып адзення «ўсходняга» тыпу, асабліва – паясоў (адсюль, дарэчы, і феномен слуцкіх паясоў). Усё гэта было неабходна, каб падкрэсліць свае вяршэнства над сялянамі.




*Каставая сістэма ў Індыі*

Ідэалагічнае абгрунтаванне мела і класічная каставая сістэма ў традыцыйнай Індыі. Лічылася, што найбуйнейшыя групы кастаў (варны) былі створаныя вярхоўным богам Брахмам з частак ягонага цела. Брахманы (святары, мысляры) былі зроблены з вуснаў, кшатрыі (ваяры) – з рук, вайш'і (гандляры, рамеснікі, сяляне) – са сцёгнаў, шудры (прыслуга) – са ступакоў.

Прадстаўнікі трох вышэйшых кастаў яшчэ лічыліся двойчы народжанымі. Дзеля гэтага яны праходзілі спецыяльны абрад *упанаяна* (другое нараджэнне), да якога шудраў не дапускалі. Па-за межамі чатырох варнаў знаходзіліся так званыя недатыкальныя – касты рабоў, якія выконвалі самую непрэстыжную працу.



*Недатыкальныя ў сучаснай Індыі*

Характэрнай з’явай каставага грамадства было тое, што мова пісьмовасці вельмі часта адрознівалася ад гутарковай мовы большасці насельніцтва. Пісьменнасць увогуле была прывілеем вышэйшых кастаў (пры гэтым далёка не ўсе і іх прадстаўнікі былі пісьменнымі) і тое, што яна была зразумелая выбраным, толькі падкрэслівала іх выключнасць.



*Самурай і сяляне, кадр з фільма Акіра Курасавы «Сем самураяў»*

Агульнай рысай усіх каставых грамадстваў была адсутнасць таго, што сучасная сацыялогія называе вертыкальнай сацыяльнай мабільнасцю – магчымасці змяніць свой прыроджаны сацыяльны статус (прыналежнасць да пэўнай касты) на працягу жыцця. У рэальнасці гэта значыла, што народжаны ў сям’і святара ці ваяра мог быць упэўнены, што не толькі ён / яна, але і іх нашчадкі нязменна будуць мець той самы прывілеяваны статус, а ўсе, народжаныя ў сям’і селяніна ці раба, заўсёды застануцца на ніжэйшай прыступцы сацыяльнай лесвіцы.

***Класавыя грамадствы***

Менавіта наяўнасць вертыкальнай сацыяльнай мабільнасці прынцыпова адрознівае класавае грамадства, заснаванае на індустрыяльнай стратэгіі жыццезабеспячэння, ад каставага. Гэта грамадства, у якім кожны становіцца «кавалём» свайго шчасця і – у роўнай ступені – няшчасця. Інакш кажучы, кожны жабрак можа стаць мільянерам, а мільянер – жабраком. Пры гэтым абодва варыянты жыццёвай стратэгіі з’яўляюцца толькі магчымасцю, а не правілам.

Грамадства падзяляецца на класы, і гэты падзел таксама мае іерархічны характар. У тым ліку вылучаюцца вышэйшы клас – буйныя прадпрымальнікі і палітыкі; сярэдні клас, да яко-

га адносяцца прадпрымальнікі сярэдняга і дробнага ўзроўню, высокакваліфікаваныя спецыялісты (юрысты, дактары, навукоўцы і прафесары), чыноўнікі, настаўнікі і г. д; рабочы клас: занятыя ў індустрыі, будаўніцтве, сферы паслуг (гандлі, транспарце і г. д.) і ніжэйшы клас – беспрацоўныя, імігранты. Усе яны адрозніваюцца ступенню доступу да ўлады, багацця і прэстыжу. Пры гэтым іх суадносіны іншыя ў параўнанні з каставым грамадствам. Палітыкі, напрыклад, карыстаюцца павагай і кантралююць уладу, але гэта не дае ім аўтаматычна доступу да багацця. Больш за тое, у шэрагу развітых краін Захаду заробак палітыка не перавышае даходы прадстаўніка сярэдняга класа. Рабочыя часта маюць большы заробак, чым індывідуальныя прадпрымальнікі, якіх адносяць да сярэдняй класы. Але сацыяльны прэстыж рабочага аўтамабільнай вытворчасці будзе ніжэйшы за прэстыж, напрыклад, сантэхніка, які мае меншы і негарантаваны даход, але заняты ва ўласнай фірме і «працуе сам на сябе».

Маёмасныя адрозненні ў класавым грамадстве не толькі не робяцца меншымі – яны ўвесь час павялічваюцца. Аднак, у адрозненне ад каставага грамадства, ім і іх прыкметам надаецца меншая ўвага. Разгледзім такі прыклад. Калі б мы раптам трапілі ў Беларусь канца XVIII стагоддзя, нам было б няцяжка вызначыць, хто з’яўляецца самым заможным яе жыхаром таго часу. Вось яна, сталіца Караля Радзівіла «Пане Каханку» ў Нясвіжы, вось замак, вось радавы касцёл з залатымі скульптурамі апосталаў. І ўсё, што ён ні робіць, дэманструе яго багацце: ці гэта інсцэніроўка марскога бою ў нясвіжскіх азёрах, ці катанне летам на санях па засыпанай соллю дарозе, ці сустрэча каханкі з Англіі, шлях якой ад Рыгі да Нясвіжа асвятляюць паходнямі бясконцыя тысячы



*Караль Радзівіл «Пане Каханку»*

радзівілаўскіх прыгонных. Параўнаем яго з адным з самых заможных людзей сучаснасці Білам Гейтсам, адным з заснавальнікаў і ўладароў карпарацыі «Майкрасофт». Дзе яго нясвіжскі палац, апосталы і г. д.? Безумоўна, у класавым грамадстве хапае сродкаў для дэманстрацыі багацця – прэстыжнага адзення, аўтамабіляў, жытла, але ўсё гэта часцей хаваюць ад чужога вока, чым адкрыта дэманструюць.



*Біл Гейтс*

Класы, у параўнанні з кастамі, значна больш адкрытыя ў сацыяльных адносінах. Разам з тым, і яны – асабліва вышэйшыя – маюць тэндэнцыю да захавання сваіх сацыяльных межаў. Іх прадстаўнікі звычайна жывуць у адных месцах, разам бавяць вольны час; яны аддаюць сваіх дзяцей на вучобу ў адны і тыя ж школы і ўніверсітэты. Характэрна, што нават у тых грамадствах, якія дэкларавалі сваёй мэтай сацыяльную роўнасць – напрыклад, у СССР – існавалі падобныя паводзіны. У савецкім Мінску 1970–1980-х гг. прадстаўнікі вышэйшага класа – супрацоўнікі апарату камуністычнай партыі, кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў – сяліліся ў квартале паміж вуліцамі Захарава і Пуліхава, каля парку імя Горкага. Шмат хто з іх меў магчымасць набываць дэфіцытныя тавары па



*Савецкая партнаменклатура.*
*З левага боку – Леанід Брэжнеў, 1966 г.*

нізкіх коштах у так званых «закрытых спецразмеркавальніках» – крамах для вышэйшага класа, сярод якіх былі шапкі з футра андатры. З прычыны іх падвышанай канцэнтрацыі ў квартале Захарава – Пуліхава мінчукі называлі яго «андатравы гарадок» ці «андатравае балота».

***Гендарная стратыфікацыя***

Акрамя стратыфікацыі, заснаванай на няроўным доступе да ўлады, багацця і прэстыжу, ва ўсіх грамадствах існуюць больш ці менш дакладна вызначаныя адрозненні ў становішчы мужчынаў і жанчын – іншымі словамі, гендарная стратыфікацыя. Пры гэтым тыповай з'яўляецца так званая гендарная асіметрыя, у якой жанчына займае падначаленае становішча. Яна характэрная для большасці стратэгій жыццезабеспячэння, адрозных ад палявання і збіральніцтва. Дамінаванне мужчынаў традыцыйна называюць патрыярхатам. Пры гэтым даволі шырока распаўсюджана думка, што ў далёкім мінулым яму папярэднічаў матрыярхат. Вымушаны расчараваць прыгожую палову чытачоў гэтых старонак: матрыярхат – гэта фантазія, уяўная рэканструкцыя ступені, формы развіцця чалавечага грамадства. Антрапалагічныя звесткі ніяк не пацвярджаюць яго існавання. У некаторых грамадствах, заснаваных на ручной апрацоўцы зямлі, жанчыны сапраўды мелі высокі сацыяльны статус дзякуючы традыцыі адліку сваяцтва па лініі маці («па кудзелі»). Яны маглі стаяць на чале гаспадарчага і сацыяльнага жыцця абшчыны – як, напрыклад, у паўночна-амерыканскіх індзейцаў іракезаў. Пра гэта гаворка пойдзе трошкі пазней. У асобных народаў заходняй экватарыяльнай Афрыкі па матчынай лініі перадавалася палітычная ўлада. Але нават і ў гэтых выпадках не існавала дамінавання жанчын над мужчынамі, якое можна было б параўнаць з адваротнай сітуацыяй.

У грамадствах паляўнічых і збіральнікаў статус жанчын быў не аднолькавы. У некаторых з іх жанчыны сапраўды нароўні з мужчынамі бралі ўдзел у сходах дарослых, дзе прымаліся важныя рашэнні жыцця абшчыны. Але былі і іншыя грамадствы, дзе рашэнні прымалі выключна мужчыны. У некаторых паляўнічых

і збіральнікаў – напрыклад, інуітаў – існавала мнагажэнства, што зноў-такі ставіла жанчын у прыніжанае становішча. Але ў цэлым на гэтым узроўні развіцця асіметрычнасць мужчынскіх і жаночых роляў у грамадстве была адной з найменшых у гісторыі. Навукоўцы заўважылі, што існуе непасрэдная сувязь паміж эканамічнаю роляй жанчыны і яе сацыяльным статусам. Там, дзе пераважала збіральніцтва і магчымасці палявання былі абмежаваныя – як у рэгіёнах экватарыяльных лясоў, – жанчыны забяспечвалі большую частку харчавання і іх сацыяльны статус быў вышэйшы. А ў інуітаў, дзе харчаванне ў асноўным здабывалася на паляванні ці праз рыбалоўства мужчынамі, вышэйшым было становішча мужчынаў.

У грамадствах хортыкультуралістаў жанчыны з’яўляюцца асноўнымі вытворцамі харчавання. Паводле падлікаў навукоўцаў, мужчынская праца пераважае толькі ў 17% такіх грамадстваў, жаночая – у 50%, яшчэ ў 33% эканамічныя ролі мужчынаў і жанчын прыкладна аднолькавыя. Аднак чыста аўтаматычна гэта не надае жанчынам высокага статусу. Ён залежыць яшчэ і ад сваяцтва. Калі ён ідзе па матчынай лініі, становішча жанчыны вышэйшае. Уплывае таксама і лакалізацыя шлюбу – традыцыя, згодна з якой маладая сям’я селіцца разам са сваякамі жонкі, сваякамі мужа ці ўвогуле асобна. У першым выпадку зноў-такі становішча жанчыны будзе вышэйшым. Часта традыцыя, якая абавязвае маладую сям’ю сяліцца са сваякамі жонкі, з’яўляецца наступствам мацярынскага ўліку сваяцтва.

Прыкладам такой сітуацыі з’яўляецца лад жыцця іракезаў – групы індзейскіх плямёнаў, якія жылі вакол возера Антарыа ў Паўночнай Амерыцы. Галоўную ролю ў іх гаспадарцы адыгрывала вырошчванне кукурузы, бабовых раслін і гарбузоў, якім займаліся выключна жанчыны. Мужчыны займаліся паляваннем і рыбалоўствам. У іхнія абавязкі ўваходзіла таксама вядзенне гандлю і войнаў. Асаблівасцю жыцця іракезаў было тое, што асноўнай сацыяльнай адзінкай была вялікая, колькасцю ў некалькі соцень чалавек, абшчына – *авачыра*, якая складалася са сваякоў па кудзелі. Пры гэтым уся абшчына жыла разам у адным будынку – так званым «доўгім доме». Гэта было нешта кшталту «інтэрнату сямей-

нага тыпу», у якім кожная сям'я мела асобны пакойчык. Даўжыня такіх дамоў складала дзясяткі і нават сотні метраў. Дзяўчынкі, якія нарадзіліся ў авачыры, праводзілі ў ёй усё сваё жыццё. А хлопчыкі пасля дасягнення паўналецця бралі шлюб з жанчынамі іншай авачыры і пераходзілі туды. На чале абшчыны стаяла аўтарытэтная жанчына сталага веку, якая кіравала гаспадарчымі работамі, што праводзіліся калектыўна. Пад яе кіраўніцтвам ствараліся калектыўныя запасы харчавання. Яна таксама займалася іх справядлівым размеркаваннем. У абавязкі старшыні авачыры ўваходзіў нагляд за паводзінамі чальцоў абшчыны. Асабліва пільна сачылі за «прымакамі», якіх яны сваякамі не лічылі. У рэдкіх выпадках іх увогуле маглі вярнуць назад у іхнюю матчыну абшчыну. Разам з тым, статус мужчынаў шмат у чым вызначаўся ўдзелам у войнах, якія іракезы перманентна вялі са сваімі суседзямі. Пытаннямі абароны займалася Рада правадыроў. Сяброўства ў Радзе перадавалася па жаночай лініі: старшыні авачыр прапаноўвалі сваіх сваякоў, якіх зацвярджала Рада. Яны таксама маглі прадухіліць абвяшчэнне вайны або заклікаць да тэрміновага ўсталявання міру. Трэба падкрэсліць, што прыклад іракезаў – толькі адна з магчымых мадэляў гендарнай стратыфікацыі ў межах стратэгіі жыццезабеспячэння хортыкультуралістаў і не з'яўляецца ўніверсальнай ступенню развіцця сацыяльных адрозненняў.

Сярод пастаралістаў гендарны баланс відавочна пачынае схіляцца на карысць мужчынаў. Пры гэтым эканамічныя ролі і мужчынаў, і жанчын маюць прыкладна роўную вагу: мужчыны адказныя за выпас жывёлы, жанчыны – за гатаванне ежы, вядзенне хатняй



*Доўгі дом іракезаў. Гравюра сярэдзіны XIX ст.*

гаспадаркі. Эканамічная роля жанчыны істотна павялічваецца ў выпадку развіцця малочнай жывёлагадоўлі, якая становіцца пераважна яе заняткам. Разам з тым, падвышэнню ролі мужчыны спрыяюць неабходнасць захавання бяспекі статку ад набегаў суседзяў ці звычай рабіць такія набегі самім. Рост агрэсіўнасці і ваяўнічасці аўтаматычна выключае жанчын са сферы кантролю маёмасці і, адпаведна, са сферы прыняцця палітычных рашэнняў. Трэба, аднак, адзначыць, што сярод вялікай колькасці качавых пасталістаў склаліся традыцыі паважлівага стаўлення да жанчын, якія выяўляюцца, у тым ліку, у спецыфічных традыцыях заляцання да патэнцыяльных нявест. Яны ўключаюць спартыўныя спаборніцтвы і, што самае істотнае, выяўленне сваіх пачуццяў спевамі ў суправаджэнні музыкі на струнным інструменце.



*Жанчына з народа туарэг*

У раннім Сярэднявеччы такія традыцыі былі запазычаныя шляхецкім станам Еўропы, які тады нараджаўся: адсюль рыцарскія турніры, лірыка трубадураў, мінезінгераў і вагантаў, дый самы папулярны да гэтага часу «рамантычны» інструмент – гітара, назва якога паходзіць з андалузскага дыялекту арабскай мовы.

З утварэннем старажытных цывілізацый, прыкметай якіх стаў няроўны доступ да багацця, улады і прэстыжу, жанчыны сталі першай сацыяльнай групай, для якой гэты доступ абмежавалі. Увогуле ж, грамадствы, заснаваныя на тэхналогіі агракультуры, характарызуюцца ці не найбольшым узроўнем гендарнай няроўнасці на карысць мужчынаў. Гэта не выпадкова: згодна са статыстыкай, у 81% грамадстваў, заснаваных на агракультуры, мужчыны дамінавалі ў вытворчасці.

Адзін з найбольш старажытных помнікаў права – законы Хамурапі (XVII ст. да н. э.) – фіксуе падначаленасць жанчыны мужу



*Стэла з законамі Хамурапі*

і бацьку. Гэта выяўлялася пры ўзяцці шлюбу ці разводзе. Разам з тым, у кодэксе падрабязна прапісаны маёмасныя правы жанчыны пры розных магчымых абставінах жыцця.

Пазней у рэгіёне Блізкага і Сярэдняга Усходу ўсталявалася адна з найбольш дыскрымінацыйных у адносінах да жанчын традыцыя пад назваю *пурда*. Яна прадпісвала жанчыне весці па сутнасці пустэльніцкі лад жыцця ў бацькавым доме ці ў доме мужа. Пурда ўключае ў сябе правілы падзелу дома на жаночую і мужчынскую паловы, паасобнае харчаванне. Яна не дазваляе жанчыне з'яўляцца па-за межамі дома без суправаджэння сваяка-мужчыны. Яна прадпісвае нашэнне па-за домам адзення, якое цалкам (паранджа, бурка) ці часткова (нікаб) захінае твар жанчыны, або хустку, якая закрывае валасы і шыю (хіджаб). Пры гэтым адзенне павінна быць такога крою, каб не было відаць постаці жанчыны.

Іслам, які ўзнік пазней, фактычна замацаваў гэтыя традыцыі і садзейнічаў іх пашырэнню на іншыя рэгіёны, хоць у яго са-




*Жаночае адзенне ў рэгіёне «пурда»*

кральных тэкстах няма непасрэднага загаду выконваць менавіта гэткія правілы. Для сістэмы пурды характэрнае максімальнае супрацьпастаўленне публічнай і хатняй сферы жыцця, пры гэтым жанчына цалкам выключана з першай. Гэта азначае максімальнае абмежаванне даступных жанчыне сацыяльных роляў, якія звужаюцца выключна да ролі дачкі, жонкі, маці. Дарэчы, гэта тыпова не толькі для гэтага рэгіёну, але і для пераважнай большасці грамадстваў, заснаваных на тэхналогіі ворыўнай апрацоўкі зямлі.




*Нягледзячы на мадэрнізацыю краін Бліжняга Усходу, жанчыны ў іх, па сутнасці, застаюцца ў дыскрымінаваным становішчы. Кадр са фільма «Самсара» Рона Фрыке, зняты ў 2011 г. у Дубаі*

Пераход да індустрыяльнай ступені развіцця выклікаў радыкальнае пашырэнне магчымасцяў жанчын быць занятымі ў публічнай прасторы. Гэта істотна паўплывала на здольнасць жанчын самастойна прымаць рашэнні адносна найбольш значных пытанняў свайго жыцця, у тым ліку такіх, як уступіць у шлюб, нарадзіць дзіцё ці выбраць будучую прафесію. Ад XIX ст. вядзе свой пачатак барацьба жанчын за роўныя правы і магчымасці з мужчынамі. Істотную ролю ў памяншэнні цяжару «хатняй жаночай працы» адыгралі тэхналагічныя дасягненні другой паловы XX ст.: аўтаматычныя пральныя і посудамыйныя машыны, мікрахвалевыя печы, ежа хуткага прыгатавання, памперсы і шмат чаго іншага.

Пашырэнне правоў і магчымасцяў жанчын стала магутным рухавіком грамадскага развіцця на працягу мінулага стагоддзя.

Ліквідацыя гендарнай няроўнасці на рынку працы паспрыяла значнаму павелічэнню валавога ўнутранага прадукту: у ЗША на 9%, у Еўразоне – 13%, у Японіі – 16%.

Жанчыны робяцца ўсё больш актыўнымі ў вырашэнні сацыяльных, палітычных і эканамічных праблем у якасці раўнапраўных партнёраў. Пашырэнне гендарнай роўнасці з'яўляецца незваротнай тэндэнцыяй. Яна гарантуецца канстытуцыямі большасці (143) краін свету. У студзені 2015 г. 24 жанчыны ўзначальвалі ўрады або былі прэзідэнтамі сваіх краін. Разам з тым, у 6 краінах свету ва ўрадах жанчын не было ўвогуле.

На сусветным рынку працы, як сведчыць статыстыка, жанчыны ўсё яшчэ не маюць роўных магчымасцяў: узровень занятасці сярод мужчынаў складае 72%, у той час як сярод жанчын – толькі 47%. Пры гэтым сам факт наяўнасці працы не гарантуе жанчыне справядлівага, роўнага з мужчынамі заробку. Нават у эканамічна развітых краінах існуе вялізны разрыў у аплаце за адну і тую самую працу. Да гэтага трэба дадаць, што жанчыны ў большай ступені, чым мужчыны, церпяць ад адсутнасці доўгатэрміновых кантрактаў; яны ў першую чаргу становяцца ахвярамі беспрацоўя.

## Падсумаванне

Адрозненні паміж людзьмі – універсальная асаблівасць чалавечага грамадства. Аднак на працягу большай часткі часу свайго існавання яны не былі падставай для дамінавання адной групы над другой. Іерархічная пабудова грамадства – з'ява параўнальна новая: яна ўзнікае не больш як 5–6 тысячагоддзяў таму. Першапачаткова яна ўсталёўвала максімальную дыстанцыю паміж групамі, якія мелі няроўны доступ да багацця, улады і прэстыжу. Узнікненне вертыкальнай сацыяльнай мабільнасці ў часы індустрыяльнага грамадства садзейнічала размыванню межаў паміж сацыяльнымі групамі, змяншэнню дыскрымінацыі жанчын. Разам з тым, гэта не зменшыла маёмаснага расслаення грамадства, якое ўсё яшчэ мае тэндэнцыю да павелічэння.

# Раздзел 7.
# Геаграфія традыцыйных палітычных сістэм

*Гістарычныя тыпы палітычнай арганізацыі.*
*Ацэфальныя грамадствы.*
*Абшчыны. Плямёны.*
*Правадырствы.*
*Дзяржавы. Базавыя прыкметы дзяржавы.*
*Канцэпцыі паходжання дзяржаў.*

Кожнае грамадства, незалежна ад тэхналогіі жыццезабеспячэння, сутыкаецца з неабходнасцю ўжывання ўлады. Улада – гэта здольнасць падпарадкаваць і рэгуляваць паводзіны і ўчынкі людзей, часта нават насуперак іх уласным жаданням. Улада неабходная для падтрымання парадку ў грамадстве, абароне яго ад знешніх пагроз, выканання задач, якія патрабуюць каардынаваных дзеянняў вялікай колькасці людзей.

На працягу гісторыі чалавецтва формы арганізацыі палітычнай сферы грамадскага жыцця істотна адрозніваліся. Гэтыя адрозненні датычылі як механізмаў прыняцця палітычных рашэнняў, так і спосабаў іх выканання прадстаўнікамі грамадства. Яны выяўляюцца, па-першае, у наяўнасці ці адсутнасці персаналізаваных палітычных роляў (правадыроў, прэзідэнтаў, каралёў, канцлераў і да т. п.). Па-другое, у ступені адасобленасці палітыкі ад іншых формаў грамадскай актыўнасці – рэлігіі, гаспадарчай дзейнасці. Па-трэцяе, у колькасці людзей, аб’яднаных у межах асобнай палітычнай адзінкі. У залежнасці ад характару іх спалучэння вызначаюць наступныя тыпы развіцця палітычнай арганізацыі: абшчынныя грамадствы, племянныя грамадствы, правадырствы і дзяржавы.

### *Абшчынныя грамадствы*

На працягу большай часткі гісторыі свайго існавання асноўнай формай палітычнага жыцця людзей была абшчынная арганізацыя. Збольшага яна адпавядае стратэгіі жыццезабеспячэння палявання і збіральніцтва. Для яе характэрны найменшы з усіх вядомых маштаб палітычнай інтэграцыі: колькасць чальцоў абшчыны звычайна вагалася ад 25 да 150 чалавек. Яна ў пэўнай ступені залежала ад аб'ёму наяўных прыродных рэсурсаў. Там, дзе іх было болей, была і большая колькасць абшчыннікаў. Абшчына складалася з нуклеарных сем'яў (бацькоў і непаўналетніх дзяцей).

Паляўнічыя і збіральнікі, якіх яшчэ ў XVIII ст. пазначылі як «дзікуноў», звычайнаму еўрапейцу ўяўляюцца купкай крыважэрных, агрэсіўных бандытаў, на чале якіх – самы агрэсіўны і крыважэрны – правадыр. У сапраўднасці, у абшчынных грамадствах няма персаналізаваных палітычных роляў. Гэта значыць, што ніякіх правадыроў у іх таксама няма, як і ўвогуле ніякіх кіраўнікоў. Такія грамадствы яшчэ называюць ацэфальнымі: у літаральным перакладзе – безгаловымі. Па вялікім рахунку, кіраўнікі такім суполкам і не патрэбныя. Адхіленні ад нормаў паводзінаў здараюцца ў іх надзвычай рэдка. Знешнія пагрозы – таксама: гэтыя грамадствы пазбягаюць канфліктаў. Сюды трэба дадаць і тое, што нейкіх маштабных работ, якія патрабуюць цэнтралізаванага кіравання, у іх таксама няма. Паляванне і збіральніцтва – гэта руцінныя справы.



*Лідар абшчыны канг узначальвае паляўнічых*

Разам з тым, у некаторых абшчынных групаў, напрыклад, у народа канг у пустыні Калахары, маглі быць лідары, якіх памылкова прымалі за правадыроў. Звычайна гэта былі мужчыны, якія карысталіся аўтарытэтам у супляменнікаў. Вядомыя

выпадкі, калі пасада лідара перадавалася ў спадчыну. Да парадаў лідара звычайна прыслухоўваліся. Але самае галоўнае адрозненне такога лідара ад, скажам, правадыра, было ў тым, што ён не мог нікому нічога загадаць і, тым больш, не мог прымусіць выконваць свой загад. Калі парады лідара аказваліся не вельмі слушнымі, на іх проста пераставалі звяртаць увагу. Разам з тым, становішча лідара давала пэўныя прывілеі: ён узначальваў калону абшчыны падчас вандроўкі, меў права першым выбраць месца для сваёй сям'і на стаянцы. Лідар выконваў пэўныя рэпрэзентацыйныя функцыі: калі на тэрыторыі абшчыны з'яўляліся чужынцы, яны менавіта ў яго павінны былі прасіць дазволу збіраць ежу ці карыстацца воднымі крыніцамі.

Палітычныя рашэнні прымаліся па меры неабходнасці на сходзе дарослых чальцоў абшчыны. Яны грунтаваліся на агульнай згодзе і адпаведнасці традыцыям. Пры гэтым нейкіх асобных працэдур для гэтага не існавала. Гэткім самым чынам зацвярджалася агульная думка адносна гаспадарчых ці рэлігійных пытанняў. Гэта значыць, што палітычная актыўнасць была спалучаная з іншымі формамі грамадскай дзейнасці.

### *Племянныя грамадствы*

Плямёны гэтак сама, як і абшчыны, адносяцца да ацэфальных грамадстваў: яны не маюць цэнтралізаванай улады. Улада ў іх размяркоўваецца сярод вялікай колькасці малых сямейных групаў, а калектыўныя дзеянні ёсць вынікам разгалінаванай сістэмы асабістых і групавых адносінаў, заснаваных на сваяцтве. Галоўнае адрозненне ад абшчын палягае ў тым, што племянныя грамадствы мелі значна большы маштаб палітычнай інтэграцыі. У некаторых выпадках яны налічвалі тысячы, дзясяткі і нават сотні тысяч чальцоў. Племянны тып палітычнай арганізацыі сустракаецца сярод хорцікультуралістаў і пастаралістаў. Але ён не ёсць выключнай формай палітычнага жыцця: на аснове гэтых стратэгій магчымы і іншыя.

Галоўную ролю ў калектыўных мэтанакіраваных паводзінах адыгрываў прынцып сваяцкай салідарнасці. Племя лічылася калектывам сваякоў. Пры гэтым вельмі часта гэта было цалкам уяўнае сваяцтва. Але незалежна ад таго, якім яно было, сваякі былі

павінны падтрымліваць адзін аднаго. Групы сваякоў аб'ядноўваліся ўзалежнасці ад маштабаў праблемы, з якой яны сутыкаліся. Спрэчкі, напрыклад, брата з братам вырашаліся ў межах сям'і, стрыечных братоў – на ўзроўні ліниджа (сваяцкай, групы якая вяла паходжанне ад адзінага продка), а калі гаворка заходзіла аб канфлікце з іншым племем (не сваякамі), адбывалася кансалідацыя ўсіх.

Пры прыняцці палітычных рашэнняў меркаванне кожнага чальца абшчыны было не менш значным, чым яе лідараў. Так у Меланезіі, напрыклад, ужо вядомыя чытачу арганізатары пераразмеркавання «біг мэны» хоць і карысталіся значна большым аўтарытэтам, але не мелі магчымасці аддаваць загады і прымушаць да іх выканання. Больш за тое, іх пазіцыя заўсёды была аб'ектам канкурэнцыі: шанец заняць пасаду «біг мэна» меў кожны, хто прапаноўваў большы пачастунак. У некаторых плямёнах значную ролю ў прыняцці рашэнняў адыгрывала рада старэйшын вясковай абшчыны. Як правіла, яна імкнулася знайсці такі варыянт, які задаволіў бы калі не ўсіх, то большасць супляменнікаў.

Сярод янамамі – плямені, якое жыве на поўдні Венесуэлы і поўначы Бразіліі, ролю, падобную да «біг мэнаў», адыгрывалі вясковыя лідары. Янамамі займаліся агародніцтвам, якое спалучалі з паляваннем і збіральніцтвам. Яны жылі ў стацыянарных паселішчах. Вясковыя лідары таксама не мелі магчымасці аддаваць загады. Яны ўплывалі на грамадскую думку парадамі, асабістым прыкладам. Часта яны выступалі ў якасці пасярэднікаў пры



*Лідар вясковай абшчыны ў племені янамамі*

вырашэнні канфліктаў у вёсцы. Але іх роля абмяжоўвалася выказваннем сваёй думкі. Якіх-небудзь сродкаў для выканання яе не было. Мала таго, калі бакі спрэчкі заставаліся не задаволеныя парадай, яны вырашалі канфлікт самастойна. Падобна да «біг мэна», вясковы лідар павінен быў дэманстраваць шчодрасць у дачыненні да аднавяскоўцаў. Ён прапаноўваў багаты пачастунак не толькі ім, але і прадстаўнікам суседніх вёсак. Аднак уся гэтая ежа была вынікам працы яго асабіста і ягонай сям'і.

Адзін з найбольш вядомых прыкладаў племянных грамадстваў – нуэры, пастаралісты паўднёвага Судана. Іх лад жыцця падрабязна апісаны брытанскім даследчыкам Эдвардам Эвансам-Прычардам, якога часта называюць заснавальнікам палітычнай антрапалогіі. У 1930-х гг., калі праводзілася даследаванне, нуэры налічвалі да 200 тыс. чалавек. У іх не было якіх-небудзь структур цэнтралізаванай улады, заканадаўчых, выканаўчых органаў.



*Нягледзячы на ваяўнічасць і шматлікасць, нуэры ў мінулым абыходзіліся без урада*

Пры гэтым яны былі здольныя падтрымліваць парадак унутры грамадства і выступаць адзіным фронтам супраць традыцыйных ворагаў-суседзяў – племя дзінка. У нуэраў існаваў так званы пантрайбалісцкі (агульнаплемянны) механізм салідарнасці: чым большы быў маштаб праблемы, тым больш аддаленыя ў сваяцкіх адносінах групы аб'ядноўваліся дзеля іх вырашэння.

### *Правадырствы*

У адрозненне ад дзвюх папярэдніх палітычных сістэм, правадырствы з'яўляюцца цэнтралізаванай палітычнай арганізацыяй.

У іх існуюць дакладна вызначаныя персаналізаваныя палітычныя ролі. Уладныя пазіцыі перадаюцца ў спадчыну ад асобы да асобы ці знаходзяцца пад кантролем адносна нешматлікай групы. Калі, скажам, на пазіцыю «біг мэна» мог прэтэндаваць кожны, хто меў дастатковую колькасць харчовых рэсурсаў і асабістыя амбіцыі, то доступ да ўладнай пазіцыі ў правадырствах быў абмежаваны прыналежнасцю да пэўнай сваяцкай групы. У параўнанні з плямёнамі правадырствы адрозніваюцца значна большай шчыльнасцю і складанасцю структуры насельніцтва. Складанасць выяўлялася ў тым, што, у адрозненне ад племянных грамадстваў, у якіх усе сваяцкія групы лічыліся роўнымі, у правадырствах існавала строгая іерархія, падпарадкаванне адных лакальных супольнасцяў другім.

Палітычная сістэма правадырстваў выбудоўвалася вакол асобы правадыра, які ў той ці іншай ступені меў магчымасць уплываць практычна на ўсе сферы эканамічнага і сацыяльнага жыцця. Правадыр звычайна быў сімвалічным уласнікам рэсурсаў (зямлі і, калі гэта было істотна, вады), займаўся іх размеркаваннем. Ён мог збіраць даніну ў выглядзе харчоў ці тавараў і потым ажыццяўляў іх пераразмеркаванне дзеля забеспячэння свайго аўтарытэту і ўмацавання грамадскай салідарнасці. Правадыр выконваў дыпламатычныя і вайсковыя функцыі: абвяшчаў вайну, заключаў мір, збіраў войска, кіраваў ім і г. д. У склад яго паўнамоцтваў уваходзілі функцыі вырашэння ўнутраных канфліктаў, вядзенне судовага працэсу і, у некаторых выпадках, выкананне прысуду. Часта правадыр быў адначасова і галоўным святаром, непасрэдна займаўся арганізацыяй і ажыццяўленнем сакральных рытуалаў.

Правадырствы вядомыя галоўным чынам на прыкладах грамадстваў Палінезіі. Характэрна, што ў іх пазіцыя палітычнага кіраўніка звязвалася са звышнатуральнымі здольнасцямі. Лічылася, што правадырамі становяцца тыя, хто здольны авалодаць так званай «мана» – нябачнай чароўнай сілай. Панаваў прынцып: у каго «мана» большая – той і правадыр. З асобай правадыра была звязана вялікая колькасць абмежаванняў для звычайных людзей. Такія забароны называліся «табу». З палінезійскай мовы гэтае слова трапіла і ў еўрапейскія. Звычайна табу накладаліся на дотык да цела правадыра, доступ да ягонага жытла. На некаторых выспах забаранялася

нават наступаць на тое месца, па якім праходзіў правадыр. Таму правадыроў пераносілі на спецыяльных насілках. Катэгарычна забаранялася ўжываць ежу правадыра і г. д. Дарэчы, забароны маглі датычыць не толькі падначаленага насельніцтва, але паводзінаў самога правадыра. У некаторых афрыканскіх народаў, напрыклад, правадыру забаранялася выходзіць за межы сваёй рэзідэнцыі і рэкамендавалася ўвогуле не ўставаць з трона. Лічылася, што калі правадыр парушыць гэтае табу, на народ абрынуцца страшэнныя няшчасці.

Кантроль правадыром усіх сфераў жыцця вымагаў наяўнасці дастаткова значнай групы людзей, якія ажыццяўлялі б яго загады на месцах: збіралі б даніну, набіралі б у войска і да т. п. Права на такую дзейнасць належала правадыровым сваякам, і чым шчыльнейшая была сваяцкая сувязь, тым вышэйшая была пасада. Трэба падкрэсліць, што выкананне падобных абавязкаў не было штодзённым: яны ажыццяўляліся па меры неабходнасці.

На Гавайскіх выспах, якія лічацца адным з класічных прыкладаў функцыянавання сістэмы правадырства, усё насельніцтва падзялялася на тры групы. У першую ўваходзілі аліі – найвышэйшыя правадыры, якіх лічылі нашчадкамі багоў. У другую – канохікі, ніжэйшыя правадыры. І ў трэцюю – макааінана, простыя абшчыннікі. Гэтыя групы былі падобныя да кастаў. Хоць фармальна шлюбы паміж прадстаўнікамі розных групаў не былі забароненыя, але здараліся яны рэдка.



*Маарыйскі правадыр. Малюнак маарыйскай мастачкі Веронікі Камінгс*

У адрозненне ад абшчынных і племянных супольнасцяў, правадырствы ў меншай ступені звязаны з пэўнай стратэгіяй жыццезабеспячэння. Іх класічныя прыклады найчасцей сустрака-

юцца ў грамадствах з ручной апрацоўкай зямлі, але яны вядомыя і у пастаралістаў, і сярод тых, хто займаўся сельскагаспадарчай апрацоўкай зямлі яшчэ да ўзнікнення дзяржаў.

***Дзяржавы***

Дзяржавы адрозніваюцца ад усіх папярэдніх формаў палітычнай арганізацыі маштабам інтэграцыі: колькасць насельніцтва ў межах асобнай палітычнай адзінкі можа складаць да некалькіх сотнях мільёнаў і нават перавышаць мільярд чалавек. У адрозненне ад племянных грамадстваў ці правадырстваў, дзяржавы будуюцца на тэрытарыяльным прынцыпе, а не на сваяцкіх адносінах. Другая асаблівасць дзяржаў – наяўнасць вялікай колькасці палітычных роляў, якія выконваюцца на прафесійнай і сталай аснове. Іншымі словамі, дзяржава патрабуе вялікай бюракратычнай сістэмы, якая мае цэнтралізаваны, іерархічны характар. Гэтая сістэма прадугледжвае наяўнасць вузкай спецыялізацыі ў выкананні тых ці іншых функцый.

Ці не найбольш характэрнай рысай дзяржавы ёсць наяўнасць спецыяльнай групы людзей, упаўнаважаных ужываць гвалт дзеля падтрымання парадку. Любая іншая форма гвалту лічыцца злачынствам. Пры гэтым дзяржава мае спецыяльныя працэдуры ўжывання гвалту, зафіксаваныя ў пісьмовай форме, у заканадаўстве.



*Ужыванне гвалту ёсць неабходнай умовай існавання дзяржавы*

Эканамічным базісам дзяржаў звычайна з'яўляецца сельскагаспадарчая апрацоўка зямлі. Разам з тым, яе наяўнасць не выклікае аўтаматычнага ўтварэння дзяржаўнай формы кіравання. Абшчыны агракультуралістаў могуць доўга існаваць і без дзяржаўнай бюракратыі. З другога боку, ёсць прыклады фарміравання

дзяржаў на базе ручной апрацоўкі зямлі: такімі былі ўсе старажытныя цывілізацыі ў Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыцы. А вось абавязковай умовай існавання дзяржаў з’яўляецца існаванне фармалізаванай сістэмы перадачы інфармацыі – часцей за ўсё, пісьмовасці і гарадоў.

Існаванне дзяржаў патрабуе ідэалагічнай падтрымкі – сістэмы ўяўленняў, якая забяспечвае легітымнасць, законнасць адпаведнай сістэмы кіравання. Іншымі словамі, ідэалогія павінна ствараць упэўненасць сярод тых, кім кіруюць, што іх кіраўнікі маюць на гэта поўнае права. Ідэалогія можа быць заснаваная на самых розных аргументах: ад рацыянальных да звышнатуральных (уяўленні аб паходжанні палітычных лідараў ад багоў). Але без яе фактычна не можа абыходзіцца ніводная дзяржава.

У сувязі з тым, што дзяржава азначае існаванне вялікага бюракратычнага апарату, яго ўтрыманне патрабуе рэгулярнага збору падаткаў – пэўнай часткі вынікаў вытворчасці ў натуральнай ці грашовай форме. Звычайна падаткі сплачваюцца / перадаюцца самімі вытворцамі. Разам з тым, у некаторых выпадках, калі дзяржаве належалі ўсе формы вытворчасці, яна фактычна прыўлашчвала ўвесь унутраны прадукт, а потым дазваляла вытворцам атрымліваць яго частку.



*Стварэнне дзяржавы вымагала стварэння бюракратычнага апарату*

Напрыклад, у дзяржаве інкаў не існавала гандлю. Таму чыноўнікі збіралі ўсю прадукцыю рамеснікаў, якую потым размяркоўвалі сярод сялян, а рамеснікі атрымлівалі харчаванне з дзяржаўных сховішчаў. У сялян жа дзяржава адбірала ⅔ прадукцыі. У яшчэ больш радыкальнай форме такі спосаб збору падаткаў існаваў у Са-

вецкім Саюзе: тут дзяржава пераразмяркоўвала ўнутраны прадукт амаль цалкам. Вядома, напрыклад, што рабочыя, якія працавалі на аўтазаводзе ў Набярэжных Чаўнах, дзе выпускаўся славуты легкавік «Лада», атрымлівалі заробак у памеры адной капейкі з рубля кошту прадукцыі (гэта значыць, што падатак складаў 99%). Са зборам падаткаў, дарэчы, звязаны абавязковыя атрыбуты дзяржаўнасці: пісьмовасць у часы старажытных цывілізацый выконвала функцыі ўліку збору падаткаў, гарады – функцыі складоў з харчаваннем.



*Збор падаткаў – таксама неабходная ўмова існавання дзяржавы*

Збор падаткаў – найбольш істотная, але не адзіная функцыя дзяржавы. Яна таксама займаецца кантролем сваёй тэрыторыі, у першую чаргу, межаў, улікам насельніцтва (падаткаплатнікаў), вырашае ўнутраныя канфлікты, арганізоўвае калектыўныя работы.

Узнікненне дзяржаў у старажытнасці належыць да ліку ці не найбольш загадкавых з'яў у гісторыі чалавецтва. Сапраўды, людзі тысячагоддзямі жылі без падатковых інспектараў і паліцыянтаў, і пры гэтым супольнасці, пазбаўленыя гэтых элементаў цывілізацыі, маглі па сваіх памерах адпавядаць сённяшнім, няхай і не самым вялікім, дзяржавам. Колькасць нуэраў, што не мелі ніякіх дзяржаўных інстытутаў (200 тыс. чалавек пры канцы 1930-х гг.) была не нашмат меншая за насельніцтва сучаснай Ісландыі (каля 250 тыс. чал.). Навошта ж нашым продкам спатрэбілася ствараць асобную групу людзей, якая прымушае нас рабіць тое, чаго мы не хочам (а ў гэтым і ёсць сутнасць улады), прычым за наш уласны кошт?

На жаль, у нас няма машыны часу, каб зазірнуць у тую далёкую эпоху – прыкладна 5–5,5 тысяч гадоў таму – і ўсё ўбачыць на свае вочы. Існуе шмат канцэпцый, уяўных рэканструкцый таго феномену.

Так, напрыклад, стваральнік канцэпцыі неалітычнай рэвалюцыі брытанскі археолаг Гордан Чайлд лічыў, што ў аснове стварэння інстытутаў дзяржаўнай улады былі рацыянальныя меркаванні людзей. Яны, як яму здавалася, добраахвотна ахвяравалі часткай сваёй свабоды, каб дасягнуць згоды ў грамадстве. Неалітычная рэвалюцыя істотна падвысіла эфектыўнасць гаспадарання і дазваляла ствараць лішкі прадукцыі і, адпаведна, запасы харчавання. Гэта, у сваю чаргу, дазволіла частцы насельніцтва вызваліцца ад сельскагаспадарчых заняткаў і спецыялізавацца на рамеснай вытворчасці й гандлі. Структура грамадства ўскладнілася, а традыцыйныя спосабы вырашэння спрэчак і ўнутраных канфліктаў не маглі даць з гэтым рады. Менавіта таму людзі прыйшлі да думкі аб неабходнасці спецыяльных пасярэднікаў і свядома, дабраахвотна (адсюль і назва канцэпцыі – «валюнтарысцкая»), паступова павялічвалі свае паўнамоцтвы, пачалі выконваць іх на сталай аснове і, урэшце, ператварыліся ў апарат кіравання грамадствам.

Канцэпцыя Чайлда выглядае дастаткова рацыянальнай, аднак вядома, што сялянская гаспадарка, пра што пісаў Аляксандр Чаянаў, не арыентаваная на стварэнне лішку прадукцыі. Менавіта дзяржава і прымушае яго ствараць. Сялянскія абшчыны, якія займаліся агракультурай, існавалі сама меней некалькі тысячагоддзяў без дзяржаўнай улады. Таму сельскагаспадарчая апрацоўка зямлі аўтаматычна не выклікае стварэння дзяржавы. Акрамя гэтага, гісторыі не вядомыя прыклады дабраахвотнай перадачы людзьмі часткі сваёй свабоды дзяржаве. Без гвалту тут ніколі не абыходзілася.

Згодна з амерыканскім гісторыкам Карлам Вітфогелем, першыя дзяржавы ўтварыліся ў далінах рэк, дзе засушлівы клімат не дазваляў развіваць апрацоўку зямлі без ірыгацыі – стварэння сістэмы арашальных каналаў. Іх пабудова патрабавала мэтанакіраваных дзеянняў вялікай колькасці людзей, а значыць – і кіравання. Ірыгацыя вымагала выключэння з сельскагаспадарчай вытворчасці значнай колькасці працоўнай сілы, якую трэба было карміць, а значыць цэнтралізаваным чынам збіраць падаткі. «Прарабы»-кіраўнікі вытворчасці з цягам часу, зноў-такі, канцэнтравалі ў сваіх руках усё болей улады, пакуль не ўтварылі

дзяржаўны апарат. Гэтую канцэпцыю яшчэ ўмоўна называюць «ірыгацыйнай», або «гідраўлічнай». Яна выглядае лагічнай, але археалагічныя даследаванні сведчаць, што, з аднаго боку, маштабныя ірыгацыйныя сістэмы могуць функцыянаваць і без палітычнай арганізацыі дзяржаўнага тыпу, а з другога – дзяржавы могуць утварацца і да стварэння арашальных каналаў.

У сувязі з гэтым куды больш верагоднымі выглядаюць канцэпцыі, згодна з якімі паходжанне дзяржаўнай улады звязана з сістэматычным ужываннем гвалту і ўзброенай барацьбы. Такую думку яшчэ ў XIX ст. выказваў вядомы сацыёлаг Гэрберт Спэнсэр.



*Старажытнае кола для падымання вады ў Хаме, Сірыя*

Дзяржавы ўзнікаюць у выніку бясконцай барацьбы паміж плямёнамі. Перамагае той, хто мае лепшую вайсковую арганізацыю. Менавіта таму дзяржавы ўтвараюцца паводле вайсковага ўзору, а гвалт ёсць неабходным іх атрыбутам. Разам з тым, вядомыя таксама і прыклады надзвычай ваяўнічых народаў, янамама ці даякаў (вядомых як «паляўнічыя на галовы»), у якіх вайна хоць і стала традыцыйнай часткай існавання, але гэта так і не прывяло да стварэння дзяржаў.

Амерыканскі даследчык Роберт Карнэйра лічыць, што апісаная Спэнсэрам сітуацыя спрацоўвае не аўтаматычна, а толькі ў тых прыродных рэгіёнах, у якіх існуе натуральнае абмежаванне колькасці даступных прыродных рэсурсаў – перадусім зямлі і вады. Да такіх рэгіёнаў адносяцца выспы, даліны рэк у арыдным клімаце ці ўрадлівыя горныя даліны. Рост колькасці і шчыльнасці насельніцтва ў выніку неалітычнай рэвалюцыі раней ці пазней прыводзіць да канкурэнцыі ў змаганні за рэсурсы, бо па-за межамі пазначаных тэрыторый яны адсутнічаюць. І ўжо далей перамагае той, хто, згодна са Спэнсэрам, мае больш дасканалую вайсковую арганізацыю.

Створаныя ў некалькіх асобных месцах дзяржавы выклікаюць фактам свайго ўзнікнення ланцуговую рэакцыю. Ўільям Мак-Ніл, напрыклад, пара ўноўвае ядро дзяржаўнай сістэмы – «прадстаўнікоў *homo sapiens*, якія за кошт спецыялізацыі ў галіне ўжывання гвалту здольныя забяспечыць сваё існаванне», – з інфекцыйнымі хваробамі. Гэта – «макрапаразіты», якія не ўдзельнічаюць у працэсе вытворчасці прадуктаў спажывання і іншых матэрыяльных каштоўнасцяў. «Мікрапаразітарны сімбіёз важны ў галіне эпідэміялагічнай экалогіі, – піша Мак-Ніл, – а пры сутыкненні з невядомай раней інфекцыяй цывілізаваныя папуляцыі (іншымі словамі, тыя, што мелі досвед эпідэмій) валодаюць у параўнанні з ізаляванымі супольнасцямі перавагай коштам у жыццё. Добра ўзброеная і арганізаваная сіла пры сутыкненні з менш падрыхтаваным да вайны грамадствам дзейнічае збольшага такім самым чынам, як клеткі знаёмых з эпідэміямі сацыяльных адзінак».



*У падмурку стварэння дзяржаў заўсёды быў гвалт. Асірыйскі барэльеф, прысвечаны захопу Лагіша*

Узнікненне дзяржаўнай улады – адна з найвялікшых катастроф у гісторыі чалавецтва. Яе вынік – утварэнне не вядомай раней, не ўплеценай у структуру падставовых патрэбаў чалавека патрэбы дамінаваць над падобным да сябе, цешыцца з магчымасці маніпуляваць чужым лёсам і жыццём, якую дае ўлада. Яе кошт – дзясяткі і сотні мільёнаў забітых у бясконцых войнах, якія доўжацца бесперапынна з моманту ўтварэння першых «цывілізацый», бясконцае ўдасканальванне сродкаў забойства як асобна ўзятага чалавека, так і чалавека як біялагічнага віду з усім яго навакольным асяроддзем.

## Падсумаванне

На працягу большай часткі сваёй гісторыі чалавецтва абыходзілася без цэнтралізаваных сістэм палітычнага кіравання. Паляўнічыя і збіральнікі, значная частка ручных земляробаў і пастаралістаў і часткова сяляне-земляробы мелі ацэфальныя палітычныя сістэмы, якія не прадугледжвалі спецыяльных пасад кіраўнікоў. Паводле колькасці насельніцтва гэтыя супольнасці звычайна былі невялікімі, але некаторыя з іх можна параўноўваць з сучаснымі невялікімі дзяржавамі. Узнікненне дзяржаўнай улады стала наступствам неалітычнай рэвалюцыі і спецыфічнага збегу абставінаў у некаторых рэгіёнах планеты. Усталяванне дзяржаўнай формы кіравання было выклікана ўжываннем гвалту ў барацьбе за жыццёва неабходныя рэсурсы.

# Раздзел 8.
# Геаграфія традыцыйных формаў сацыяльнага кантролю

*Сацыяльныя нормы. Пазітыўныя і негатыўныя санкцыі.*
*Сацыяльны кантроль у грамадствах паляўнічых і збіральнікаў. Спеўныя дуэлі.*
*Сацыяльны кантроль у грамадствах ручных земляробаў і пастаралістаў.*
*Групавы сваяцкі кантроль. Узроставыя класы. Сістэма ўяўленняў пра звышнатуральны кантроль. Ардаліі. Прысягі. Інстытут пасярэднікаў. Рады старэйшын.*
*Сацыяльны кантроль у агракультурных і індустрыяльных грамадствах. Суды і кадыфікаванае права.*

Кожнае грамадства, незалежна ад базавай стратэгіі жыццезабеспячэння, імкнецца падтрымліваць такі лад паводзінаў сваіх чальцоў, які ў адпаведнай супольнасці лічыцца нармальным. Іншымі словамі, кожная культура вызначае, што можа, а чаго не можа рабіць чалавек, а таксама, якім чынам заахвочваць рабіць тое, што трэба, і як караць за невыкананне пэўных правілаў. На працягу сваёй гісторыі чалавецтва выпрацавала надзвычай разнастайны арсенал сродкаў падтрымання сацыяльна ўхваленых паводзінаў. Гэта можа быць дрэс-код, ігнараванне якога здольна паставіць чалавека ў дыскамфортнае псіхалагічнае становішча, ці, напрыклад, стаць прычынай адмовы ў допуску ў начны клуб. Але гэта можа быць і крымінальны кодэкс, парушэнне якога цягне за сабой куды большыя непрыемнасці. Гісторыя сведчыць, што чым больш тэхналагічна складанай становіцца стратэгія жыццезабеспячэння, тым больш разнастайнымі становяцца сродкі кантролю паводзінаў, але пры гэтым адначасова павялічваецца і колькасць і цяжкасць парушэнняў сацыяльных правілаў.

Сістэма сацыяльнага кантролю ўключае ў сябе тры базавыя кампаненты: сацыяльныя нормы, сацыяльныя санкцыі і сродкі вырашэння канфліктных сітуацый. Сацыяльныя нормы – гэта сукупнасць уяўленняў пра тое, што ў чалавечых паводзінах добра, а што дрэнна. Яны могуць быць зафіксаваныя пісьмова ці існаваць у вуснай традыцыі. Частка нормаў дакладна фармулюецца, іншыя існуюць «паводле змоўчання». Звычайна нормы існуюць не самі сабою, але ўключаюцца ў больш шырокія кантэксты чалавечай актыўнасці. Напрыклад, пералік асноўных нормаў паводзінаў змяшчае бадай што кожная рэлігійная сістэма, якая, аднак, уключае ў сябе і іншыя кампаненты. Засваенне нормаў паводзінаў – адна з мэтаў сістэмы адукацыі і г. д.

Сацыяльныя санкцыі – гэта спосабы заахвочвання да выканання сацыяльных нормаў. Яны падзяляюцца на пазітыўныя, якія падтрымліваюць адпаведныя нормам паводзіны, і негатыўныя – якія караюць за іх невыкананне. Акрамя гэтага, санкцыі адрозніваюцца паводле ступені сваёй інтэнсіўнасці ў залежнасці ад таго, наколькі добра прынятыя грамадствам правілы выконваюцца ці наколькі моцна парушаюцца. Напрыклад, той факт, што вы саступілі каму-небудзь дарогу, можа быць узнагароджаны мінімальнай пазітыўнай санкцыяй – проста ўсмешкаю ці словамі ўдзячнасці, а гераічны ўчынак, звязаны з рызыкай для жыцця, можа мець грамадскае ўшанаванне і адзнаку ў выглядзе дзяржаўнай узнагароды. І наадварот, калі вам у грамадскім транспарце наступілі на нагу, гэта будзе вартым мінімальнай негатыўнай санкцыі – злоснага позірку, а такое парушэнне грамадскіх правілаў, як забойства, пацягне за сабой негатыўныя санкцыі ў максімальным памеры – зняволенне ў турме ці нават смяротнае пакаранне.

Да сродкаў вырашэння канфліктных сітуацый належаць працэдуры, якімі высвятляецца наяўнасць ці адсутнасць парушэння правілаў адным з бакоў канфлікту (ступень яго вінаватасці), у залежнасці ад чаго і вызначаецца неабходнасць ужывання і памер негатыўных санкцый. У сучасных грамадствах універсальнай такой працэдурай з’яўляецца судовы працэс. Але існуюць таксама іншыя спосабы вырашэння канфліктаў.

У грамадствах паляўнічых і збіральнікаў парушэнні сацыяльных

нормаў былі адносна рэдкаю з'явай. Гэта тлумачылася тым, што абшчыны былі нешматлікія. Кожны жыў навідавоку ў астатніх. У сувязі з гэтым грамадскі кантроль ажыццяўляўся непасрэдна і безупынна. Трэба таксама дадаць, што падставаў для сур'ёзных парушэнняў не было ужо з той простай прычыны, што ў гэтых грамадствах панавалі эгалітарысцкія настроі і ўсе прадукты палявання і збіральніцтва размяркоўваліся адпаведным чынам – пароўну. Больш за тое, не было магчымасці назапашваць матэрыяльныя каштоўнасці, а значыць не было і падставаў для такіх парушэнняў, як рабунак ці крадзеж. Найбольш цяжкія злачынствы ў гэтых грамадствах былі звязаныя з сэксуальнымі адносінамі – такімі, як, напрыклад, парушэнне шлюбнай вернасці ці выкраданне чужой жонкі.

Так, напрыклад, сярод інуітаў, было пашыранае мнагажэнства. Але далёка не кожны мужчына мог сябе дазволіць утрымліваць некалькі жонак адначасова – магчымасці жаночага збіральніцтва былі надзвычай малымі ў параўнанні з паляваннем і рыбнай лоўляй, якімі займаліся мужчыны. Таму, той хто меў некалькі жонак карыстаўся падвышанай павагай і, адначасова, аб'ектам зайздрасці. І часам здаралася, што менавіта гэтых «дадатковых» – і таму прэстыжных – жанчын выкрадалі. Грамадская думка не выключала магчымасці помсты і забіцця крыўдзіцеля, але гэты варыянт не разглядаўся ў якасці найлепшага. Часцей за ўсё канфлікт вырашаўся шляхам так званых «спеўных дуэляў». Дзеля гэтага збіралася ўся абшчына, а пацярпелы і вінаваты спаборнічалі ў выкананні спеваў. Яны насілі агрэсіўны, абразлівы і, адначасова, іранічны характар. Спевы былі суцэльнай імправізацыяй, і дуэль доўжылася да таго моманту, пакуль нейкі адзін удзельнік быў ужо няздольны адказаць другому



*Спеўная дуэль у інуітаў*

ці пакуль перавага аднаго над другім не рабілася відавочнаю ўсёй аўдыторыі. Жанчына заставалася з пераможцам незалежна ад таго, кім ён быў фактычна – пацярпелым ці крыўдзіцелем. «Спеўныя дуэлі» ёсць прыкладам працэдуры, не накіраванай ні на высвятленне вінаватасці, ні на прызначэнне пакарання. Галоўнае ў ёй – дасягненне згоды. Даследчыкамі таксама адзначаўся і пэўны псіхатэрапеўтычны эфект – прагаворванне, дакладней, спяванне крыўды дазваляе зняць становішча афекту.

Сярод ціві, племені на поўначы Аўстраліі, існавала традыцыя ўмоўнага пакарання вінаватага ў парушэнні шлюбнай вернасці, якую навукоўцы таксама назвалі «дуэль». Яна здаралася дастаткова часта з прычыны надзвычай спецыфічных правілаў заключэння шлюбаў. Мужчынам дазвалялася ствараць сям'ю не раней як у 30-гадовым узросце, а жонкі былі значна маладзейшыя за іх. Шырока практыкавалася мнагажэнства. Атрымлівалася, што ўзроставай катэгорыі 20-гадовых хлопцаў даводзілася або цалкам устрымлівацца ад сэксуальных кантактаў, або спакушаць чужых жонак. Схаваць злачынства ў грамадстве, дзе кожны навідавоку, было цяжка. Раней ці пазней парушальнік маральных нормаў – а вінаватым лічыўся толькі мужчына – быў вымушаны трымаць адказ за ўчыненае. Пакаранне насіла падкрэслена грамадскі характар: у ім абавязанае было ўдзельнічаць усё насельніцтва грамады. Людзі ўтваралі кола, у цэнтры якога станавіліся вінаваты і пацярпелы. Пакрыўджаны муж меў права абражаць злачынцу ўсімі магчымымі словамі, а ўся грамада абавязана была яго гучна падтрымліваць. Акрамя таго, пацярпелы мог кідаць у адказчыка дзіды, аднак толькі такім чынам, каб не нанесці яму вялікай шкоды. Вінаваты, са свайго боку, мог ухіляцца, але сама меней адзін раз зрабіць гэта не вельмі ўдала. На гэтым звычайна працэдура грамадскага пакарання завяршалася.



*Аўстралійцы племені ціві*

У грамадствах ручных земляробаў і пастаралістаў

колькасць і шчыльнасць насельніцтва была значна большая, і непасрэдны («усё навідавоку») сацыяльны кантроль з боку грамады рабіўся менш эфектыўным. Таму былі задзейнічаны дадатковыя інструменты падтрымання парадку.

Па-першае, непасрэдны кантроль быў арганізаваны на ўзроўні сваяцкіх групаў, якія вялі паходжанне ад адзінага продка. Такія групы звычайна мелі агульную маёмасць (зямлю, жывёл), разам працавалі. Іх памеры прыкладна адпавядалі памеру абшчыны паляўнічых і збіральнікаў. На чале стаялі старэйшына ці рада старэйшын, чыя ўлада трымалася на сіле аўтарытэту. Акрамя ўладных функцый, яны адыгрывалі вырашальную ролю і ў заключэнні шлюбаў, якія разглядаліся не столькі як саюз асобаў, колькі як саюз сваяцкіх групаў. Зразумела, што інтарэсы групы значна перавышалі асабістыя меркаванні. Значэнне мела не толькі само прынцыповае рашэнне аб узяцці шлюбу, але і вызначэнне памеру маёмасці, якая пры яго заключэнні перадавалася (пасаг, калым і г. д.). Індывідуальныя жаданні будучых мужа і жонкі маглі быць улічаныя ў тым выпадку, калі іх паводзіны адпавядалі ўсталяваным нормам. Таму заключэнне шлюбаў было вельмі эфектыўным інструментам сацыяльнага кантролю. Вядома, што найбольшая «ўзроставая» схільнасць да парушэння нормаў супадае з шлюбным перыядам, а кантроль над моладдзю – асноўная праблема падтрымання сацыяльнага парадку ў любым грамадстве.

Па-другое, непасрэдны сацыяльны кантроль быў арганізаваны на ўзроўні ўзроставай генерацыі – так званых «узроставых класаў». Ён характэрны для грамадстваў, заснаваных на ўзроставай стратыфікацыі: жыццёвы цыкл чалавека падзелены на пэўныя ступені, кожная з якіх мае дакладна вызначаны кодэкс паводзінаў і дае доступ да пэўнага ўзроўню прэстыжу. Чым вышэйшы ўзрост, тым большай грамадскай павагай карыстаецца група. Але ў адрозненне ад грамадстваў паляўнічых і збіральнікаў, дзе людзі сталага веку аўтаматычна карысталіся найвышэйшай павагай, прынцыпам узроставa-стратыфікаваных грамадстваў было тое, што дасягненне пэўнай ступені прэстыжу залежала не ад узросту, а ад таго, ці адпавядаюць паводзіны ўзроставай кагорты прадпісаным ёй правілам. Яе рамкі звычайна адпавядалі групе моладзі, якая адначасова

праходзіла абрад ініцыяцыі – пасвячэння ў дарослыя. Пры гэтым пераход на кожную новую ступень залежаў ад паводзінаў кожнага «ўдзельніка» групы. Іншымі словамі, калі нават адзін прадстаўнік генерацыі паводзіў сябе не належным чынам, то і ўсе яго раўналеткі пазбаўляліся, напрыклад, магчымасці ажаніцца. Гэтая ўмова стварала надзвычай эфектыўную штодзённую сістэму непасрэднага сацыяльнага кантролю.

Акрамя гэтага, у грамадствах ручных земляробаў і пастаралістаў існавала развітая сістэма ўяўленняў аб звышнатуральным кантролі. Лічылася, што ўсё асяроддзе чалавечага існавання населенае звышнатуральнымі істотамі – духамі. Адны сярод іх былі «адказныя» за пэўныя стыхіі, мясціны, рэкі, лясы. Другія сяліліся ў доме ці ў гаспадарчых пабудовах. Асобную групу складалі духі продкаў. Стасункі з кожным духам вымагалі выканання пэўных правілаў. А з той прычыны, што духі былі паўсюль, звышнатуральны кантроль меў вельмі моцны дысцыплінарны ўплыў – літаральна кожны свой крок чалавек мусіў рабіць у адпаведнасці з пэўнымі правіламі. Асабліва пільным лічыўся кантроль, што ажыццяўляўся духамі продкаў, бо ён быў нібыта бесперапынным.



*Моладзевы ўзроставы клас у масаяў*

Трэба адзначыць, што такі тып сацыяльнага кантролю характэрны не толькі для ручных земляробаў і пастаралістаў. У беларусаў, напрыклад, у XIX ст., нягледзячы на панаванне хрысціянства, захоўваліся шматлікія ўяўленні аб духах, што сфармаваліся значна раней. Адны духі пазначалі сабою небяспечныя мясціны (вадзянік, багнік) і вымагалі асаблівай пільнасці. Другія – напрыклад, лесавік – патрабавалі да сябе павагі, невялікіх ахвярапрынашэнняў: на перакрыжаванні лясных сцежак трэба было пакласці трошкі

ежы, інакш можна было заблукаць. Сапраўдным выхавальнікам быў дамавік. Ён не любіў сямейных сварак, неахайнага жытла і жыхароў-лайдакоў. А тым, хто трымаўся правілаў, добра працаваў, ён дапамагаў у гаспадарцы.

Да звышнатуральных істотаў звярталіся і ў якасці ўяўных сведкаў пры больш сур'ёзных сітуацыях. Гэты зварот мог ажыццяўляцца ў форме прысягі. У залежнасці ад сітуацыі, прысяга азначала, што зварот да духаў пацвярджае сапраўднасць сцвярджэння асобы – напрыклад, невінаватасць. Калі гэта было не так, чакалася, што духі або ўчыняць кару, або нейкім чынам выкажуць сваю нязгоду. Іншы варыянт – калі асоба давала зарок, што ўсе яе ўчынкі ў будучыні будуць адпавядаць правілам, і пагаджалася быць пакаранай звышнатуральнымі сіламі ў выпадку іх невыканання. Гэтая традыцыя, дарэчы, захавалася шмат у якіх краінах дагэтуль: пры ўступленні на вышэйшыя дзяржаўныя пасады палітыкі, паклаўшы руку на сакральную кнігу – Каран ці Біблію, – даюць прысягу, што будуць выконваць свае абавязкі ў адпаведнасці з законамі.



*Прысяга прэзідэнта ЗША Барака Абамы ў 2009 годзе*

Блізкімі да зарокаў і прысягання з'яўляюцца па сваім сэнсе ардаліі, або так званы «суд Божы». Гэтае выпрабаванне выкарыстоўвалі для вызначэння вінаватасці падазраванага ў злачынстве. Часта выпрабаванне насіла фармальны характар. У ранняй сярэднявечнай Італіі, напрыклад, падазраванаму ў забойстве прыкладвалі да далоняў распалены метал. Адсутнасць апёкаў лічылася доказам невінаватасці. А ў народа ашанці ў Заходняй Афрыцы абвінавачаным давалі выпіць атруту. Калі ў выніку гэтага чалавек паміраў, гэта сведчыла пра яго вінаватасць. Ардаліі шырока выкарыстоўвалі ў Еўропе, у тым ліку ў Беларусі, аж да канца XVIII ст. для вызначэння вінаватасці ў вядзьмарстве. Падазрава-



*Выпрабаванне вядзьмаркі вадой. Сярэднявечная гравюра*

ных са звязанымі рукамі кідалі ў ваду. Той, хто не тануў, лічыўся чараўніком, і яго належала спаліць на вогнішчы.

Жорсткія пакаранні ў грамадствах ручных земляробаў і пастаралістаў былі, хутчэй, выключэннем з правілаў. Характэрным было існаванне інстытута медыятараў – гэта значыць пасярэднікаў у вырашэнні канфліктных сітуацый. У нуэраў такую ролю выконваў так званы «правадыр у леапардавай шкуры». Назва насіла чыста ўмоўны характар: правадырамі гэтыя асобы не былі. Але гэта былі паважаныя людзі, вядомыя сваёй здольнасцю вырашаць канфліктныя сітуацыі, і яны сапраўды ўпрыгожвалі сябе леапардавай шкурай. Пры гэтым пасярэдніцкія функцыі яны выконвалі на паўпрафейсійнай аснове: у звычайным жыцці яны займаліся такой самай дзейнасцю, што і астатнія нуэры. Чалавек, які здзейсніў злачынства, добраахвотна звяртаўся да правадыра ў леапардавай шкуры. Асабліва істотным гэта было ў выпадку прычынення цяжкага фізічнага пашкоджання ці забойства: жытло правадыра ахоўвала злачынцу ад помсты сваякоў пацярпелага. Правадыр не займаўся высвят-



*Правадыр у леапардавай шкуры*

леннем абставінаў здарэння – яго мэта была ў іншым: правядзенне перамоваў са сваякамі з абодвух бакоў аб памеры кампенсацыі за нанесеную крыўду.

Фармальна яго прапановы не былі абавязковымі. Правадыр не меў магчымасці прымусіць іх выконваць. Але ў пераважнай большасці выпадкаў яны вырашалі канфлікт. Рэч не толькі ў тым, што пагадненне аб кампенсацыі было вынікам супольных перамоваў, але і ў тым, што правадыры ў леапардавай шкуры спалучалі пасярэдніцкія функцыі з рэлігійнымі. Існавала ўяўленне, што ў выпадку адмовы выканаць прысуд, ён мог звярнуцца па дапамогу да звышнатуральных сутнасцяў.

Шмат у якіх народаў функцыі пасярэднікаў выконвалі калектыўныя органы – рады старэйшын. У народа кікую ў Кеніі яны называліся «кіама». Сход кіама быў значна ў большай ступені падобны на сучасны суд. Старэйшыны займаліся высвятленнем акалічнасцяў здарэння, выслухоўвалі сведкаў і выносілі прысуд адносна наяўнасці ці адсутнасці віны. Аднак гэтак сама, як у выпадку з правадырамі ў леапардавай скуры, яны толькі прапаноўвалі дзеля вырашэння канфлікту пэўны памер кампенсацыі на карысць пацярпелага ці яго сваякоў. І гэтак сама яны не мелі магчымасці прымусіць каго-небудзь выконваць свой загад.

Трэба адзначыць, што медыяцыя як сродак вырашэння канфліктных сітуацый выкарыстоўваецца і сёння, але ў грамадствах з дзяржаўнай формай палітычнай сістэмы галоўную ролю адыгрываюць усё-ткі кадыфікаванае права і суды. Яны з’яўляюцца неабходнай умовай існавання дзяржавы. Дзяржаўнае права мае тры характэрныя рысы. Па-першае, толькі дзяржава мае права на законнае ўжыванне гвалту. Па-другое, дзяржава дае дакладнае вызначэнне асоб, упаўнаважаных гэты гвалт выконваць. Па-трэцяе, дзяржава імкнецца забяспечыць рэгулярнасць і прадказальнасць функцыянавання права.

Сацыяльнае расслаенне, характэрнае для грамадстваў, заснаваных на агракультуры або індустрыі, стварае спрыяльнае асяроддзе для пашырэння злачыннасці як сацыяльнай з’явы. Асноўная прычына – магчымасць захопу чужой маёмасці ўпотай (крадзеж) або гвалтам, у выніку нападу (рабаванне), які можа суправа-

джацца фізічнымі пашкоджаннямі ці нават забойствам. Пашырэнню злачыннасці паспрыяла стварэнне вялікіх паводле колькасці насельніцтва паселішчаў і палітычных адзінак з уласцівай ім ананімнасцю асабістага існавання. У гэтых умовах ранейшыя формы ўрэгулявання канфліктных сітуацый мелі абмежаваныя магчымасці ўздзеяння. Характэрнай асаблівасцю новых сістэм падтрымання кантролю, заснаваных на кадыфікаваным праве, стала надзвычайная жорсткасць прысудаў. Так, напрыклад, у адным з найстарэйшых помнікаў пісьмовага права, згаданых вышэй Законах Хамурапі, галоўным робіцца прынцып *таліёна*: пакаранне становіцца літаральным паўтарэннем нанесенай шкоды («вока за вока, зуб за зуб»), а не прынцып кампенсацыі. У некаторых выпадках дзейнічаў сімвалічны таліён – калі сын ударыў бацьку, то яму адразалі кісць рукі, г. зн. караўся той орган, з дапамогай якога было здзейснена злачынства.



*Пакаранні ў Асірыйскай дзяржаве*

Акрамя гэтага, уражвае колькасць злачынстваў, якія караліся смерцю. Сярод іх – шлюбная нявернасць, за якую вінаватых мужчыну і жанчыну звязанымі тапілі ў вадзе. Жанчына, якая дазволіла забіць свайго мужа, каб сысці з іншым мужчынам, каралася саджаннем на кол. Смяротны прысуд выносілі тым, хто ілжыва абвінавачваў у забойстве, чарадзействе. Такім самым чынам караўся крадзеж маёмасці дзяржавы і святароў. У той жа час, крадзеж маёмасці шараговых грамадзянаў мог быць кампенсаваны. Жорстка каралася марадзёрства на пажарах: вінаватага ў гэтым спальвалі ў тым самым агні. Характэрна, што дзяржава пераследавала не толькі тых, хто парушаў закон, але і тых, хто не выказваў прыхільнасці да гвалту, санкцыянаванага ёю:

ухіленне ад вайсковай службы цягнула за сабой наступствы, падобныя да пакарання за крадзеж. І гэта не выпадкова: звычайнаму чалавеку не ўласцівае імкненне караць ці забіваць да сябе падобнага.

У старажытных дзяржавах шырокамаштабнае ўжыванне гвалту дзеля падтрымання парадку нярэдка знаходзіла абгрунтаванне ў адпаведнай ідэалогіі. Ці не найбольш адкрыта яно выявілася ў творах прадстаўнікоў старажытнакітайскай філасофскай школы «Фа-цзя». Яе заснавальнік Шан Ян лічыў, што мэтай дзяржавы павінна быць вядзенне вайны, а яе забеспячэнне патрабуе развіцця вытворчасці збожжа. Таму ўсё ў дзяржаве павінна быць пабудаванае на жорсткай дысцыпліне. Натуральныя чалавечыя пачуцці, дабрыня і любоў да людзей, абвяшчаліся крыніцай правінаў.

Сапраўдная дабрачыннасць, паводле меркавання Шан Яна, можа грунтавацца выключна на пакараннях, галоўным чынам, смяротных. У дзяржаве трэба мець як мага больш пакаранняў і не вельмі шмат узнагарод. Пакаранні павінны быць максімальна жорсткімі, пры гэтым жорстка трэба караць за дробныя парушэнні, каб не было вялікіх. Абавязковай умовай падтрымання парадку ён лічыў узаемнае шпегаванне і даносы (таго, хто не данёс аб злачынстве, трэба было рассячы надвое). Гэта павінна было дапаўняцца кругавой парукай. У войску калі збаяўся адзін, трэба было караць пяцярых жаўнераў, сярод сялян, калі злачынства здзейсніў адзін, – усю сям'ю. Парады Шан Яна былі паспяхова рэалізаваныя першым імператарам Кітая – Цынь Шы-Хуандзі, які за кошт надзвычайнай, нечалавечай жорсткасці дамогся стварэння пад сваёй уладай адзінай, цэнтралізаванай краіны. З яго імём, дарэчы, звязваюць



*Вялікі Кітайскі мур*



*Чэзарэ Бекарыя – ініцыятар адмены смяротнага пакарання*

будаўніцтва Вялікага Кітайскага муру – нібыта з мэтай абароны імперыі ад паўночных варвараўнамадаў. Але, калі ўважліва ўгледзецца, то можна заўважыць, што мур быў прызначаны дзеля абароны з абодвух бакоў: магчыма ў гэтым выпадку не меншае значэнне надавалася таму, каб прадухіліць масавыя ўцёкі тых, хто не жадаў жыць паводле ўведзеных імператарам законаў.

Гісторыя грамадстваў з дзяржаўнай сістэмай палітычнага кіравання сведчыць, што маштабы злачыннасці не залежаць ад узроўню жорсткасці пакаранняў. Упершыню такую думку ў сярэдзіне XVIII ст. выказаў італьянскі юрыст і філосаф Чезарэ Бекарыя, які выступіў супраць смяротнага пакарання і катаванняў. Пад уплывам яго думак у 1786 годзе смяротнае пакаранне было скасавана ў Вялікім княстве Тасканскім.



*Карта пашырэння смяротнага пакарання ў сучасным свеце*

Пазней гэта адбылося ў Рымскай рэспубліцы (1849), Венесуэле (1863), Сан-Марына (1865), Партугаліі (1867), Бразіліі (1876). Масавая адмова ад прымянення смяротнага пакарання адносіцца да другой паловы XX ст. Сярод краін, якія гэта зрабілі, практычна ўсе дзяржавы Еўропы, Амерыкі (з выняткам ЗША і Кубы), значная частка дзяржаў Афрыкі і некаторыя краіны Азіі. На сённяшні дзень смяротнае пакаранне ўжываецца толькі ў 58 краінах, у 102 яно ліквідаванае юрыдычна, яшчэ ў 32 краінах не прымяняецца больш за 10 гадоў. У ЗША яно забаронена ў 18 штатах з 51.

Разам з тым у краінах, дзе яшчэ існуе смяротнае пакаранне – а гэта, перадусім, Кітай, Індыя, Інданэзія, Пакістан, Бангладэш, Іран, – жыве сама меней палова насельніцтва планеты. Часцей за ўсё яно ўжываецца ў Кітаі, Іране, Саудаўскай Аравіі, Іраку і Пакістане. Колькасць пакараных смерцю ў Паўночнай Карэі і В'етнаме дакладна невядомая, але мяркуецца, што яна таксама вельмі значная.

## Падсумаванне

На працягу сваёй гісторыі чалавецтва выпрацавала вялікую колькасць спосабаў падтрымання парадку ў грамадстве. Грамадствы, якія знаходзіліся на дадзяржаўнай ступені палітычнай арганізацыі, былі арыентаваныя ў большай ступені на ўрэгуляванне канфліктаў, чым на высвятленне вінаватасці і пакаранне тых, хто парушаў правілы. Станаўленне старажытных цывілізацый суправаджалася ўвядзеннем надзвычай жорсткіх пакаранняў, у тым ліку смяротнага. Нягледзячы на тое, што ў апошнія 100–150 гадоў вялікая колькасць дзяржаў адмовілася ад яго прымянення, большасць насельніцтва планеты ўсё яшчэ жыве пад яго пагрозай.

# Раздзел 9.
# Геаграфія традыцыйных формаў шлюбу і сямейных стасункаў

*Вызначэнне і функцыі шлюбу і сям'і.*
*Правіла заключэння шлюбаў. Універсальнае табу інцэсту.*
*Экзагамія і эндагамія.*
*Класіфікацыйныя формы шлюбных саюзаў: крос-кузенны шлюб, сарарат, левірат.*
*Эканамічныя аспекты заключэння шлюбу. Калым. Адпрацоўкі за нявесту. Пасаг. Маёмасны ўзаемаабмен.*
*Тыпы сям`і паводле лакалізацыі месцажыхарства.*
*Гістарычныя тыпы структуры сем'яў. Вялікая сям'я.*
*Нуклеарная сям'я*
*Колькасць сужэнцаў у сям'і. Манагамія. Полігінія. Паліандрыя.*

***Вызначэнне і функцыі шлюбу і сям'і***

Кожнае грамадства, незалежна ад узроўню тэхналагічнага развіцця, каб не спыніць свайго існавання, павінна арганізаваць фізічнае і культурнае аднаўленне сваіх прадстаўнікоў. Іншымі словамі, грамадства мусіць стварыць умовы дзеля таго, каб нараджаліся дзеці і каб у выніку выхавання і навучання яны зрабіліся паўнавартаснымі чальцамі грамадства. Універсальным сродкам і асяроддзем, што стварае такія ўмовы, з'яўляюцца шлюб і сям'я. Шлюб – гэта сукупнасць правілаў і цырымоній, у адпаведнасці з якімі ствараюцца сем'і. Няма ніводнага народа на Зямлі, у якога навукоўцы не выявілі б сям'і. Яе неабходнасць прадыктаваная самімі біялагічнымі асаблівасцямі чалавека: няма іншага віду на нашай планеце, выжыванне нашчадкаў якога было б настолькі працяглы час залежнае ад паводзінаў бацькоў – ад іх гадавання, выхавання, навучання. Разам з тым, даць вызначэнне сям'і вельмі

няпроста. У нашым сённяшнім разуменні сям'я – гэта невялікая група людзей, звычайна, ад дзвюх да чатырох асоб, якая складаецца з мужа і жонкі, з дзецьмі ці без іх, аднаго з бацькоў і дзіцяці і г. д. А калі, напрыклад, я пытаўся ў сваіх малійскіх студэнтаў, што для іх значыць сям'я, яны мне былі гатовыя пералічыць некалькі дзясяткаў ці нават соцень сваякоў, стасункі паміж якімі былі б не менш інтэнсіўнымі і рэгламентаванымі, чым у нашых маленькіх сем'ях. Якое б вызначэнне сям'і мы ні стараліся даць сёння, заўсёды знойдзецца нешта, што будзе ставіць яго пад сумненне. Разгледзім, напрыклад, асноўныя функцыі сям'і.



*Сучасная малійская сям'я*

Звычайна на першае месца ставяць ролю сям'і ў якасці рэгулятара сэксуальных стасункаў: сем'і ствараюцца ў адпаведнасці з правіламі, якія вызначаюць, хто з кім можа мець сэксуальныя кантакты. Іншымі словамі, гэта аб'яднанне людзей, якія атрымалі грамадскі дазвол на сэксуальныя стасункі. Звычайна ён замацоўваецца з дапамогаю шлюбу – правілаў і цырымоніі заснавання сэксуальнага саюза (вяселля). Аднак сёння значная колькасць сем'яў стварaецца без якой-небудзь непасрэднай грамадскай санкцыі. Грамадства ў гэтым выпадку дазваляе іх тым, што не забараняе. Гэтыя сітуацыі памылкова называюць грамадзянскім шлюбам. Але ў адпаведнасці з першасным значэннем гэтага паняцця грамадзянскім павінен лічыцца той шлюб, які зафіксаваны выключна дзяржаўнымі органамі ўлады без удзелу царквы. Да гэтага трэба дадаць, што няпоўныя сем'і, якія складаюцца з аднаго з біялагічных бацькоў і дзіцяці, не ставяць сабе за мэту рэгуляванне сэксуальных стасункаў.

Па-другое, функцыяй сям'і з'яўляецца нараджэнне дзяцей. Ад-

нак значная частка сучасных сем'яў лічыць, што гэта перашкаджае самарэалізацыі і паспяховай кар'еры сужэнцаў і адкладвае ці ўвогуле адмаўляецца ад выканання гэтай функцыі. А ў выпадку аднаполых сем'яў, гэта, прынамсі, на сённяшні дзень, папросту немагчыма фізіялагічна.

Па-трэцяе, сям'я стварае неабходныя матэрыяльныя, выхаваўчыя і эмацыйныя ўмовы для гадавання дзяцей. Ну, а калі дзяцей няма, то гэтая функцыя неактуальная.

Па-чацвёртае, сям'я выконвае функцыю сацыяльнай адзінкі, у межах якой арганізавана вытворчасць і спажыванне тавараў і паслуг. Іншымі словамі, сям'я – гэта сумесная гаспадарка, якая прадугледжвае супольнае пражыванне. Аднак у сённяшніх умовах падвышанай працоўнай мабільнасці чальцы сям'і могуць доўгі час жыць не толькі ў розных мясцовасцях, але і ў розных краінах, што выключае магчымасць стварэння сумеснай гаспадаркі нават на ўзроўні супольнага спажывання.

Па-пятае, функцыяй сям'і доўгі час лічылася магчымасць перадачы сацыяльнага статусу. Асабліва істотна гэта было ў тых грамадствах, дзе вертыкальная сацыяльная мабільнасць была зведзеная да мінімуму. У сучасных умовах гэтая функцыя менш значная. Хутчэй трэба весці гаворку не столькі пра аўтаматычны трансфер статусу, колькі пра забеспячэнне пэўных стартавых умоваў кар'ернага росту.

Калі ўсё гэта падсумаваць, то адзінае магчымае вызначэнне сям'і будзе наступным: сям'я – гэта група сама менш з дзвюх асоб, для якіх іх асабістыя стасункі значаць больш, чым адносіны з усімі іншымі людзьмі. Ці значыць гэта, што сёння сям'я перастае выконваць свае асноўныя функцыі рэгулявання сэксуальных стасункаў, нараджэння і выхавання дзяцей? Ці маюць рацыю тыя футуролагі, якія сцвярджаюць, што крызіс сучаснай сям'і прывядзе да знікнення шлюбу як сацыяльнага інстытута? Безумоўна, не. Пра гэта сведчыць надзвычайная культурная і гістарычная разнастайнасць гэтага феномена. Пры гэтым ён дае прыклады сацыяльных нормаў, якія з'яўляюцца ці не адзінымі ўніверсальнымі правіламі для ўсіх народаў як у мінулым, так і сёння.

***Табу інцэсту***

Гаворка ідзе аб правілах заключэння шлюбаў, дакладней, пра тое, паміж кім сэксуальныя стасункі катэгарычна забароненыя. Гэта правіла называюць табу інцэсту. Яно азначае, што шлюб і сэксуальныя стасункі забароненыя паміж блізкімі сваякамі, у першую чаргу паміж бацькамі і дзецьмі, братамі і сёстрамі. Яно не толькі мае ўніверсальны характар: гэта значыць, што ў свеце няма народа, у якога такога табу не было б. Парушэнне гэтага правіла жорстка каралася і караецца паўсюль. Ёсць, аднак, тры выняткі, але яны датычацца не народаў, а асобных сем’яў: у старажытных егіпцян, інкаў і гавайцаў у кіруючых дынастый існавала правіла, што браты бралі шлюбы са сваімі сёстрамі. Палітычны сэнс парушэння табу інцэсту ў гэтым выпадку абсалютна зразумелы: улада пры любых абставінах павінна заставацца пад кантролем адной асобна ўзятай сям’і.



*Сям’я егіпецкага фараона*

Ці не самае дзіўнае ў выпадку з табу інцэсту – гэта тое, што яго ўзнікненне да сённяшняга дня з’яўляецца аб’ектам навуковых дыскусій, і, шчыра кажучы, нягледзячы на вялікую колькасць гіпотэз, ніводная з іх не здольная цалкам патлумачыць карані яго паходжання. Ці не найбольш пашыранае меркаванне зводзіцца да таго, што ад шлюбаў блізкіх сваякоў нараджаюцца дзеці з генетычнымі хваробамі. Гэта пацвярджаюць і сучасныя генетычныя даследаванні. Праблема, аднак, у тым, што негатыўныя наступствы выяўляюцца не адразу. Дзеля гэтага трэба займацца мэтанакіраванымі назіраннямі на працягу вялікай колькасці пакаленняў, што наўрад ці можна было б сабе ўявіць у дачыненні да народаў, якія не ведалі пісьмовасці.



*Скульптурны партрэт Клеапатры*

Існуе думка, што забарона інцэсту – вынікназіранняў за гадоўляй хатняй жывёлы, якая размнажаецца хутчэй за чалавека. У гэта можна было б паверыць, калі б гэтае правіла не было распаўсюджаным сярод паляўнічых і збіральнікаў. Да гэтага трэба дадаць, што ёсць шмат прыкладаў, калі блізкасваяцкія шлюбы, наадварот, спрыяюць максімальнай канцэнтрацыі пазітыўных якасцяў. Царыца Клеапатра, ахвярамі прыгажосці, розуму і талентаў якой сталі «ўладары свету» Юлій Цэзар і Марк Антоній, была нашчадкам дзясятага пакалення інцэстных шлюбаў. Падобнае генетычнае паходжанне мела і Неферціці, скульптурная выява якой лічыцца адным з эталонаў жаночай прыгажосці.

Існуе таксама канцэпцыя, згодна з якой пазбяганне інцэсту натуральным чынам уласцівае чалавеку. Яно з'яўляецца вынікам таго, што паміж тымі, хто з дзяцінства знаходзіўся ў межах невялікай замкнёнай групы, не ўзнікае сэксуальнай цягі. Гэта пацвярджаецца шэрагам канкрэтных прыкладаў. У некаторых карэнных народаў Тайваня існаваў звычай заключэння шлюбаў у дзіцячым узросце, пры гэтым «маладая жонка» выхоўвалася ў сям'і «мужа». Вынікам станавіўся нізкі ўзровень нараджальнасці і вялікая колькасць выпадкаў шлюбнай нявернасці. Іншы прыклад – ізраільскія абшчыны «кібуцы», для якіх характэрнае калектыўнае выхаванне дзя-



*Сумеснае выхаванне дзяцей у кібуцы*

цей. Даследаванні сведчаць, што той, хто выгадаваўся ў кібуцы, рэдка калі ўступае ў шлюб з асобай з таго самага кібуца.

Згодна яшчэ з адной канцэпцыяй, табу інцэсту ёсць вынікам таго, што на працягу большай часткі гісторыі чалавецтва сацыяльны статус асобы і сацыяльныя адносіны цалкам вызначаліся сістэмай сваяцкіх стасункаў. З аднаго боку, няма ніводнай сістэмы сваяцтва, якая прадугледжвала б пазіцыі для таго, хто народжаны ў выніку інцэстных стасункаў бацькоў і дзяцей. Сапраўды, напрыклад, хлопчык, народжаны ад шлюбу бацькі і дачкі, – ён хто? Унук ці сын? Крытыкі гэтага погляду кажуць, што ён наўрад ці нешта тлумачыць. Бо калі б інцэстныя адносіны былі дазволеныя, узніклі б і адпаведныя пазіцыі ў сістэмах сваяцкіх класіфікацый. З іншага боку, сцвярджаецца, што ад старажытнасці людзі імкнуліся выкарыстоўваць сваяцкія адносіны дзеля ўмацавання сеткі сацыяльных сувязяў. Адсюль і імкненне выдаваць дачок замуж як мага далей з гледзішча сваяцкіх і прасторавых адносінаў. Гэтая думка выглядае дастаткова слушнай, але яна не здольная патлумачыць, чаму табу інцэсту паўсюль так жорстка пераследуецца.

І, нарэшце, яшчэ адна канцэпцыя, якая разглядае табу інцэсту як сродак абмежавання сэксуальнага спаборніцтва. Рэч у тым, што ў людзей, у адрозненне ад большасці сысуноў (млекакормячых), сэксуальная актыўнасць не мае дакладна выяўленых сезонных спадаў і ўздымаў. Таму праблема абмежавання спаборніцтва мае перманентны характар. Правілы заключэння шлюбаў шмат у якіх народаў былі арыентаваныя на тое, каб праблемы спаборніцтва ўвогуле не існавала. Рашэнне наконт шлюбу прымалася не тымі, хто яго браў, а бацькамі, старшынямі сваяцкіх кланаў і да т. п. Нярэдка шлюбы заключаліся ў дзяцінстве ці нават да нараджэння будучых сужэнцаў, па дамоўленасці бацькоў. А ў выпадку аўстралійскіх абарыгенаў спрацоўвала сістэма, якая цалкам вызначала склад будучай сям'і амаль без удзелу волі людзей. Яна была пабудаваная на прынцыпе строгай экзагаміі, вядомай вялікай колькасці іншых народаў. Экзагамія – гэта правіла, якое забараняе шлюбныя стасункі ў межах пэўнай групы. У аўстралійцаў група роднасных абшчын утварала племя, якое дзялілася на дзве экзагамныя паловы. У дадатак да гэтага, кожная палова падзялялася на класы, а яны, у сваю

чаргу, – на субкласы. Шлюб заключаўся паміж прадстаўнікамі дакладна вызначаных субкласаў з розных палоў, і таму магчымасці індывідуальнага выбару і спаборніцтва былі зведзены да мінімуму. З цягам часу гэтая сістэма перажыла эрозію, у тым ліку ў выніку рамантычнага кахання, аж пакуль экзагамія не звузілася да памераў звычайнай нуклеарнай сям'і.

Шчыра кажучы, цяжка аддаць перавагу якой-небудзь адной з гэтых тэорый. Хутчэй за ўсё ніводная не адпавядае таму, што было ў сапраўднасці. І ўжо не першы раз можна толькі пашкадаваць, што ў нас няма машыны часу, каб даведацца, якім чынам узнікла адзінае ўніверсальнае правіла, вядомае ўсім без выключэння народам свету.

### *Экзагамія і эндагамія*

Табу інцэсту і экзагамія – далёка не адзіныя правілы заключэння шлюбаў. Правілам, сіметрычным экзагаміі, з'яўляецца эндагамія, якая забараняе ствараць сям'ю па-за межамі пэўнай сацыяльнай групы. Яно характэрнае для грамадстваў, заснаваных на каставай форме сацыяльнай стратыфікацыі. Больш за тое, менавіта эндагамія з'яўляецца неабходнай умовай яе існавання. Асабліва гэта датычыць кастаў, якія знаходзіліся на вяршыні сацыяльнай іерархіі. Выкананне правіла эндагаміі забяспечвае іх выключны доступ да ўлады, багацця і прэстыжу. Дарэчы, інцэст паміж братамі і сёстрамі, прадпісаны ў сем'ях уладароў старажытнага Егіпта, дзяржаве інкаў і на Гавайскіх выспах, ёсць таксама прыкладам выключна вузкай эндагаміі. У класавым грамадстве эндагамія як суровае правіла знікае, але існуе пэўная заканамернасць таго, што шлюбы часцей за ўсё заключаюцца паміж людзьмі прыкладна аднолькавага сацыяльнага і маёмаснага статусу. Такую з'яву называюць яшчэ гомагаміяй, і яна, безумоўна, спрые замацаванню сацыяльнай няроўнасці.

### *Крос-кузенны шлюб. Левірат і сарарат*

Больш рэдкімі правіламі выбару сужэнцаў з'яўляецца наданне перавагі шлюбам паміж стрыечнымі братамі і сёстрамі (кузенамі). Шмат у якіх грамадствах, напрыклад, у Кітаі, Карэі, на Філіпінах,

значнай частцы штатаў у ЗША, такія шлюбы разглядаюцца як форма інцэсту, і яны забароненыя законам. У той жа час, у шэрагу карэнных народаў Аўстраліі, Амерыкі і Акіяніі яны лічыліся найбольш пажаданымі. Пры гэтым існавала адрозненне паміж крос-кузеннымі і орта-кузеннымі шлюбамі, якія ўзаемна адзін адзін выключалі. Пры крос-кузенным шлюбу дапускалася стварэнне сям'і дзецьмі сястры бацькі, з аднаго боку, і брата маці, з другога, але забараняліся шлюбы паміж дзецьмі брата бацькі і сястры маці (орта-кузенны варыянт). Пры гэтым у абодвух варыянтах ступень генетычнага сваяцтва аднолькавая. Орта-кузенны шлюб сустракаецца ў некаторых народаў Паўночнай Афрыкі і мае сэнс дзеля захавання маёмасці ў межах адной сям'і. У цэлым у сённяшнім свеце крос-кузенныя шлюбы (паміж стрыечнымі і траюраднымі сваякамі) складаюць да 10% усіх шлюбаў, а ў некаторых краінах, напрыклад, у Судане, Емене, Афганістане – больш за 40%, у Пакістане і Малі – больш за 50%.

Яшчэ адным правілам узяцця шлюбу з'яўляецца левірат і сарарат. Левірат азначае абавязак брата нябожчыка ўзяць у жонкі яго ўдаву. Практычны сэнс левірату палягае ў тым, што ў грамадствах, дзе жанчына не можа адыгрываць самастойнай сацыяльнай і эканамічнай ролі, левірат стварае ёй і яе дзецям гарантыі абароны і дабрабыту. Не выпадкова, што левірат збольшага распаўсюджаны ў рэгіёне Бліжняга і Сярэдняга Усходу, у Паўночнай Афрыцы, Інданезіі, г. зн. там, дзе дамінуе іслам.

Сіметрычным левірату з'яўляецца правіла сарарату: калі ўдавец можа ажаніцца з сястрой нябожчыцы або з іншай незамужняй жанчынай з яе сям'і. Сэнс сарарату менш відавочны. Звычайна лічыцца, што сарарат забяспечвае трываласць сваяцкіх сувязяў паміж кланамі, заснаваным падчас першага шлюбу. Звяртаюць увагу і на тое, што сарарат стварае больш камфортныя ўмовы для дзяцей, якія нарадзіліся ад першай жонкі: сястра нябожчыцы будзе лепшай мачахай, чым якая-небудзь іншая жанчына. У адрозненне ад левірату, сарарат менш пашыраны. Ён зафіксаваны ў інуітаў, індзейцаў сіу, курдаў, асобных кастаў у Індыі.

### *Эканамічныя аспекты шлюбу*

У пераважнай большасці грамадстваў шлюб азначае пераход асобы – часцей нявесты, радзей жаніха – з адной сваяцкай групы ў другую. Таму ён разглядаецца як сродак умацавання сацыяльных сувязяў і суправаджаецца перадачай пэўнай маёмасці ці паслуг. Гэта працэдура мае на мэце зацвердзіць і прадэманстраваць узровень узаемнага даверу і згоды.

У еўрапейскай і, у тым ліку, беларускай традыцыі звычайна нявеста мела пасаг – гэта значыць пэўную маёмасць, найчасцей рухомую (свойская жывёла, адзенне, хатняе начынне і г. д.) ці грошы, якія пераходзілі ва ўласнасць жаніха ці / і ягонай сям'і. Пры гэтым у беларусаў пасаг у новай сям'і мог складаць асобную жаночую маёмасць. У выпадку смерці мужа ці разводу жанчына магла вярнуцца з ім у сваю бацькоўскую сям'ю. А ў ірландцаў, напрыклад, атрымальнікам пасагу з'яўляўся бацька жаніха. Гэтая маёмасць лічылася кампенсацыяй за зямлю, якую бацька выдзяляў новай сям'і, а атрыманы пасаг выкарыстоўваўся ў якасці пасагу для незамужняй сястры жаніха. Як ні дзіўна, звыклы для нас звычай – далёка не самы пашыраны ў свеце. Найчасцей ён звязваецца з грамадствамі, заснаванымі на сельскагаспадарчай апрацоўцы зямлі, але характэрны для іх далёка не ўсіх. Галоўным чынам ён тыповы для еўрапейскіх народаў, а таксама некаторых народаў Індыі.



*У італьянцаў, як і шэрагу іншых народаў Еўропы, на пасаг выраблялі адмысловыя куфры – касанэ*

Нашмат больш пашыранаю з'яўляецца плата за нявесту, якую часта абазначаюць цюркскім словам *калым*. Згодна з антрапалагічнай статыстыкай, яна сустракаецца ў 46% народаў свету, пры гэтым на

афрыканскім кантыненце – да 82%. Яна палягае ў перадачы маёмасці або грошай ад жаніха ці яго сям'і ў сям'ю нявесты. Пры гэтым калым не зусім сіметрычны пасагу, бо атрымальнікам заўсёды была не нявеста ці новая сям'я, а выключна яе бацькі. Праўда, колішні кіраўнік Туркменістана Сапармурад Ніязаў загадаў спаганяць калым з замежнікаў на карысць дзяржавы ў памеры 50 тысяч долараў, але гэта рэдкае выключэнне з правілаў.

Плата за нявесту шырока распаўсюджана не толькі ў Афрыцы, але і ў шмат якіх краінах Азіі. Ці не найбольшы сваім памерам калым сёння выплачваюць у Папуа – Новай Гвінеі, дзе ён можа даходзіць да 50–100 тыс. долараў, і ў Тайландзе – у некаторых выпадках да 300 тыс. долараў. Найбольш «каштоўнымі» лічацца нявесты, якія маюць высокі сацыяльны статус, добрую адукацыю або, напрыклад, з'яўляюцца пераможцамі конкурсаў прыгажосці. Традыцыйна калым выплачвалі не грашыма, а нейкімі рэчамі, якія лічыліся каштоўнымі: у пастаралістаў – найчасцей свойскай жывёлай, у іншых народаў – зброяй, каштоўным адзеннем і г. д.



*Калым на Вануату, Акіянія*

З гледзішча еўрапейскай традыцыі калым выглядае як набыццё жанчыны, якое прыніжае яе годнасць. Але гэта, напраўду, не больш, чым стэрэатып успрымання. Дарэчы, з іншага боку, пасаг можа выглядаць як сведчанне, што еўрапейскія дзяўчаты такой якасці, што трэба прыплачваць, каб нехта ўзяў іх замуж. Жарт, вядома. Калым трэба разглядаць не як куплю-продаж, а як падарунак, накіраваны на замацаванне сваяцкіх адносінаў паміж сем'ямі жаніха і нявесты. У пэўным сэнсе гэта кампенсацыя за страту працоўных рук, калі ўлічваць не толькі нявесту, але і дзяцей, якія народзяцца і будуць належаць да сям'і жаніха. Лічыцца таксама, што калым з'яўляецца пэўнай гарантыяй правоў жанчыны ў яе новай сям'і і садзейнічае трываласці сямейных адносінаў, змяншае магчымасці разводу. Нельга не адзначыць таксама ролю калыму ў якасці сродку пад-

трымання гомагаміі і сацыяльных межаў групы, якая мае перавагу ў доступу да багацця, улады і прэстыжу.

У дастаткова вялікай колькасці выпадкаў замест калыму існаваў звычай адпрацовак за нявесту. Ён зафіксаваны ў 14% народаў свету і часцей за ўсё сустракаецца ў Афрыцы. Адпрацоўкі за нявесту вядомыя ў адносна небагатых народаў – там, дзе перадача маёмасці можа стаць непераадольнай перашкодай на шляху стварэння новай сям'і. Разам з тым, менавіта яны ці не ў большай ступені спрыяюць усталяванню трывалых адносінаў паміж двума сямейнымі кланамі. Згодна з традыцыяй, жаніх – сам ці разам з бліжэйшымі сваякамі – пераходзіў на працу ў сям'ю нявесты. Тэрмін адпрацоўкі мог доўжыцца ад некалькіх тыдняў да нават некалькіх гадоў.

Дастаткова рэдка (каля 6% выпадкаў) заключэнне шлюбу суправаджалася абменам падарункамі паміж дзвюма сем'ямі ў прыкладна роўным памеры. Гэта было характэрна для некаторых індзейскіх народаў Амерыкі, а таксама мела месца ў Афрыцы і Акіяніі. Падобны звычай (адначасова з пасагам) існаваў, дарэчы, і ў беларусаў у XIX ст. Пры гэтым рэгламентаваўся не толькі памер узаемных падарункаў, але і тое, хто, каму і што павінен быў падараваць.

### *Тыпы сям`і паводле лакалізацыі месцажыхарства*

У сучасным грамадстве, у тым ліку беларускім, лічыцца, што маладая сям'я ад самога пачатку павінна весці самастойнае існаванне. Гэта значыць – жыць асобна як ад бацькоў жаніха, так і ад бацькоў нявесты. Такі падыход разглядаецца як найбольш аптымальны для стварэння новай сям'і. Але з пункту погляду разнастайнасці шлюбных і сямейных адносінаў, ён ці не адзін з самых экзатычных. Згодна з антрапалагічнай статыстыкай, не больш як у 5% народаў свету такі варыянт лічыўся прымальным. У пераважнай большасці выпадкаў абавязковым было тое, што маладая сям'я сялілася ў бацькоўскім доме жаніха (да 70%). У XIX ст. гэта было тыповым і для беларусаў. Парушэнне гэтага правіла магло мець месца, але сацыяльны статус мужа ў такай сітуацыі (прымак) лічыўся незайздросным. Аднак у дастаткова вялікай колькасці народаў (каля 13%) варыянт прымацтва разглядаўся як адзіна магчымы. Часцей за ўсё

ён сустракаўся ў грамадствах, заснаваных на ручной апрацоўцы зямлі – там, дзе існаваў улік сваяцтва па матчынай лініі. Апроч ужо вядомых іракезаў, ён быў пашыраны, напрыклад, у наяраў на поўдні Індыі і мінагкабаў у Інданэзіі.

Да ліку ці не найбольш своеасаблівых варыянтаў адносіцца так званы аванкулакальны. У гэтым выпадку новая сям'я селіцца ў доме дзядзькі жаніха па кудзелі (брата маці). Гэта звязана са звычаем аванкулату, асаблівымі адносінамі паміж дзядзькам і пляменнікам. Яны ўключалі выхаванне пляменніка ў сям'і дзядзькі ў падлеткавым узросце. Падобныя звычаі сустракаліся не часта – не больш як у 4% народаў, у тым ліку ў апачаў у Паўночнай Амерыцы, чамора на Марыянскіх выспах у Ціхім акіяне, таіна на Карыбах. Навукоўцы звязваюць аванкулакальнасць з улікам сваяцтва па матчынай лініі.

Пэўную волю маладой сям'і дае традыцыя, якая дазваляе выбіраць паміж сям'ёй жаніха ці сям'ёй нявесты. Але ў кожным выпадку гэта не дае магчымасці жыць асобна. Такі варыянт тыповы для 9% народаў свету.

### *Колькасць сужэнцаў*

Правілы заключэння шлюбаў звычайна вызначаюць, колькі людзей могуць ствараць сям'ю. У еўрапейскіх грамадствах – у тым ліку ў беларусаў – лічылася, што адначасова (у ідэале да канца жыцця) гэта могуць быць толькі адзін мужчына і толькі адна жанчына. Такое правіла мае назву *манагамія*. Яе паходжанне часта звязваюць з пашырэннем хрысціянства, якое атрымала ідэю манагамнай сям'і ў спадчыну ад іўдаізму, але вядома, што манагамія была характэрнай для старажытных грэкаў і рымлян яшчэ задоўга да ўзнікнення хрысціянства. Згодна з антрапалагічнай статыстыкай, з 1231 народа манагамнымі з'яўляюцца толькі 186 (15%). Пры гэтым трэба разумець, што рэальная колькасць людзей, якія прытрымліваюцца гэтага правіла, будзе значна большай.

Манагамія, разам з тым далёка не адзіны і не самы тыповы варыянт колькасці сужэнцаў. Уступаць у шлюб адначасова з больш як адной асобай іншага полу дазваляецца ў пераважнай большасці народаў свету. Такі варыянт мае назву *палігáмія*, або мнага-

шлюбнасць. У сваю чаргу, ён прадугледжвае магчымасць двух варыянтаў – полігінíі (мнагажэнства) і паліáндрыі (мнагамужжа).

Тая ж статыстыка сведчыць, што да 84% народаў свету дазваляе мужчыне мець адначасова больш за адну жонку. Такім чынам, полігінія – самы пашыраны варыянт шлюбу ў людзей. Гэта, аднак, не азначае, што ў гэтых грамадствах усе мужчыны пагалоўна маюць некалькі жонак. Нават у тых 588 з 1041 грамадствах, дзе найбольш прадстаўленыя палігінныя шлюбы, не больш як 40% жанатых мужчынаў мае дзвюх і болей жонак. На сённяшні дзень полігінія распаўсюджаная ў большасці ісламскіх краін (з выняткам Турцыі, Туніса, былых савецкіх рэспублік Цэнтральнай Азіі і Азербайджана), а таксама ў большасці краін Афрыкі. У некаторых краінах – напрыклад, Індыі, Малайзіі – полігінія дазволеная для мусульман. У мінулым полігінія шырока сустракалася і ў іншых рэгіёнах, напрыклад, у Кітаі, а таксама сярод карэннага насельніцтва абедзвюх Амерык, у Акіяніі – г. зн. практычна амаль ва ўсім свеце. Ёсць звесткі, што мнагажэнства сустракалася і сярод усходніх славян да прыняцця хрысціянства, у тым ліку сярод радзімічаў. Рэгіёнам найбольшай інтэнсіўнасці палігінных шлюбаў сёння лічацца Заходняя трапічная і Экватарыяльная Афрыка.



*Палігінная сям’я ў Малайзіі*

Паходжанне полігініі да гэтага часу з’яўляецца аб’ектам дыскусій. Вядома, што статыстычна хлопчыкаў нараджаецца на 3% больш за дзяўчат. Але ў шлюбным узросце суадносіны змяняюцца не на карысць хлопцаў. Гэта абумоўлена, у тым ліку, тым, што хлопцы ў большай ступені звязаны з рызыкоўнымі для жыцця заняткамі: паляваннем, рыбалоўствам у адкрытым моры, вайсковай службай

і г. д. У некаторых народаў шлюбныя звычаі ствараюць штучны дэфіцыт жаніхоў за кошт усталявання розніцы шлюбнага ўзросту: у хлопцаў ён набліжаецца да 30 гадоў, у той час як сярод дзяўчат настае значна раней. Шмат якія даследчыкі звязваюць выключнае пашырэнне палігініі ў Афрыцы з асаблівасцямі ручной апрацоўкі зямлі, у якой жанчыны адыгрываюць галоўную ролю. Канцэнтрацыя жаночых рук у адной гаспадарцы мае лепшы эканамічны эфект. Гэта, безумоўна, так, але палігінія добра вядомая таксама сярод народаў, якія наогул не займаліся апрацоўкай зямлі. Некаторыя даследчыкі звязваюць афрыканскую палігінію з наступствамі гандлю нявольнікамі: вывозілі пераважна мужчынаў, а іх дэфіцыт кампенсаваўся мнагажэнствам. Але зноў-такі палігінія вядомая і там, дзе гандлю нявольнікамі не было.

Агульным для ўсіх грамадстваў, дзе палігінія дазволеная, з'яўляецца тое, што яна ўспрымаецца як паказчык высокага сацыяльнага статусу. Тут ёсць два варыянты суадносінаў. З аднаго боку, як ужо ў вядомым прыкладзе з меланезійскімі «біг мэнамі», палігінія з'яўляецца спосабам дасягнення грамадскай павагі за кошт павелічэння прадуктыўнасці гаспадаркі і пашырэння кола тых, каго запрашалі на пачастунак. З другога боку, палігінія ёсць сродкам выяўлення высокага сацыяльнага статусу, звязанага з багаццем, бо ўтрыманне некалькіх жонак, бясспрэчна, яго патрабуе. Пры гэтым павагай карыстаюцца не толькі мужчына, але таксама жанчыны і дзеці ад такога шлюбу. Вядомыя прыклады, калі палігінія забяспечвае палітычную стабільнасць. Кароль невялікай дзяржавы Свазіленд на поўдні Афрыкі Саўхуза II знаходзіўся пры ўладзе 64 гады. Ён меў больш за 200 жонак, кожная з якіх прадстаўляла пэўны сваяцкі клан, і кароль такім чынам быў адначасова сваяком усяго насельніцтва краіны.

Трэба падкрэсліць, асабліва для еўрапейцаў і беларусаў, што не толькі ўтрыманне, але і кіраванне палігіннай сям'ёй – няпростае выпрабаванне для мужчыны. Гэта датычыць праблемы ўрэгулявання адносінаў паміж некалькімі жонкамі адначасова. У тых грамадствах, дзе палігінія ёсць даўняй традыцыяй, выпрацаваны розныя механізмы зніжэння псіхалагічнага напружання на глебе рэўнасці. Па-першае, гэта іерархія статусу жанчын у залежнасці ад часу

ўступлення ў шлюб. Першая жонка становіцца галоўнай. Больш за тое, у шэрагу выпадкаў яна, а не муж, вырашае, хто стане яго дадатковай жонкай. Іншымі словамі, яна падбірае асоб, якіх можа лёгка сабе падпарадкаваць. Па-другое, гэта так званая сараральная полігінія: калі шлюб бяруць з некалькімі сёстрамі. Іерархія ў гэтым выпадку выбудоўваецца натуральным шляхам, у залежнасці ад узросту. Па-трэцяе, гэта паасобнае пражыванне: кожная жонка жыве ў асобным будынку. Як кажуць, у гэтай сітуацыі, больш істотна дзяліць не мужа, а кухню.

Сучасныя даследаванні сведчаць, што полігінія не спрыяе паспяховаму эканамічнаму развіццю. Рэч у тым, што вялікія сем'і патрабуюць вялікіх выдаткаў, а гэта не дазваляе ашчаджаць сродкі і ўкладаць іх у якасці інвестыцый. Полігінія абумоўлівае вялікі прырост насельніцтва, дамінаванне ў яго структуры дзяцей і падлеткаў, што павялічвае нагрузку на людзей працаздольнага ўзросту. Забарона полігініі пазітыўна адбіваецца на эканамічным развіцці: у прыватнасці, павялічвае памер валавога ўнутранага прадукту (да 170%).

### *Паліандрыя*

Паліандрыя, або мнагамужжа, – шлюбны звычай, сіметрычны полігініі, але сустракаецца ён вельмі рэдка. Згодна з найноўшымі даследаваннямі, згадкі пра паліандрыю зафіксаваныя ў прыблізна 50 народаў свету, у тым ліку ў Індыі, Непале, а таксама ў Тыбеце і сярод некаторых народаў Афрыкі і Амерыкі. Паходжанне і практычны сэнс паліандрыі ў паасобных народаў адрозніваецца. Адзін з найбольш вядомых прыкладаў – народ тода на поўдні Індыі. Тода былі пастаралістамі. Як і ў шмат якіх іншых такіх народаў, перавага ў іх аддавалася нараджэнню хлопчыкаў, бо менавіта мужчыны адыгрывалі галоўную ролю ў жывёлагадоўлі. Асабліва значнай была іх роля ў ахове статку. З гэтай прычыны ў тода існаваў звычай *дзявочага інфантацыду*: значную частку народжаных дзяўчат проста пакідалі без дагляду. У сувязі з гэтым штучна ствараўся дэфіцыт жанчын у шлюбным узросце, выйсцем з якога было стварэнне поліандрычных сем'яў. У тода існавала так званая брацкая

паліандрыя. Жанчына фармальна ўступала ў шлюб са старэйшым братам, што фактычна рабіла яе жонкай усіх астатніх. Першыя дзеці, народжаныя ў такім шлюбе, лічыліся дзецьмі старэйшага брата. Потым права бацькоўства перадавалася маладзейшаму. Вядома, што паліандрыя была ўласцівая яшчэ аднаму пастаралісцкаму афрыканскаму народу – масаям.



*Паліандрыя ў Тыбеце*

Іншыя прыклады паліандрыі зафіксаваныя ў земляробчых народаў, якія жылі ва ўмовах дэфіцыту прыродных рэсурсаў. Такі варыянт быў характэрны для тыбетцаў. Пры неспрыяльным клімаце і горным рэльефе ворнай зямлі ў іх заўжды не хапала. Драбленне зямельнай уласнасці, з гаспадарчага пункту погляду, было немэтазгодным. Менавіта таму зямля пераходзіла ў спадчыну ўсім братам адразу, якія, каб не дзяліць яе, заключалі поліандрычны шлюб. Характэрнай асаблівасцю было тое, што адначасова з паліандрыяй у некаторых выпадках у тыбетцаў бывалі і палігінныя шлюбы. У той жа час, там, дзе полігінія пераважае, паліандрыя звычайна катэгарычна забароненая: гэта, напрыклад, тыпова для ісламскіх краін. І яшчэ адзін момант. У адрозненне ад полігініі, паліандрыя рэдка калі практыкуецца сёння. У Індыі і Кітаі, да якога адносіцца Тыбет, яна забароненая.

### *Гістарычныя формы шлюбу і сям’і*

Гісторыя сэксуальных стасункаў заўсёды карысталася падвышанай увагай даследчыкаў. Шмат каму хацелася абагульніць усе вядомыя формы шлюбу і раскласці іх па палічках чалавечай эвалюцыі. А калі чаго-небудзь не хапала – зрабіць рэканструкцыю.

Шатландскі даследчык Джон Мак-Ленан у XIX ст. уявіў сабе гэта наступным чынам. На яго думку, у далёкай старажытнасці, калі людзі займаліся паляваннем і збіральніцтвам, існавала жорсткая барацьба за рэсурсы паміж рознымі абшчынамі. Пераможцамі

станавіліся тыя групы, дзе было больш фізічна моцных мужчын-ваяроў-паляўнічых. Таму ўзнік дзявочы інфантацыд. Дэфіцыт жанчын кампенсаваўся поліандрычным шлюбам. А ў сувязі з тым, што вызначыць бацьку народжаных дзяцей было немагчыма, натуральным шляхам усталяваўся ўлік сваяцтва па матчынай лініі. З цягам часу дэфіцыт жанчын узмацняўся, і таму ўзнік звычай выкрадаць жанчын з іншых плямёнаў. Пры гэтым некаторыя мужчыны былі больш паспяховымі ў гэтым паляванні, і гэта стварыла ўмовы для полігініі. А з той нагоды, што жанчына фактычна станавілася здабычай, узнікла яе падначаленае становішча і ўлік сваяцтва па бацькоўскай лініі. Звычай выкрадаць жанчын з іншых плямёнаў настолькі замацаваўся, што стала ненармальным уступаць у шлюб з аднапляменніцамі, і таму ўзнікла экзагамія. З гледзішча фармальнай логікі рэканструкцыя Мак-Ленана выглядае бліскуча. Але факты, якіх ён папросту не ведаў, сведчаць, што ў паляўнічых і збіральнікаў не было канкурэнцыі за рэсурсы, асобныя абшчыны пазбягалі сутыкненняў, жанчыны здабывалі большую частку харчавання, а бацькоўскі ўлік сваяцтва існаваў да жаночага або адначасова з ім.

Рэканструкцыяй шлюбна-сямейных стасункаў амаль адначасова з Мак-Ленанам займаўся амерыканскі даследчык Льюіс Генры Морган. Дзеля гэтага ён распрацаваў адмысловую анкету, якую з дапамогаю славутага Смітсанаўскага інстытута распаўсюдзілі ў шмат якіх краінах. На падставе атрыманых звестак Морган прапанаваў падзяляць гісторыю шлюбна-сямейных стасункаў на шэсць ступеняў. На першай, якую ён назваў прамiскуітэтам, ніякіх правілаў і, адпаведна, шлюбаў ды сем’яў увогуле не існавала. А першай формай уласна шлюбаў быў так званы групавы шлюб. Спачатку ён быў у кроўна-сваяцкай сям’і, у якой некалькі сёстраў знаходзіліся адначасова ў шлюбе з некалькімі братамі. На змену ёй прыйшла пуналуальная сям’я (тут Морган выкарыстаў слова з палінезійскай мовы Гавайскага архіпелагу), якая складалася таксама з сясцёр, але іх мужамі была група мужчынаў, не братоў. Наступнай формай стала парная, або сінідыясмічная, сям’я, якая складалася з аднаго мужчыны і адной жанчыны. Яна была нестабільная: лёгка ствaралася і лёгка распадалася. Пазней яе замяніла патрыярхальная сям’я,

якая ўключала некалькі пакаленняў сваякоў адначасова. На гэтым этапе ўсталяваўся бацькоўскі ўлік сваяцтва, а ў некаторых выпадках – палігінія. Вышэйшая ступень эвалюцыі – сучасная манагамная сям'я, трывалая і заснаваная на законе.

Схема Моргана не менш лагічная, чым схема Мак-Ленана. Аднак і ў гэтым выпадку праблема палягала ў адсутнасці дакладных, спраўджаных звестак. З аднаго боку, пытанні яго анкеты не зусім дакладна зразумелі на месцах, а з другога, і сам Морган не зусім адэкватна інтэрпрэтаваў атрыманыя адказы. Уся пазнейшая гісторыя вывучэння шлюбу і сям'і пацвердзіла, што ніякага прамiскуітэту, а таксама ніякага групавога шлюбу не існавала. Аднак гісторыя з Морганавымі поглядамі на развіццё шлюбных адносінаў гэтым не скончылася. Канспект кніжкі Моргана «Старажытнае грамадства» зрабіў у свой час Карл Маркс. Пасля яго смерці гэты канспект знайшоў Фрыдрых Энгельс, які на яго аснове напісаў працу «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы». У Савецкім Саюзе гэтая праца перавыдавалася безліч разоў і была кшталту Бібліі для гуманітарыяў, а яны, у сваю чаргу, знаходзілі мноства доказаў існавання і прамiскуітэту, і групавога шлюбу.

Існавалі таксама іншыя спробы скласці ўяўленне пра формы сэксуальных стасункаў у старажытных людзей. Адно з іх грунтавалася на сцвярджэнні, што яны былі падобныя да тых, якія існуюць у высокаразвітых малпаў: найбольш агрэсіўны і фізічна магутны самец стварае сабе гарэм, а ўсіх сваіх супернікаў проста выганяе са статку. На думку заснавальніка псіхааналізу Зыгмунда Фройда, так ад пачатку будаваліся і стасункі паміж людзьмі. Такой самай думкі прытрымліваецца і сучасны даследчык і таленавіты папулярызатар навукі Ной Харары. Аднак у рэальнасці ніводнае грамадства з такім тыпам шлюбна-сямейных стасункаў невядомае.

Адзінае, што можна сцвярджаць, гэта тое, што ва ўсіх вядомых нам народаў сям'я існавала. І ёсць толькі два яе асноўныя варыянты: нуклеарная сям'я і вялікая, шматпакаленная. Усё астатняе – гэта вынік больш-менш лагічных высноў, фантазій і прыхаваных маскулінных жаданняў (аб прамiскуітэце, напрыклад).

Тыпы сям'і адпавядаюць пэўным стратэгіям жыццезабеспячэння, але суадносіны тут не маюць лінейнага характару. Нуклеар-

ная сям'я характэрная як для паляўнічых і збіральнікаў, так і для індустрыяльнага грамадства. А вялікая – для хорцікультуралістаў, пастаралістаў і сялян-земляробаў.

Нуклеарная сям'я – гэта адзінка, якая складаецца з дзвюх генерацый сваякоў: бацькоў і дзяцей, звычайна непаўналетніх. Яе характэрная асаблівасць – аўтаномнасць у дачыненні да іншых сваяцкіх сувязяў. Гэта значыць, што менавіта ўнутрысямейныя адносіны маюць прыярытэт у параўнанні з усімі астатнімі. Яшчэ адна асаблівасць – адасобленасць у прасторавых адносінах: тыповым з'яўляецца неалакальнае (асобна ад бацькоў і мужа, і жонкі) размяшчэнне сям'і, сямейнага жытла і гаспадаркі. Кампактнасць сямейнай адзінкі мае адаптыўны характар. Нуклеарная сям'я найлепшым чынам падыходзіць намадычнаму ладу жыцця паляўнічых і збіральнікаў. Адпаведна, і ў індустрыяльным, і ў пост-індустрыяльным грамадствах у пошуках лепшых умоў працы і кар'ерных перспектыў шмат якія сем'і качуюць не толькі ў межах нацыянальных дзяржаў, але на абсягу глабальнага рынку працы.



*Нуклеарная сям'я ў сучаснай Японіі*

Тыповай рысай сучаснай нуклеарнай сям'і стала яе нестабільнасць. За апошнія 60 гадоў інтэнсіўнасць разводаў павялічылася амаль што ў чатыры разы. Калі ў 1960 г. на кожныя 100 шлюбаў у свеце прыпадала 12 разводаў, то сёння гэты лік складае ў сярэднім 44. Лідарамі ў гэтым дачыненні з'яўляюцца еўрапейскія краіны: у Люксембургу на 100 шлюбаў прыпадае 78 разводаў, у Іспаніі – 65, у Францыі – 55, у Беларусі – каля 50. Найбольш стабільныя з гэтага гледзішча такія краіны, як Індыя (менш за 1% разводаў), Чылі (3%), Калумбія (9%). Рэлігійны фактар пры гэтым адыгрывае ўсё меншую ролю. Апошнім часам хутка павялічваецца колькасць разводаў у ісламскіх краінах. У Турцыі і Іране яна складае больш за 20% ад усіх шлюбаў.

У адрозненне ад нуклеарнай сям'і, вялікая шматпакаленная сям'я адрозніваецца зайздроснай стабільнасцю. Такая сям'я скла-

далася з некалькіх (трох-чатырох) генерацый сваякоў і ўключала ў сябе адначасова некалькі нуклеарных групаў. Пры гэтым кроўнае сваяцтва па бацькоўскай ці матчынай лініі адыгрывала галоўную ролю ў існаванні сямейнай адзінкі, а сваяцтва, набытае ў выніку шлюбу, – падначаленае. Менавіта таму магчымасць самастойнага існавання нуклеарнай сям'і практычна выключалася. Вялікія сем'і звычайна жылі ў адным будынку ці на адным двары. Пры гэтым асобныя нуклеарныя групы маглі жыць у адасобленым пакойчыку ці пабудове, аднак заўсёды існавала адна кухня і / або памяшканне, у якім магла сабрацца ўся вялікая сям'я. Існаванне вялікіх сем'яў таксама мела практычны адаптыўны сэнс. Сям'я была ўласнікам вялікай маёмасці, збольшага нерухомай. Гэта прадухіляла небяспеку драблення зямельнай уласнасці. Вядзенне калектыўнай гаспадаркі з канцэнтрацыяй працоўных рук было найбольш эфектыўнай формай арганізацыі працы.

Вялікія сем'і грунтаваліся на іерархічным прынцыпе: малодшыя павінны былі бездакорна падпарадкоўвацца старэйшым. На чале звычайна стаяў старэйшы мужчына, які кіраваў як гаспадарчым жыццём, так і асабістымі стасункамі. Асабліва гэта датычыла маладых сямейных пар і, пераважна, нявестак. У некаторых народаў, напрыклад, у раджпутаў у Індыі, маладым мужу і жонцы нават не дазвалялася размаўляць паміж сабой у прысутнасці старэйшых чальцоў сям'і.



*Вялікая сям'я ў Таджыкістане*

Разам з тым, вялікія сем'і маюць і шмат пераваг у плане асабістых адносінаў. Так, яны ствараюць лепшыя ўмовы для гадавання і выхавання дзяцей, у якім бяруць удзел дзядулі і бабулі. Больш за тое, вялікая колькасць дзяцей у межах сям'і спрые ўтварэнню асобнага дзіцячага асяроддзя, дзе старэйшыя займаюцца дагляданнем і выхаваннем малодшых. З іншага боку, і старэйшае пакаленне мае магчымасць атрымаць неабходную дапамогу. Усё гэта дазваляе найбольш фізічна актыўнай частцы вялікай сям'і сканцэнтравацца на вырашэнні працоўных праблем, што робіць гаспадарку больш

эфектыўнай. Невыпадкова ў грамадствах, дзе дамінуе вялікая сям'я, звычайна адсутнічаюць як дзіцячыя дамы, так і дамы састарэлых. Цікава, што ў апошнія дзесяцігоддзі доля шматпакаленных сем'яў павольна расце ў краінах Заходняй Еўропы і ЗША.

## Падсумаванне

У свеце няма ніводнага вядомага навукоўцам народа, у якога не існавала б такіх сацыяльных інстытуцый, як шлюб і сям'я. Іх наяўнасць абумоўлена самой чалавечай фізіялогіяй: няма іншага віду на нашай планеце, выжыванне нашчадкаў якога было б такі доўгі час залежнае ад паводзінаў бацькоў – ад гадавання, выхавання, навучання. Разам з тым, шлюб і сям'я – адзін з найбольш разнастайных у сваіх праявах аспектаў агульначалавечай культуры. У гэтай сферы ніколі не існавала адзіных для ўсяго чалавецтва правілаў і ўяўленняў пра тое, якія шлюб і сям'я правільныя, а якія няправільныя. Відаць, такая разнастайнасць будзе існаваць і ў будучыні.

# Раздзел 10.
# Геаграфія традыцыйных формаў сваяцтва

*Вызначэнне сваяцтва. Функцыі сваяцтва. Сваяцкія групы. Аднелінейныя групы. Патрылінейныя групы. Матрылінейныя групы. Лініджы. Кланы. Фратрыі. Паловы.*
*Не-унілінейныя сваяцкія групы.*
*Асноўныя сістэмы тэрміналогіі сваяцтва: эскімоская, гавайская, іракезская, амаха, кро, суданская.*

У кожным грамадстве, незалежна ад узроўню тэхналагічнага развіцця, ёсць групы людзей, якія называюць сябе сваякамі. Сваяцтва будуецца на двух фактах: генетычным паходжанні і на шлюбе. У мінулым беларусы пазначалі першае як крэўнасць, або роднасць, а другое як уласна сваяцтва. Але ў гэтым тэксце і крэўнасць, і сваяцтва мы пазначаем адзіным тэрмінам – сваяцтва. Яно фіксуе набор правілаў паводзінаў між людзьмі, пазначанымі як сваякі. Яны ўключаюць узаемныя правы і абавязкі, якіх паміж сваякамі звычайна больш, чым у дачыненнях з іншымі людзьмі. У даіндустрыяльных грамадствах становішча ў сістэме сваяцкіх адносінаў адыгрывала галоўную ролю ў ідэнтыфікацыі асобы, вызначала сацыяльны статус, адносіны да маёмасці. На сваяцкіх адносінах будаваліся палітычныя сістэмы, у тым ліку механізм перадачы ўлады. У сучасных грамадствах роля сваяцкіх адносінаў значна меншая. Але гэта не значыць, што яны нічога не значаць. Трэба падкрэсліць, што, хоць сваяцтва будуецца на біялагічнай аснове, гэта выключна культурная з’ява. Шмат якія сваяцкія пазіцыі могуць быць біялагічна ідэнтычнымі (напрыклад, крос- і паралельныя кузены), але набор правілаў паводзінаў, які ім прадпісваецца, можа істотна адрозніваецца.

У нашым сённяшнім жыцці сваяцтва засяроджана на трох генерацыях сваякоў (дзядулі-бабулі, бацькі, дзеткі) і шлюбных

адносінах (сужэнцы, цесць-цешча-зяць, свёкар-свякруха-нявестка). За межамі гэтага кола сваяцтва фіксуецца наборам спрошчанай тэрміналогіі (дзядзька-цётка, стрыечныя браты і сёстры). Аматары старасветчыны скажуць вам, што ёсць адрозненні паміж вуем (братам маці) і стрыем (братам бацькі). Але для пераважнай большасці сучасных беларусаў абодва яны – дзядзькі. Усё радзей можна пачуць слова «швагер» (брат жонкі), «братавая» (жонка брата), «швагерка» (жончына сястра або жонка жончынага брата), «ятроўка» (жонка мужавага брата) і г. д. Гэта сведчыць толькі аб тым, што ўрбанізаваны лад жыцця робіць адносіны паміж аддаленымі катэгорыямі сваякоў усё менш інтэнсіўнымі і менш значнымі. Таму забываецца і тэрміналогія: знікае сэнс трымаць яе ў галаве. Аднак яшчэ менш за сто гадоў таму яна адлюстроўвала існаванне кансалідаванага сацыяльнага сеціва, умовы паспяховай сацыяльнай і экалагічнай адаптацыі кожнага, хто да яго належаў.

Сваяцтва, як, дарэчы, і шлюбна-сямейныя стасункі, адносіцца да ліку ці не найбольш разнастайных аспектаў чалавечай культуры. Гэта ўлюбёная сфера даследаванняў этнографаў, этнолагаў, культурных антраполагаў і лінгвістаў. Часта гэтую галіну параўноўваюць з шахматнай гульнёй ці з алгебрай. Разнастайнасць у першую чаргу выяўляецца ў тым, якім чынам, паводле якіх прынцыпаў утвараюцца групы тых, каго лічаць сваякамі. У нашых сучасных умовах няма прынцыповай розніцы паміж сваякамі па бацькавай ці па матчынай лініі. Разам з тым у мінулым, беларусы пазначалі першае як сваяцтва «па мячы» (па зброі), а другое – «па кудзелі» (кудзель – валокны, падрыхтаваныя да прадзіва: сімвалізуюць жаночы пачатак). Адрозненні ў вызначэнні не сведчылі пра істотныя адрозненні ў сваяцкім статусе, аднак гэта не значыць, што ва ўсіх народаў свету было так. Больш за тое, менавіта featureзнае стаўленне да значэння сваяцтва па бацькавай ці па матчынай лініі складае падмурак адрознівання сваяцкіх сістэм у свеце.

Каб алгебра сваяцтва была лепш зразумелай, выкарыстоўваюць дыяграмы, якія графічным чынам адлюстроўваюць сутнасць адносінаў. У гэтых дыяграмах прысутнічаюць універсальныя, прынятыя навукоўцамі ўсяго свету вызначэнні.

1. Асобу, якая з'яўляецца кропкай адліку, звычайна пазначаюць

словам *эга* (на лаціне – я). Часцей за ўсё эга размяшчаюць так, каб былі відаць адна-дзве генерацыі, старэйшыя за эга (дзядулі-бабулі і бацькі), і адна маладзейшая – «эгавы» дзеці.

2. Асобы мужчынскага полу пазначаюцца знакам трыкутніка.

3. Асобы жаночага полу – знакам кола.

4. Шлюб – знакам роўнасці.

5. Адносіны паміж братамі і сёстрамі – гарызантальнай лініяй.

6. Генетычнае паходжанне – вертыкальнай лініяй.

Акрамя гэтага, могуць ужывацца абрэвіятуры, якія ўдакладняюць сваяцкі статус адносна эга. Напрыклад – Б (бацька), М (маці), Бр (брат), С (сястра), М (муж), Ж (жонка). Ці, напрыклад, спалучэнні: БрБ – брат бацькі, або стрый; БрМ – брат маці, або вуй, і г. д.

Тыповую для нашай традыцыі сваяцкую сітуацыю можна адлюстраваць наступнаю схемай.

Аснову сваяцкіх сувязяў складае ўяўленне аб сваяцкіх групах. Яны могуць быць адналінейнымі – калі істотная перавага надаецца сваяцтву па бацькаўскай (патрылінейнае) ці па матчынай (матрылінейнае) лініі. Другі тып – кагнатыўныя (неунілінейныя) групы, у якіх сваяцтва можа адсочвацца адначасова па абедзвюх лініях (падвоенае унілінейнае), па любой з дзвюх ліній (амбілінейнае) або дзе абедзве лініі ўвогуле вызначаюцца як сіметрычныя (білатэральнае).

Патрылінейнае сваяцтва сёння ці не самае вядомае ў свеце. Яно не звязана з пэўнай стратэгіяй жыццезабеспячэння і сустракаецца як сярод паляўнічых, так і сярод збіральнікаў, пастаралістаў




*Тыповая дыяграма сваяцтва*

і тых, хто займаўся ручной і сельскагаспадарчай апрацоўкай зямлі. Гэта сваяцтва па бацькаўскай лініі, якое аб'ядноўвае сваякоў мужчынскага полу: прадзеда-дзеда-бацьку-сына і г. д. Але прасцей яго прынцыпы ўяўляюцца на ўзроўні генерацыі дзядуля-бабуля. З усіх чатырох прадстаўнікоў гэтай генерацыі істотнымі з'яўляюцца адносіны да дзядулі – бацькавага бацькі. Пры гэтым жанчыны па бацькавай лініі хоць і ўключаюцца ў лік сваякоў, але сваякамі па бацькавай лініі не лічацца. У гэтым выпадку добра відаць, наколькі культурнае ўяўленне аб сваяцтве адрозніваецца ад яго біялагічнай прыроды. Прынцып патрылінейнасці ў першую чаргу датычыць перадачы маёмасці і, што яшчэ больш істотна, пераходу палітычнай улады з пакалення ў пакаленне.

Матрылінейнае сваяцтва – з'ява, сіметрычная патрылінейнаму, але сустракаецца значна радзей. Найбольш вядомыя прыклады – іракезы, наваха і чырокі ў паўночнай Амерыцы, ашанці ў Афрыцы, трабарыяндцы ў Акіяніі. Большасць выпадкаў матрылінейнага сваяцтва звязана з такімі канкрэтнымі прыкладамі ручной апрацоўкі зямлі, дзе жанчыны адыгрывалі надзвычай істотную эканамічную ролю. Матрылінейная група складалася з бабулі-матулі-дачкі-сястры і г. д. Іншымі словамі, у генерацыі дзядуль-бабуль галоўнай была наяўнасць адносінаў выключна да адной бабулі па матчынай лініі. Гэта, аднак, не значыць, што матрылінейнасць была матрыярхатам, бо статус, улада (напрыклад, правадырская ў ашанці) і маёмасць перадаваліся не ад маці дачцэ, а ад дзядзькі (брата маці) да сына яго сястры. Мужы сваячак па матчынай лініі ў кола сваякоў ніколі не ўключаліся. Таму ў такіх грамадствах працэдуры разводу былі надзвычай простыя, і разводы здараліся часта.



*Матрылінейны лік сваяцтва*

У рэальным жыцці на аснове ўяўленняў аб сваяцтве ўтвараюцца канкрэтныя сацыяльныя групы. Незалежна ад уліку сваяцтва – па

бацькавай матчынай лініі – найбольш універсальнай сваяцкай групай лічыцца род, або *лінідж*. Звычайна лініджам называюць сваяцкую групу, якая паходзіць ад рэальнага агульнага продка і здольная прасачыць свае адносіны да яго на глыбіню некалькіх, да сямідзесяці, генерацый. Прыналежнасць да ліінджа адыгрывае надзвычай вялікую ролю ў фарміраванні ідэнтычнасці, якая дамінуе над асабовай. Характэрнай рысай лініджу з'яўляецца яго экзагамія: шлюбы заключаюцца з прадстаўнікамі іншых падобных групаў. Гэта змяншае магчымасць сэксуальнага спаборніцтва ўнутры групы і спрыяе яе стабільнасці. З іншага боку, экзагамія стварае падмурак сацыяльнай камунікацыі з іншымі падобнымі групамі. У сувязі з тым, што заключэнне шлюбаў разглядаецца як, у першую чаргу, саюз родаў, яны адыгрываюць надзвычай істотную ролю ў арганізацыі сацыяльнага кантролю. Часта лінідж з'яўляецца ўласнікам стратэгічна істотных рэсурсаў: зямлі, водных крыніцаў, статкаў жывёлы і г. д. Але ён не ёсць адзінкай гаспадарання. Разам з тым, прадстаўнікі лініджу абавязаны дапамагаць адзін аднаму. Гэта датычыць не толькі гаспадарчых пытанняў. Лінідж стварае сваім чальцам гарантыі бяспекі. Спрэчкі паміж імі рэгулююцца ўнутры лініджу; крыўда, нанесеная асобай, якая не ўваходзіць у лінідж, прыводзіць да мабілізацыі ўсяго роду. Асаблівасцю лініджаў таксама з'яўляецца тое, што перыядычна яны могуць збіраць усіх сваіх прадстаўнікоў у адным месцы – напрыклад, для правядзення рэлігійных рытуалаў.



*На чале лініджа знаходзіцца старэйшына. Масаі, Афрыка*

З цягам часу, па меры аддалення ад агульнага продка пачынаецца сегментацыя лініджа на групы. Гэта вядзе да ўтварэння сваяцкага клана – групы з некалькіх лініджаў, прадстаўнікі якіх ужо



*Клан Грэгар у Шатландыі*

не здольныя прасачыць сваё паходжанне ад рэальнага продка, але, тым не менш, лічаць сябе сваякамі.

Адсутнасць ведаў пра канкрэтных продкаў кампенсуецца ўяўленнямі аб звышнатуральным паходжанні ад пэўнай жывёлы, расліны, радзей таксама ад нежывога аб’екта (скалы, вялікага каменя і г. д.). Такія вераванні яшчэ называюць *татэмізмам*, а аб’екты, якія забяспечваюць агульнае сваяцтва, – *татэмамі*. Слова «татэм» пазычанае з мовы індзейскага племені аджыбва і ў літаральным перакладзе значыць «мой сваяк». У народаў паўночна-заходняга ўзбярэжжа паўночнай Амерыкі, у тым ліку і саміх аджыбва, былі шырока распаўсюджаны татэмныя знакі – драўляныя скульптуры, якія служылі матэрыяльным увасабленнем таго ці іншага татэма. Шмат якія даследчыкі лічаць, што геральдыка таксама мае татэмічнае паходжанне. У некаторых выпадках кланы могуць быць вельмі падобнымі да лініджаў, што стварае высокі ўзровень і інтэнсіўнасць узаемадзеяння. Аднак часцей за ўсё яно абмежаванае. Генетычна кланы паходзяць



*Татэмныя знакі аджыбва*

ад экзагамных ліниджаў і ўспрымаюцца як экзагамныя адзінкі, але яны рэдка калі займаюцца арганізацыяй шлюбаў. Да гэтага трэба дадаць, што звычайна кланы не маюць агульнай маёмасці. Тым не менш, уяўнае сваяцтва прадугледжвае таксама і пэўныя абавязкі: узаемную гасціннасць і дапамогу ў выпадку знешняй пагрозы.

Сегментацыя кланаў, падобна як і родаў, выклікала стварэнне групаў з яшчэ больш аддаленым сваяцтвам – *фратрыяў*. Яны сустракаюцца даволі рэдка, звычайна не звязаны з уяўленнямі аб агульным генетычным паходжанні, але адыгрываюць ролю экзагамнага рэгулятара шлюбных стасункаў. Падобнае значэнне маюць і *паловы*, якія падзяляюць усю супольнасць на дзве строга экзагамныя часткі. Характэрна, што так званая дуальная арганізацыя, пабудаваная на паловах, захоўвалася пэўны час у грамадствах з дзяржаўнай формай палітычнай улады, у тым ліку ў старажытных Афінах, Егіпце, а таксама ў сярэднявечным Ноўгарадзе.

***Не-унілінейныя сваяцкія групы***

Значная колькасць (да 40%) народаў, у тым ліку беларусы, прасочваюць сваяцкія сувязі не па адной, а па абедзвюх – бацькавай і матчынай – лініях. Такія сістэмы сваяцтва называюць не-унілінейнымі. Сярод іх таксама ёсць некалькі варыянтаў.

Білатэральная сістэма сваяцтва разглядае сваякоў з абодвух бакоў як адназначна роўных. У адрозненне ад лінейных сістэм, яна ўключае ў сябе параўнальна невялікую колькасць як сваякоў, так і сваяцкіх генерацый. Тут няма ўяўлення аб адзіным агульным продку ці аб кіраўніку клана. Таму білатэральная сістэма не можа стварыць кансалідаваную сваяцкую групу, заснаваную на сумяшчэнні сацыяльных і эканамічных адносінаў. Сваяцтва ў гэтым выпадку ўтварае хутчэй сетку сацыяльных стасункаў, якія паводле сваёй інтэнсіўнасці значна саступаюць родам і кланам. Набор узаемных правоў і абавязкаў сфакусаваны галоўным чынам на стасунках сужэнцаў, бацькоў і непаўналетніх дзяцей.

Акрамя білатэральных, да ліку не-унілінейных адносіцца сістэма падвоенага сваяцтва. У гэтым выпадку сваяцкія сувязі прасочваюцца па абедзвюх лініях, але пры гэтым лініі не разглядаюцца

як раўназначныя. Рэч у тым, што розныя лініі сваяцтва прадугледжваюць розны набор стасункаў. Напрыклад, у некаторых народаў Афрыкі права на валоданне зямлёй перадаецца па бацькавай лініі, а рухомая маёмасць – па матчынай. Яшчэ больш дзіўнай выглядае амбілінейная сістэма, пры якой існуюць дакладныя адрозненні паміж бацькавым і матчыным улікам сваяцтва, і бацькі або сама асоба могуць вызначаць, да якой з дзвюх групаў яны належаць. Пры гэтым на працягу жыцця дазваляецца неаднаразовая змена прыналежнасці.

### *Сістэмы сваяцтва*

Уся, здавалася б, бясконцая разнастайнасць сваяцкіх стасункаў паміж людзьмі ўкладаецца ў шэсць базавых сістэм сваяцтва. У яе падмурку ляжаць прынцыпы, згодна з якімі пазначаюцца тыя ці іншыя сваякі. Іначай кажучы, гаворка ідзе пра тэрміналогію сваяцтва.

Наша сучасная беларуская сістэма гэтак, як у большасці еўрапейскіх народаў, адносіцца да той, якую называюць *эскімоскай*. Эскімоскай не таму, што мы з імі нейкім чынам звязаныя паходжаннем, а таму, што яна дае найбольш дакладны прыклад такой класіфікацыі. Эскімоская сістэма адпавядае нуклеарнай сям'і і білатэральнаму ліку сваяцтва. Праз тое, што такая сям'я складаецца з сужэнцаў і непаўналетніх дзяцей, тэрміналогія сфакусаваная менавіта на іх. Тут ёсць два важныя моманты. Па-першае, назвы




*Эскімоская сістэма сваяцтва*
*(Пл..ца – пляменніца, Пл..к – пляменнік)*

*бацька-маці-брат-сястра* выкарыстоўваюцца выключна ў яе межах (магчымыя і іншыя варыянты, але пра гэта трохі пазней). А па-другое, па-за яе межамі тэрміналогія гранічна спрошчаная: няма адрознення, напрыклад, паміж матчыным братам і братам бацькі – яны абодва дзядзькі – ці паміж сястрой бацькі і сястрой маці, якія абедзве цёткі. Тое самае датычыць пляменнікаў і пляменніц, якія незалежна ад прыналежнасці да бацькоўскай ці матчынай лініі будуць называцца аднолькава. Разам з тым, мы памятаем, што даўней у беларусаў такія адрозненні былі. Гэта значыць, што сваяцкая сістэма мяняецца з часам. Антраполагі сцвярджаюць, што каля 11% народаў свету маюць эскімоскую сістэму сваяцкай тэрміналогіі. Галоўны яе сэнс – кансалідаваць тых, хто складае нуклеарную сям'ю, і звяртаць менш увагі на ўсіх астатніх.

*Гавайская* сістэма тэрміналогіі сваяцтва належыць да ліку ці не самых простых. Колькасць тэрмінаў у ёй зведзена да мінімуму. У ёй няма звыклых для нас назваў дзядзька, цётка, стрыечны брат ці сястра, а для ўсіх катэгорый сваякоў аднаго полу і адной генерацыі выкарыстоўваецца адзін і той самы тэрмін. Так, усе сваякі генерацыі бацькі – ён сам, яго брат і брат маці – называюцца бáцькі, а ўсе сваякі генерацыі маці, разам з ёй, яе сястрой і сястрой бацькі – маці. Адпаведным чынам, усе родныя і стрыечныя браты будуць братамі, а сёстры – сёстрамі. Пры гэтым трэба разумець, што гэта не проста назвы. Гэта тое, што азначае пэўныя правы і абавязацельствы паміж людзьмі. І, калі бацькавага брата называюць бацькам, гэта значыць, што да яго трэба ставіцца абсалютна падобным чынам, як і да бацькі роднага. Гавайская сістэма




*Гавайская сістэма сваяцтва*

ўласцівая надзвычай вялікай колькасці народаў свету – да 36%. У сваёй большасці гэта народы, якія размаўляюць на так званых малайска-палінезійскіх мовах аўстранезійскай моўнай сям'і. Да іх адносяцца і народы Палінезіі, ад Гавайскага архіпелага да Новай Зеландыі (маоры), і большая частка жыхароў Інданезіі і Філіпінаў, і насельнікі Мадагаскара. Гавайская сістэма ўтварылася на аснове амбілінейнага ўліку сваяцтва, калі ці сама асоба, ці хтосьці за яе вырашае, да якой лініі, бацькоўскай ці матчынай, яна належыць.

Тэрміналагічная сістэма *амаха* вызначаецца нашмат большай складанасцю. Яна характэрная для унілінейных сістэм, арыентаваных на ўлік сваяцтва па бацькавай лініі. Таму тэрміналогія для бацькавай і матчынай ліній у ёй адрозніваецца. Для апошняй характэрна аб'яднанне пад адной назвай сваякоў некалькіх генерацый. Напрыклад, адна і тая самая назва будзе ў дачкі матчынага брата (стрыечнай сястры), матчынай сястры (цёткі) і самой маці. Адпаведным чынам, матчын брат (дзядзька) і яго сын (пляменнік) таксама будуць пазначацца адной назвай. Дзеці бацькавага брата і матчынай сястры («паралельныя» пляменнікі і пляменніцы) пазначаюцца гэтак сама, як родныя браты і сёстры. Гэта адбываецца таму, што і бацькаў брат пазначаецца як бацька, і матчына сястра пазначаецца як маці. А вось крос-кузены – дзеці бацькавай сястры – пазначаюцца як пляменнікі і пляменніцы.




*Сістэма сваяцтва амаха*

Назва «амаха» паходзіць ад назвы карэннага індзейскага народа на тэрыторыі Сярэдняга Захаду ЗША. Традыцыйна амаха спалучалі ручную апрацоўку зямлі (вырошчвалі кукурузу) з па-

ляваннем і збіральніцтвам. На пачатку XXI ст. агульная колькасць амаха склала каля 5 тыс. чалавек. Тэрміналагічная сістэма амаха зафіксаваная ў 9% народаў свету. Найбольш тыповыя прыклады: народ мапучэ ў Чылі (апісаны ў свой час Ігнатам Дамейкам), дані ў Папуа – Новай Гвінеі, ігба ў Заходняй Афрыцы.

Тэрміналагічная сістэма *кро* таксама паходзіць ад назвы індзейскага племені. Кро адпавядаюць стэрэатыпнаму кінематаграфічнаму вобразу паўночна-амерыканскіх індзейцаў. Яны былі тыповымі паляўнічымі на бізонаў – біялагічных сваякоў нашых зуброў. Кро досыць хутка засвоілі конегадоўлю. Гэта значна падвысіла эфектыўнасць палявання і адначасова прывяло да росту ваяўнічасці, сутыкненняў з суседзямі. Сваяцкая сістэма кро шмат у чым сіметрычная амаха, з акцэнтам на матчын улік сваяцтва. Змешванне розных генерацый характэрна тут для бацькавай лініі. Яны пазначалі аднолькавай назвай і бацьку, і ягонага брата, і сына цёткі – бацькавай сястры (крос-кузена), і нават сына дачкі бацькавай сястры. Гэткім самым чынам адна і тая назва існавала і для цёткі па бацькавай лініі, і для яе дачкі, і для яе ўнучкі. Падобна да сістэмы амаха, паралельныя кузены – дзеці бацькавага брата і матчынай сястры лічыліся роднымі. А вось стрыечныя – дзеці дзядзькі (матчынага брата) – разглядаліся з пункту погляду эга як свае родныя сыны і дочкі. Сістэма кро – адна з самых рэдкіх. Да яе адносіцца каля 6% народаў свету, у тым ліку індзейскія народы хопі і наваха.




*Сістэма сваяцтва кро*

*Іракезская* тэрміналагічная сістэма паходзіць ад назвы ўжо добра вядомага нам індзейскага народа рэгіёна Вялікіх азёр Паўночнай Амерыкі. У пэўнай ступені яна нагадвае і сістэму кро,




*Іракезская сістэма сваяцтва*

і сістэму амаха, бо і бацька, і ягоны брат пазначаюцца адной назвай (маці і яе сястра таксама). Таму і паралельныя кузены пазначаюцца гэтак сама, як і родныя браты і сёстры, а крос-кузены (дзеці сястры бацькі і брата маці) – гэтак сама, як стрыечныя браты і сёстры, незалежна ад таго, да бацькавай ці да матчынай лініі яны адносяцца. Іракезская сістэма належыць да найбольш пашыраных. Падобным чынам вызначае сваіх сваякоў да 29% народаў свету. Яна характэрная для вялікай колькасці індзейскіх народаў (аджыбва, алганкінаў, вялікай колькасці нардаў субсахарскага рэгіёну Афрыкі, якія размаўляюць на мовах банту, а таксама – народаў Меланэзіі.

Асобна стаіць *суданская* тэрміналагічная сістэма, для якой характэрна максімальна магчымая колькасць сваяцкіх вызначэнняў. Для кожнага дзядзькі і кожнай цёткі ў ёй ёсць асобныя пазначэнні. Асобныя пазначэнні існуюць і для кожнага з чатырох магчымых «гатункаў» стрыечных братоў і сясцёр. Суданская сістэма сёння




*Суданская сістэма сваяцтва*

тыповая для 9% народаў свету, у першую чаргу – арабскіх. Разам з тым, у старажытнасці яе рысы былі ўласцівыя і раманскім, і англа-саксонскім народам. Няцяжка заўважыць, што і беларусам традыцыйна адпавядала менавіта суданская сістэма.

## Падсумаванне

Сістэмы сваяцтва дэманструюць надзвычайную разнастайнасць у культурным і геаграфічным вымярэнні. Гэта не проста розныя назвы, гэта фіксацыя розных адносінаў, розных правоў і абавязацельстваў да падобных у біялагічным вымярэнні сваякоў. Роля сваяцтва не з’яўляецца аднолькавай на працягу гісторыі чалавецтва. У тых грамадствах, дзе не існавала дзяржаўнай сістэмы кіравання, сваяцтва практычна цалкам вызначала сацыяльны статус і паводзіны чалавека. У індустрыяльным і пост-індустрыяльным грамадствах роля сваяцтва істотна змяншаецца. Часцей за ўсё гэта ўжо не падмурак для ўтварэння сацыяльных груповак кшталту роду (ліниджа) ці клана, а сістэма дыстанцыйных дачыненняў, з абмежаваным наборам правоў і ўзаемных абавязкаў.

# Раздзел 11.
# Геаграфія традыцыйных формаў рэлігійнага жыцця

*Вызначэнне рэлігіі. Псіхалагічныя і сацыяльныя функцыі рэлігіі.*
*Формы ўвасаблення звышнатуральных сіл. Анімізм.*
*Прамысловыя культы. Культ продкаў. Татэмізм. Заалатрыя.*
*Фетышызм. Культы правадыроў.*
*Гістарычныя формы арганізацыі рэлігійнага жыцця.*
*Індывідуалістычныя культы. Шаманісцкія культы.*
*Абшчынныя культы. Эклезіястычныя культы.*
*Геадэмаграфія сучаснай рэлігійнасці.*
*Рэлігія і сацыяльная трансфармацыя.*

Мне вельмі хацелася б, каб і апошні раздзел кніжкі пачаўся стандартным сказам: «У кожнага народа, незалежна ад узроўню тэхналагічнага развіцця, ёсць уяўленні аб звышнатуральным, або рэлігія». Аднак гэтым разам не атрымалася. Чаму? А таму, што не ва ўсіх народаў яна ёсць. Дакладней, ва ўсіх, акрамя аднаго. Гэта народ кубу – паляўнічыя і збіральнікі вільготных экватарыяльных лясоў на востраве Суматра.

Першыя даследчыкі кубу (іх вывучэнне пачалося ў XIX ст.), у тым ліку галандзец Ван Донген, звярнулі ўвагу на адсутнасць у іх якіх-небудзь вераванняў. У 1920-х гг. нямецкі даследчык Вільгельм Фольц праводзіў сярод кубу спецыяльныя даследаванні і прыйшоў да высновы не толькі аб адсутнасці вераванняў, але і поўным дамінаванні рацыянальнага разумення свету. Невыпадкова кніга Фольца была перакладзена і выдадзена ў СССР. Пазней некаторыя даследчыкі высветлілі, што ў кубу, тым не менш, існавалі ўяўленні аб духах прыроды, падобных на еўрапейскіх эльфаў. Але іншыя навукоўцы сцвярджалі, што гэтыя ўяўленні ўзніклі ў кубу зусім

нядаўна, пад уплывам суседзяў. Сёння кубу знаходзяцца ў працэсе інтэнсіўнай ісламізацыі. У сувязі з масавай высечкай лясоў для вырошчвання алейных пальмаў, яны страчваюць магчымасць жыць у звыклым для іх асяроддзі. Хутка мяняецца іх лад жыцця, і дакладна давесці, ці мелі яны рэлігію ў мінулым, ужо немагчыма. Аднак, і ігнараваць звесткі Ван Донгена і Фольца было б памылкай. Вось жа, сцвярджаць на ўсе сто адсоткаў, што ва ўсіх народаў свету заўсёды была рэлігія – не выпадае.



*Сучасныя кубу*

З іншага боку, адказаць на пытанне адносна таго, што такое рэлігія, гэтак сама складана, як і адносна шмат якіх іншых праяваў культуры. Калі мы бачым пэўную культавую пабудову, у якой ёсць творы мастацтва, святар, адбываюцца рытуалы, то відавочна, мы маем справу з рэлігійным культам. А калі ні царквы, ні, скажам, капішча, няма, і кожны сам сабе святар – ці гэта рэлігія? Можна сказаць, што ў любым выпадку гэта вера ў нешта звышнатуральнае. Аднак тады ўзнікае пытанне: што лічыць натуральным, а што – звышнатуральным? Ці ёсць звышнатуральным тое, што не тлумачыцца рацыянальным, навуковым чынам? Так, але гэта погляд, якому не больш за 150–200 гадоў. Дый, акрамя ўсяго, тое, што раней здавалася звышнатуральным і пазбаўленым рацыянальнага сэнсу, – напрыклад, навучанне паводзінам у снах у тых самых сенояў, – сёння становіцца эфектыўным інструментам псіхатэрапіі. Таму можна сказаць, што вызначэнне рэлігіі як веры ў звышнатуральнае – вельмі недасканалае, але нічога лепшага на сённяшні дзень прапанаваць не выпадае. Можна хіба толькі дадаць, што гэтая вера можа спалучацца з пэўнымі правіламі і формамі паводзінаў, рытуаламі і цырымоніямі, свяшчэннымі тэкстамі і г. д.

Рэлігію даволі проста апісаць, калі яна сама падзяляе ўсё іcнае на свет сакральны, звышнатуральны, і свет прафанны, звычайны. Але ў значнай колькасці рэлігійных культаў такога падзелу не было. У дахрысціянскіх вераваннях беларусаў, якія стагоддзямі існавалі паралельна з хрысціянствам, бадай што не было ніводнай фізічнай прасторы, дзе не хавалася б якая-небудзь звышнатуральная істота: у полі, у лесе, у балоце, у рэчцы, у паветры, у кожнай гаспадарчай пабудове, у лазні і ў самой хаце.

Кожная рэлігія, незалежна ад формы існавання, выконвае шэраг вельмі істотных псіхалагічных і сацыяльных функцый. Ці не самая галоўная з іх – пазнавальная, або кагнітыўная. Рэлігія – найбольш старажытная форма вывучэння свету і, што самае галоўнае, – яго вытлумачэння. Яна і сёння дае гранічна зразумелыя ледзьве не кожнаму адказы на тыя пытанні, на якія навука адказаць не здольная. Пра тое, як быў створаны гэты свет і дзеля чаго ў ім існуе чалавек, напрыклад. Адначасова рэлігія выконвае функцыю эмацыянальнай падтрымкі ў складаных жыццёвых сітуацыях. Вядома, што чым менш людзі здольныя кантраляваць свае паводзіны – асабліва, падчас стыхійных бедстваў, эпідэмій, войнаў, – тым больш яны схільныя звяртацца па дапамогу да рэлігійнай практыкі. Не выпадкова, што падчас Другой сусветнай вайны нават надзвычай агрэсіўнае ў дачыненні да рэлігіі кіраўніцтва СССР пагадзілася на частковае аднаўленне яе функцый. Рэлігія выконвае і шэраг сацыяльных функцый. Удзел у супольных абрадах і рытуалах ці падобнае, рэгламентаванае рэлігіяй адзенне вернікаў адыгрывае істотную ролю ва ўмацаванні калектыўнай ідэнтычнасці. Не меншае значэнне рэлігія мае ў ажыццяўленні сацыяльнага кантролю. У кожнай рэлігійнай сістэме існуе дакладна вызначаны кодэкс узорных паводзінаў, а таксама набор санкцый дзеля заахвочвання вернікаў іх выконваць.

Рэлігійныя вераванні адносяцца да ліку ці не найбольш разнастайнай галіны культуры. Навукоўцы адрозніваюць да 10 тысяч асобных культавых вераванняў. На думку многіх, найбольш універсальнай і адначасова найбольш старажытнай формай рэлігіі з'яўляецца *анімізм*, або вера ў існаванне духаў – нябачных звышнатуральных істот. Стваральнік канцэпцыі анімізму, адзін

з заснавальнікаў культурнай антрапалогіі Эдвард Тайлар лічыў, што ён складае неабходны мінімум рэлігіі. На думку Тайлара, паходжанне анімізму звязанае са спробамі асэнсавання старажытнымі людзьмі такіх з’яваў, як сон, страта прытомнасці, галюцынацыі і г. д. У выніку ўзніклі ўяўленні аб душы чалавека, якая здольна існаваць асобна ад цела і вяртацца ў яго. Пазней на гэтай аснове ўзніклі ідэі аб жыцці душы пасля смерці і аб замагільным свеце. Наступным крокам стала ўзнікненне ўяўленняў пра тое, што нешта падобнае на душу існуе і ў прыродзе – асобныя яе часткі, стыхіі. Паступова сфармавалася перакананне, што духі здольныя да асобнага жыцця і што яны падобныя да чалавека (так званы *антрапамарфізм*). Найвышэйшай ступенню развіцця анімізму з’яўляецца *манатэізм* – вера ў адзінага духа, які кіруе ўсім існым. Канцэпцыя Тайлара адносіцца да ліку лагічных рэканструкцый – праверыць яе сапраўднасць, як і ў выпадках з паходжаннем шлюбных стасункаў, наўрад ці магчыма.



*Дзесяць Майсеевых прыказанняў на старажытнагабрэйскай мове*

Разам з тым, анімізм – сапраўды адна з найбольш пашыраных формаў рэлігійных уяўленняў. Дастаткова звярнуцца да шматлікіх публікацый пра дахрысціянскія вераванні беларусаў, каб пераканацца ў гэтым. Шмат у якіх народаў анімізм прыняў форму *прамысловага культу*, звязанага з паляваннем і рыбалоўствам. У інуітаў і шмат у якіх іншых народаў поўначы існавала ўяўленне аб духахуладарах прыроды, у тым ліку аб духу мора, жанчыне Седне. Згодна з паданнем, у далёкім мінулым яна жыла на зямлі і была звычайнай дзяўчынай. Аднойчы яна пасварылася з бацькам, і той выкінуў яе з лодкі ў мора. А калі Седна паспрабавала залезці назад, бацька адрэзаў ёй пальцы. З тых часоў Седна жыла ў моры, а ад яе пальцаў



*Інуіцкая маска духа месяца*

нарадзіліся марскія звяры і рыбы. Таму перад паляваннем трэба было абавязкова зрабіць ахвярапрынашэнне з чаго-небудзь ядомага – іначай, лічылася, поспеху не будзе. Падобным чынам беларусы прыносілі ахвяры лесавіку (кавалак хлеба з салам), каб той прывёў людзей на грыбныя месцы і потым выпусціў з лесу.

Да анімізму адносіцца надзвычай пашыраны ва ўсім свеце *культ продкаў*. Ён заснаваны на ўяўленнях аб тым, што душы памерлых продкаў перыядычна вяртаюцца, а ў некаторых народаў – увесь час знаходзяцца побач са сваімі сваякамі. Культ продкаў можа прымаць самыя разнастайныя формы. На Трабарыяндскіх выспах, напрыклад, чарапы продкаў захоўваюць у спецыяльных мужчынскіх дамах. Нярэдка іх укладаюць у адмыслова зробленыя з дрэва антрапаморфныя скульптуры ці проста носяць з сабой. У інуітаў ёсць уяўленне, што духі продкаў на пэўны час пасяляюцца ў целе немаўляці. Яны жывуць у ім да таго часу, пакуль уласная душа дзіцяці не набярэ моцы. У сувязі з гэтым катэгарычна забаронены фізічныя пакаранні – гэта ўсё роўна як узняць руку на продка.



*Маска духа продка-жанчыны. Народ чокве, Ангола*

Культ продкаў з’яўляецца адной з тыповых формаў рэлігіі ў субсахарскім рэгіёне Афрыкі. Лічыцца, што продкі назіраюць за паводзінамі людзей, апякуюцца імі, дапамагаюць у складаных сітуацыях. Разам з тым, яны патрабуюць клопату, павагі і ахвярапрынашэнняў: сумеснай трапезы сваяцкага клана, для якой забівалі казляня.

Дакладна рэгламентаваны характар мелі рытуалы культу продкаў у традыцыйным Кітаі. Кожны клан меў радавы храм – невялічкую пабудову на могілках ці проста шафу ў доме, дзе захоўваліся таблічкі з імёнамі продкаў. Падчас каляндарных (чатыры разы на год) святаў ці сямейных падзей (напрыклад, з нагоды вяселля) іх раскладалі на стале разам з ахвярапрынашэннямі, якія спальвалі. Сярод ахвярапрынашэнняў была не толькі ежа, але і спецыяльныя грошы для продкаў, якія адмыслова малявалі для гэтай нагоды. Культ продкаў у Кітаі шмат у чым нагадвае Дзяды ў беларусаў.



*Наскальны жывапіс у аўстралійскім татэмічным цэнтры*

Анімізм – пашыраная, але далёка не адзіная форма старажытных рэлігійных вераванняў. Так, сярод аўстралійскіх абарыгенаў галоўную ролю адыгрываў татэмізм – уяўленне аб звышнатуральным паходжанні пэўнай групы людзей ад пэўнага віду жывёлы, радзей – расліны. Звычайна імі былі кенгуру, страусы, апосумы, вомбаты і г. д. На іх было забаронена паляваць і ўжываць у якасці ежы. Пры гэтым татэмную жывёлу часта называлі «наш бацька», «старэйшы брат».

Разам з тым, некалькі разоў на год гэтая забарона адмянялася, і спажыванне мяса татэма лічылася абавязковым для ўмацавання сувязі з ім. У абарыгенаў народа аранда існавала ўяўленне, што татэм мае нябачнае ўвасабленне – ратапу. Трапіўшы ў цела жанчыны, ратапа выклікае цяжарнасць. Такім чынам, кожнае народжанае дзіця – гэта ўвасабленне татэмнай жывёлы. Аўстралію лічаць мацерыком класічнага татэмізму, але ён сустракаецца і сярод іншых народаў, напрыклад, у іракезаў і чырока ў Паўночнай Амерыцы. Найбольш тыповымі татэмнымі жывёламі ў іх былі крумкач і каёт.

З жывёламі звязана такая старажытная форма рэлігійных

вераванняў, як заалатрыя, але яна зусім не падобная на татэмізм. Гэта ў сваёй сутнасці ўяўленне аб звышнатуральнай сіле некаторых, звычайна драпежных, небяспечных для чалавека жывёлаў. Найбольш вядомымі з'яўляюцца культ леапарда, пашыраны сярод народаў субсахарскага рэгіёна Афрыкі, культ ягуара – у Цэнтральнай и Паўднёвай Амерыцы.

Культ ягуара быў характэрны для старажытных альмекаў, майя, іншых народаў. Ён быў увасабленнем сілы, магутнасці, агрэсіўнай ваяўнічасці. Як і з шэрагам іншых жывёл-аб'ектаў пакланення ў заалатрыі, з ягуарам былі звязаныя ўяўленні аб здольнасці пэўных людзей, шаманаў, ператварацца ў жывёлу.



*Выява ягуара на керамічнай вазе ў народа майя*

У беларусаў і шмат якіх еўрапейскіх народаў падобныя паданні звязаныя з вобразам ваўка. Уяўлялася, што такія здольнасці звычайна мелі чараўнікі і нават палітычныя дзеячы – напрыклад, Усяслаў Чарадзей. А сярод цюркскіх народаў культ ваўка меў іншую накіраванасць. Часта лічылася, што ад яго паходзяць асобныя народы, што, магчыма, звязана са старажытным татэмізмам. Ваўка ўяўляюць як носьбіта шэрагу адметных якасцяў: незалежнасці (ваўкі не паддаюцца прыручэнню), адвагі, чысціні (воўк ніколі не харчуецца падлай), сужэнскай вернасці і г. д.

У субсахарскім рэгіёне Афрыкі традыцыйна быў шырока распаўсюджаны *фетышызм* – вера ў звышнатуральныя здольнасці асобных прадметаў. Практыка фетышызму надзвычай простая. Фетышам можа быць любы прадмет, які здольны выконваць пажаданні ўладара. Дзеля гэтага дастаткова гэтыя пажаданні шэптам паведаміць рэчы. Калі яны не спраўджваюцца, рэч проста выкідаюць і шукаюць новую. Фетышам можа быць кавалак дрэва ці

камень незвычайнай формы, але часцей за ўсё гэта – антрапаморфная скульптура. Лічылася, што, каб фетыш «не забыўся» выканаць пажаданне, трэба загнаць у яго цвік. Таму з цягам часу асабліва ўдалыя фетышы пачыналі нагадваць вожыкаў.



*Афрыканскі фетыш*

Спецыфічную групу традыцыйных вераванняў складаюць культы палітычнай улады. Сярод іх ужо згаданае ўяўленне пра «мана», шырока вядомае ў народаў Палінезіі. Мана – гэта безасабовая нябачная сіла, здольнасць кантраляваць, якую мае толькі абмежаванае кола людзей. Пры гэтым у розных людзей моц мана істотна адрознівалася. Найбольшай яна ўяўлялася ў правадыроў, што і забяспечвала легітымнасць іх кіравання. Менавіта таму правадыры лічыліся напалову багамі. Аб'ектамі пакланення былі месцы іх пахавання і іх духі. Сакралізацыя палітычных лідараў замацоўвалася таксама і тым, што яны часта з'яўляліся адначасова галоўнымі святарамі. Аналагічны культ правадыроў быў характэрны і для вялікай колькасці народаў Афрыкі.

Рэлігійныя вераванні могуць адрознівацца не толькі паводле свайго аб'екта, але і паводле спосабу арганізацыі. Яны, у пэўнай ступені, адпавядаюць тэхналогіям жыццезабеспячэння. Аднак дакладнага супадзення тут няма. Класіфікацыю, заснаваную на гэтых падставах, прапанаваў амерыканскі даследчык Энтані Уолас.

Самай простай формай арганізацыі з'яўляюцца індывідуалістычныя культы, якія не патрабуюць для верніка наяўнасці якіх-небудзь пасярэднікаў для кантакту са звышнатуральным светам. Ці не найбольш тыповым іх прыкладам лічаць так званы *візіянізм* – веру ў відовішча, характэрную для вялікай колькасці карэнных народаў Паўночнай Амерыкі. Для рэлігійнага кантакту часта выкарыстоўвалі алкагольныя напоі, галюцынагены ў спалучэнні з адмысловай падрыхтоўкай. Напрыклад, у племені пома, якое жыло на тэрыторыі Каліфорніі, ініцыяцыя (пасвячэнне ў дарослыя) уключала ў сябе працяглую галадоўку, пасля якой падлеткам

давалі выпіць кактусавай бражкі. Тое, што яны бачылі ў стане алкагольнага ап'янення, станавілася іх індывідуальным духам на астатняе жыццё. У іншых індзейскіх плямёнаў візіянізм быў сродкам кантакту з пэўным духам – напрыклад, магутным *маніта*. Дзеля дасягнення кантакту з ім таксама практыкавалі галадоўкі, лазню, дзе на камяні лілі адвар з галюцынагенных грыбоў. З мэтай паскарэння кантакту маглі нават прычыніць сабе боль, адрэзаць палец. Кантакт з духам быў неабходны перад паляваннем, вайсковым паходам і г. д. Індывідуалістычныя культы збольшага характэрныя для паляўнічых і збіральнікаў.

Другой ступенню арганізацыі рэлігійнага жыцця паводле Уоласа з'яўляецца *шаманізм*. Шаман – гэта рэлігійны адмысловец, які сумяшчае сваю дзейнасць са звычайнымі гаспадарчымі заняткамі. Само слова «шаман» запазычанае з мовы сібірскіх тунгусаў і абазначае ўзбуджанага чалавека. Сібір увогуле лічыцца класічным рэгіёнам шаманізму. Але сустракаецца ён па ўсім свеце, асабліва сярод карэнных народаў Амерыкі і на Афрыканскім кантыненце. Пры гэтым, як ні дзіўна, функцыі і рэлігійныя тэхналогіі шаманізму выглядаюць вельмі падобнымі між сабою. Шаман – гэта пасярэднік паміж звычайным, секулярным светам людзей і сакральным светам духаў. Свае здольнасці шаман выкарыстоўваў на патрабаванне кліентаў. Тыповая нагода звароту да шамана – гэта хвароба або неабходнасць даведацца пра будучыню напярэдадні далёкай вандроўкі ці ўзброенага сутыкнення, ці нейкай іншай складанай падзеі. Дзеля дасягнення кантакту з духамі шаманы выконвалі рытмічныя манатонныя спевы (так званае камланне), танчылі, упадалі ў стан трансу, моцна пацелі, пачыналі размаўляць чужымі галасамі



*Сібірскі шаман*

і, урэшце, трацілі прытомнасць, што і лічылася прыкметай звышнатуральнага кантакту. Уяўлялася, што душа шамана ўступае ў перамовы з духамі, часам змагаецца з імі. Пасля выхаду з трансу шаман паведамляў стаўленне духаў да праблемы і прызначаў пэўнае лекаванне. У народаў субсахарскага рэгіёна Афрыкі існавала спецыялізацыя шаманаў: былі шаманы-дыягносты, якія вызначалі прычыну хваробы (ад чужой замовы, парушэння табу ці ад злых духаў) і накіроўвалі да пэўнага спецыяліста.

Трэба адзначыць, што ў дзеяннях шаманаў было шмат момантаў, якія мы маглі б назваць рацыянальнымі. Па-першае, шмат хто з іх быў выдатным знаўцам фітатэрапіі. Нездарма сёння вядучыя фармакалагічныя карпарацыі свету ахвотна пераймаюць рэцэпты шаманаў. Па-другое, напрыклад, сярод карэнных народаў Амерыкі шаманы выкарыстоўвалі так званую катарсічную (ачышчальную) магію, якая ўключала ўстрыманне на пэўны час ад ежы, лазню з парай, кровапусканне для паніжэння крывянога ціску, прымусовае ванітаванне для ачышчэння страўніка і г. д. Да гэтага трэба дадаць моцнае псіхатэрапеўтычнае ўздзеянне, асабліва калі гаворка ішла пра прадказанне будучыні. Рэч у тым, што праблема выбару – гэта ці не адна з самых складаных псіхалагічных задач, з якімі сутыкаецца кожны чалавек. Папулярнасць шаманаў, варажбітак, астралагічных прагнозаў палягае не ў тым, што яны прадказваюць будучыню, а ў тым, што яны падштурхоўваюць да дзеяння, вызваляюць асобу ад псіхалагічнай адказнасці за прынятае рашэнне і перакладаюць яе на звышнатуральныя сілы («так вырашылі зоркі, духі» і г. д.).

Паслугі шамана звычайна кампенсаваліся, але яны не былі настолькі вялікімі, каб зрабіць гэты занятак прафесійным. Колькасць шаманаў істотна розніласся ў паасобных народаў. Напрыклад, у хівара, карэннага народа вярхоўяў Амазонкі, амаль кожны чацвёрты мужчына быў шаманам. Але звычайна іх было ўсё-ткі менш. Часцей за ўсё шаманамі былі мужчыны. Аднак у шэрагу народаў Сібіры – ітэльменаў, якутаў, буратаў – жанчыны не толькі дапускаліся да гэтай дзейнасці, але лічыліся мацнейшымі за мужчынаў. Шаманам можна было стаць самастойна – паводле паклікання, праз навучанне ці атрымаўшы спадчыну. Шмат якія даследчыкі звярталі ўвагу

на сувязь шаманізму і псіхічных асаблівасцяў чалавека: напрыклад, схільнасці да істэрыі. У эскімосаў Канады існавала ўяўленне, што шаманам можа зрабіцца чалавек, які мае здольнасць кантактаваць з пэўным духам, колькасць якіх была абмежаваная. Права на кантакт можна было атрымаць у спадчыну ці ў дар. Аднак развіццё гандлю з еўрапейцамі ўнесла карэктывы і ў гэтую сферу: права доступу цяпер можна было набыць за грошы. Шаманізм не мае дакладнай прывязкі да нейкай адной стратэгіі жыццезабеспячэння: ён практыкуецца паляўнічымі і збіральнікамі, пастаралістамі і ручнымі земляробамі.

Наступны ўзровень арганізацыі рэлігійных вераванняў – абшчынныя культы. Галоўнае іх адрозненне ад індывідуалістычных культаў і шаманізму – падкрэслена калектыўны характар узаемадачыненняў з сакральным светам. Абшчынныя культы не выключалі ўдзелу рэлігійных спецыялістаў, але часцей за ўсё яны былі непатрэбнымі. Рытуалы абшчынных культаў часта мелі каляндарны характар: яны былі звязаныя з порамі году, гаспадарчымі заняткамі. Іншы варыянт – адзначэнне калектыўнай змены сацыяльнага статусу (так званыя абрады пераходу).

Тыповы прыклад каляндарных рытуалаў – абрады размнажэння ў абарыгенаў Цэнтральнай Аўстраліі. Яны адбываліся напярэдадні дажджлівага сезону, падчас якога адбываўся інтэнсіўны рост раслін і размнажэнне жывёлаў. Кожная абшчына мела ўласны татэмічны цэнтр – прастору з незвычайнай формай рэльефу (глыбокая лагчына, скала) ці адметнай расліннасцю. Мэта рытуалаў – стымуляваць прыроду, асабліва тую яе частку, якая мела прамысловы сэнс, да размнажэння. Яны ўключалі заклінанні, спевы, танцы, якія павінны былі натхніць расліны і жывёл размнажацца. Часта для гэтага пралівалі некалькі кропель крыві, выкарыстоўвалі сімвалы ці выявы жывёлы, якая павінна была размножыцца. Рытуал завяршаўся сумесным паяданнем мяса татэмнай жывёлы, што павінна было ўзмацніць звышнатуральную сувязь з ёю. Цікава, што абрады, падобныя сваім сэнсам да аўстралійскіх, былі вядомыя і беларусам. Яны, аднак, насілі індывідуальны характар. Перад пачаткам пасеву жыта муж з жонкай «качаліся» на полі, каб паказаць зямлі, што яна павінна рабіць з зернем.

Найбольш тыповыя абрады пераходу былі звязаныя з уступленнем моладзі ў разрад дарослых. Яны шырока вядомыя сярод карэнных народаў Аўстраліі і субсахарскага рэгіёну Афрыкі. Цэнтральнае месца сярод іх займалі абрады ініцыяцыі – уласна пасвячэння ў дарослыя. Аднак падрыхтоўка да іх магла складаць месяцы і гады. У аўстралійскіх абарыгенаў, напрыклад, хлопчыкі-падлеткі на працягу некалькіх гадоў праходзілі адмысловае навучанне пад кіраўніцтвам дасведчанага паляўнічага. Яно ўключала засваенне шырокага кола ведаў практычнага і тэарэтычнага характару. Апроч навыкаў палявання, хлопчыкі атрымлівалі геаграфічныя (прастора вандравання абшчыны), біялагічныя (раслінны і жывёльны свет), медыцынскія, гістарычныя (веданне радаводу), міфалагічныя веды. «Кандыдатаў у дарослыя» вучылі прыгожа рухацца, годна сябе паводзіць, красамоўна гаварыць. Дарэчы, каралася ўжыванне нецэнзурнай лексікі, якое, як лічылася, могуць сабе дазволіць толькі дзеці і жанчыны. Асаблівая ўвага надавалася развіццю творчых здольнасцяў: падчас ініцыяцыі трэба было скласці казку на зададзены сюжэт. Уласна пасвячэнне ў дарослыя складалася з некалькіх этапаў: развітання са становішчам дзіцяці, уласна пераход, далучэнне да свету дарослых. Пераход уключаў у сябе такія ініцыяцыі, як, напрыклад, выпрабаванне ведаў і, вельмі часта, выпрабаванне болем. Апошні від выпрабавання мог адбывацца самымі неверагоднымі спосабамі. У абарыгенаў Аўстраліі маглі выдзіраць частку валасоў на галаве, рабілі надрэзы на скуры, падсмажвалі (не надта моцна) на вогнішчы, у мбуці ў Экватарыяльнай Афрыцы скалвалі пярэднія зубы, каб надаць ім форму іклоў, але ў пераважнай большасці народаў рабілі хірургічныя аперацыі на палавых органах



*Падчас абраду пераходу ў сучаснай Кеніі*

(абразанне). Апошняя традыцыя захавалася ў іўдаізме і ісламе, але яна не звязана непасрэдна з ініцыяцыяй. Аналагічныя аперацыі рабілі і дзяўчатам (такі абрад захаваўся і сёння шмат у якіх народаў субсахарскага рэгіёна Афрыкі). Увогуле, абшчынныя культы характэрны для самых розных стратэгій жыццезабеспячэння, ад палявання і збіральніцтва да агракультуры.

Найбольш складаная форма арганізацыі вераванняў – *эклезіястычны культ*. Яго характэрнай асаблівасцю з'яўляецца прафесіяналізацыя рэлігійных спецыялістаў. Само слова «эклезіяст» у перакладзе з грэцкай абазначае «прапаведнік». Прафесійныя святары, у адрозненне ад шаманаў, выконвалі свае абавязкі рэгулярна, часцей за ўсё на каляндарнай аснове. Другой асаблівасцю эклезіястычных культаў з'яўляецца наяўнасць спецыяльных пабудоў для рэлігійных мэтаў, выкарыстанне сінтэзу мастацтваў – жывапісу, скульптуры, музыкі і г. д. – дзеля ажыццяўлення кантакту са звышнатуральным светам.

Практычна ва ўсіх выпадках эклезіястычныя культы звязаны з сацыяльнымі сістэмамі, з дзяржаўнай формай кіравання. Таму няма нічога дзіўнага, што рэлігійная структура гэтак сама, як і дзяржаўная, стварае іерархію святароў, падобную да іерархіі дзяржаўных чыноўнікаў, і працуе паводле аналагічных прынцыпаў. Нярэдка царкоўная іерархія цесна злучаная з дзяржаўнай: святары могуць станавіцца палітычнымі лідарамі ці, наадварот, палітычныя лідары – напрыклад, каралі – фармальна ўзначальваюць рэлігійную арганізацыю. Жанчыны на пасады прафесійных святароў у пераважнай большасці эклезіястычных культаў не дапускаюцца, а на пасады ў найвышэйшай, кіроўнай частцы іерархіі – не дапускаюцца практычна ва ўсіх.

Яшчэ адна даволі частая асаблівасць эклезіястычных культаў – надзвычайная неталерантнасць да іншых формаў рэлігіі. Іншыя формы рэлігіі – індывідуалістычныя культы і асабліва шаманізм – звычайна абвяшчаюцца паганствам і сістэматычна праследуюцца. Падобнае стаўленне існуе і ў дачыненні да іншых эклезіястычных культаў. Але, як гэта ні дзіўна, ці не найбольшы ўзровень узаемнай агрэсіі ўзнікае паміж канфесійнымі напрамкамі адной і той рэлігіі: паміж сунітамі і шыітамі ў ісламе, пратэстантамі, рымакаталікамі,

уніятамі і праваслаўнымі ў хрысціянстве. У змаганні з іншаверцамі эклезіястычныя культавыя арганізацыі часцей за ўсё імкнуцца абапірацца на дзяржаўную ўладу. У цэлым эклезіястычныя культы заўсёды з'яўляліся істотнай складоваю часткай сацыяльнага кантролю, часам падобнага да таго, які практыкаваўся таталітарнымі рэжымамі XX ст. Ён выяўляўся ў выпрацоўцы надзвычайнай рэгламентацыі паводзінаў, ужыванні жорсткіх негатыўных санкцый за іх парушэнне, аж да смяротнага пакарання.

Эклезіястычныя культы ўзнікаюць разам са старажытнымі цывілізацыямі. Да іх належаць рэлігіі старажытных егіпцян, жыхароў Месапатаміі, антычнай Грэцыі і Рыма, дакалумбавых цывілізацый Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыкі і г. д. Разам з тым, далёка не заўсёды стварэнне цывілізацыі суправаджалася стварэннем адпаведнай эклезіястычнай рэлігіі. Тыповым прыкладам у гэтым сэнсе з'яўляецца Кітай. Канфуцыянства, якое памылкова часта называюць адной з сусветных рэлігій, у сапраўднасці вельмі адрозніваецца ад эклезіястычных культаў. Галоўнае, што ў ім практычна адсутнічаюць прафесійныя святары. Канфуцыянства – гэта ў большай ступені сістэма традыцыйных нормаў паводзінаў, адаптаваных да патрэбаў грамадства з дзяржаўнай формай кіравання. Яшчэ адна асаблівасць – адсутнасць рэлігійнай манаполіі, характэрнай для іншых культавых сістэм эпохі старажытных цывілізацый. Канфуцыянства мірна суіснавала з даасізмам і будызмам.

Найвышэйшага ўзроўню развіцця эклезіястычныя культы дасягаюць у форме так званых сусветных рэлігій: будызму, хрысціянства, ісламу. Развіццё індустрыяльнага і постіндустрыяльнага грамадстваў значна зменшыла значэнне рэлігійнасці ў грамадстве. Разам з тым, традыцыйная прыналежнасць краіны нават у мінулым да той ці іншай рэлігіі здольная і сёння істотна ўплываць на паводзіны людзей. Хоць дакладнай статыстыкі рэлігійнай прыналежнасці няма, пэўныя ўяўленні аб колькасці людзей, арыентаваных на тую ці іншую рэлігійную традыцыю, скласці можна. Такі падыход улічвае так званых «намінальных» і «этнічных» вернікаў.

Згодна з прыкладнымі падлікамі, найбуйнейшай паводле колькасці вернікаў сучаснай рэлігіяй (у 2015 г.) з'яўляецца хрысціянства – 2419 млн чалавек, або 33% насельніцтва планеты.

Каля ⅓ ўсіх хрысціян жыве ў Паўднёвай і Паўночнай Амерыцы (806 млн), у Еўропе (разам з Расіяй; 560 млн), Афрыцы (541 млн), Азіі (375 млн), Акіяніі (25 млн).

Хрысціянства не толькі найбуйнейшая паводле колькасці вернікаў, але і самая складаная паводле сваёй структуры рэлігія. Яна складаецца з асобных плыняў, якія звычайна называюць *канфесіямі*. Самая вялікая з іх – рымска-каталіцкая, да якой належыць 1239 млн чал. Гэта ўвогуле найбуйнейшая рэлігійная структура сучаснасці, якая мае цэнтралізаванае кіраванне. Каталіцызм пашыраны ў Паўднёвай і Цэнтральнай Еўропе, Польшчы, Літве, Ірландыі, Паўднёвай і Цэнтральнай Амерыцы, у Паўднёвай Карэі, на Філіпінах, у некаторых краінах Цэнтральнай Афрыкі. Да гэтай канфесіі адносяцца ўсходнія каталіцкія цэрквы, у тым ліку ўкраінская грэка-каталіцкая царква (4,5 млн) і мараніцкая каталіцкая царква ў Ліване (3,1 млн). У Беларусі да «намінальных» каталікоў можна аднесці ад 12 да 20% насельніцтва. Невялікая супольнасць адносіцца да Беларускай грэка-каталіцкай царквы.

Агульную колькасць пратэстантаў ацэньваюць у 900–920 млн чал. Пратэстантызм у найбольшай ступені пашыраны ў Заходняй і Паўночнай Еўропе, Паўночнай Амерыцы, Субсахарскай Афрыцы, асабліва – на поўдні, Аўстраліі і Новай Зеландыі. У адрозненне ад каталіцызму, пратэстантызм надзвычай разнастайны – адзінай арганізацыі ён не мае. Найбуйнейшыя яго плыні – баптызм (да 105 млн), лютэранства (90 млн), кальвінізм (да 100 млн), англіканства (да 85 млн). У Беларусі сёння няма дакладнай статыстыкі колькасці вернікаў-пратэстантаў, але вядома, што паводле колькасці прыходаў яны перавышаюць праваслаўных і каталікоў.

Усходняе праваслаўе налічвае каля 283 млн вернікаў. Яно прадстаўленае галоўным чынам на Балканах, Усходняй Еўропе і Расіі. Асобныя праваслаўныя цэрквы знаходзяцца ў складаных стасунках паміж сабой. Найбуйнейшай цэнтралізаванай структурай з'яўляецца Руская праваслаўная царква, якая налічвае да 150 млн вернікаў у Расіі, Украіне, Беларусі і Малдове. Акрамя таго, вялікую колькасць вернікаў маюць праваслаўныя цэрквы ў Румыніі (23 млн), Грэцыі (15 млн), Сербіі (11 млн), Балгарыі (10 млн),



*Карта пашырэння сучасных рэлігій*

Грузіі (3,5 млн). У Беларусі праваслаўныя складаюць большасць вернікаў – паводле розных падлікаў, ад 50 да 80%.

Так званыя старажытныя ўсходнія праваслаўныя цэрквы налічваюць да 85 млн прыхільнікаў на Блізкім Усходзе і ў Афрыцы. Найбуйнейшымі сярод іх з'яўляюцца Эфіопская праваслаўная царква (да 48 млн чал.), Копцкая праваслаўная царква (да 15 млн), Армяна-Грыгарыянская царква (да 9 млн).

Мусульмане складаюць другую паводле колькасці вернікаў сусветную рэлігію – 1703 млн чалавек, або 23,5% насельніцтва планеты. Мусульмане кампактна расселеныя на Блізкім Усходзе, у Афрыцы, Цэнтральнай і частках Паўднёвай і Паўднёва-Усходняй Азіі. У адрозненне ад хрысціянства, мусульмане вызначаюцца большым канфесійным адзінствам: большасць з іх з'яўляюцца сунітамі (да 90%), астатнія – шыітамі. Пераважная большасць шыітаў жыве ў чатырох краінах: Іране, Азербайджане, Іраку і Бахрэйне. Суніты-мусульмане – найбуйнейшая паводле колькасці вернікаў сусветная канфесія; на сённяшні дзень, аднак, у адрозненне ад каталікоў, яна не мае цэнтралізаванай сістэмы кіравання. Самыя вялікія паводле колькасці насельніцтва мусульманскія краіны – гэта Інданезія, Пакістан і Бангладэш. У Беларусі мусульмане жывуць ужо больш за 600 гадоў, але агульная колькасць іх невялікая, да 0,3% насельніцтва.

Будызм – найменшая паводле колькасці вернікаў сучасная су-

светная рэлігія: усяго разам да 520 млн чалавек, або 7%. Хоць будызм нарадзіўся ў Індыі, пашыраны ён пераважна за яе межамі. Каля паловы будыстаў жыве ў Кітаі, дзе яны складаюць да 18% насельніцтва. А найбольшымі ўласна будысцкімі краінамі з'яўляюцца Камбоджа, М'янма і Тайланд, у якіх доля будыстаў складае ад 87% да 96% усяго насельніцтва. Значная колькасць прыхільнікаў будызму жыве таксама ў Японіі і Паўднёвай Карэі.

Да ліку сусветных рэлігій нярэдка адносяць індуізм, які мае вялікую колькасць вернікаў – 984 млн чалавек, або 13,4% насельніцтва планеты. Аднак пашыраны ён пераважна ў двух краінах – Індыі і Непале. У сапраўднасці індуізм вельмі моцна адрозніваецца ад іншых вялікіх рэлігій. Гэта, хутчэй, супольная назва для вялікай колькасці разнастайных культаў, якія не маюць адзінай дактрыны, арганізацыі і г. д. Індуізм дазваляе верніку самастойна выбіраць, што менавіта будзе асновай яго духоўнай практыкі.

Дастаткова вялікая частка чалавецтва адносіцца да так званых этнічных рэлігій – усяго да 300 млн чалавек, або 4% насельніцтва планеты. Найбольш вядомыя прыклады – гэта іўдаізм (каля 14 млн чалавек), сікхізм (25 млн). Акрамя гэтага, больш за 1660 млн чалавек (22,6%) увогуле не лічаць сябе рэлігійнымі. Аднак трэба разумець, што гэтыя падлікі вельмі і вельмі прыблізныя. Згодна з сацыялагічнымі апытаннямі, найбольшая доля нерэлігійнага насельніцтва зафіксавана ў Чэхіі (75%), Эстоніі (70%) і Нідэрландах (68%). У Беларусі яна складае каля 44%.

Нягледзячы на тое, што сфера рэлігіі адрозніваецца выключным кансерватызмам, яна непазбежна павінна адаптавацца да зменаў у грамадстве. У выніку такіх перамен могуць узнікаць не толькі новыя плыні старых рэлігій, але і прынцыпова новыя з'явы. Сярод іх часта згадваецца так званыя «карга культы», якія ўзніклі ў сярэдзіне XX ст. у Меланезіі пад уплывам дзвюх істотных падзей. Па-першае, у выніку місіянерскай дзейнасці хрысціянскіх святароў умацавалася ўяўленне аб адзіным духу свету. Па-другое, вельмі моцнае ўражанне зрабілі падзеі Другой сусветнай вайны, падчас якой у Меланезіі былі размешчаныя брытанскія і амерыканскія войскі. Брытанцы выкарыстоўвалі абарыгенаў на будаўнічых работах і выплачвалі ім невялікія грошы. Амерыканцы ў гэтым дачыненні былі болей шчо-

дрыя і, што самае галоўнае, пакінулі меланезійцам пасля заканчэння вайны вялікую колькасць вайсковага рыштунку – рыдлёвак, сякер, намётаў і г. д., якія проста не было сэнсу цягнуць назад у Амерыку. Усё гэтае багацце меланезійцы называлі пазычаным словам *карга* – *cargo*, груз. У іх склалася ўяўленне, што адзіны, вярхоўны дух кантралюе карга і размяркоўвае паміж народамі ў залежнасці ад якасцяў кожнага. Англічане ў гэтым плане выглядалі горш, амерыканцы – значна лепш. Сябе ж меланезійцы палічылі вартымі пэўнай часткі сусветнага карга. Лагічнай была выснова, што, каб яго атрымаць, трэба паводзіць сябе такім самым чынам, як амерыканцы.



*Карга культ у Меланезіі*

У сувязі з тым, што грузы траплялі на выспы з дапамогаю самалётаў і караблёў, яны рабілі іх мадэлі з трыснягу. Адначасова будаваліся копіі аэрадромаў. Спецыяльна прызначаныя хлопцы ў навушніках, зробленых з палавінак какосавых арэхаў назіралі за небам і морам у чаканні, калі прыбудзе абяцанае карга. Праз пэўны час культ вычарпаў сябе, але сёння палітолагі выкарыстоўваюць яго для вызначэння палітычных інстытутаў у краінах трэцяга свету, якія знешне імітуюць заходнія.

## Падсумаванне

Рэлігія – адзін з найбольш разнастайных бакоў чалавечай культуры. Рэлігійныя вераванні адрозніваюцца паводле спосабу ўяўлення звышнатуральных сіл, а таксама па форме арганізацыі самога культу. Пераважная большасць сучасных рэлігій належыць да тыпу эклезіястычных культаў, росквіт якіх адбыўся ў часы агракультурных грамадстваў. Аднак і сёння рэлігія захоўвае свой уплыў на большую (да ¾) частку чалавецтва.

# Замест заключэння,
# або
# ці ёсць у амерыканскіх індзейцаў душа

2 чэрвеня 1537 года Рымскі Папа Павел III выдаў булу пад назвай *Sublimis Deus*, у якой абвяшчалася, што амерыканскія індзейцы напраўду ёсць людзьмі. Іх, а таксама іншыя народы, якія яшчэ маглі быць адкрытыя ў будучым, не дазвалялася пазбаўляць волі і маёмасці, ператвараць у рабоў, нават калі яны яшчэ не сталі хрысціянамі. Адваротная думка, паводле якой індзейцы ёсць нямымі жывёламі, створанымі выключна для паслуг (еўрапейцам), і няздольныя ўспрыняць хрысціянскую веру, абвяшчалася варожай людскому роду.



*Була папы Паўла III*
Sublimis Deus

Гэты невялікі дакумент, памерам на адну старонку, адыграў надзвычай вялікую ролю ў лёсе насельніцтва Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі, Афрыкі, дый культуры ўсяго чалавецтва. У чым тут справа і навошта Папу трэба было зацвярджаць тое, што, здавалася б, і так ёсць відавочным? Праблема, аднак, была вельмі не простая. Уладары новых тэрыторый у Амерыцы ставіліся да мясцовага насельніцтва як да быдла, бо ў пэўнай ступені гэтаму спрыяў лад тагачаснага антрапалагічнага мыслення. Біблія, аўтарытэт якой быў непахісны, давала вычарпальную класіфікацыю народаў свету, як нашчадкаў сыноў Ноя: Сіма, Хама і Яфета. Яна цалкам адпавядала

ведам, што былі ў еўрапейцаў да Вялікіх геаграфічных адкрыццяў. Аднак месца для індзейцаў у гэтай карціне не было, а значыць не было і падстаў лічыць іх людзьмі. Адсюль і вынікала зручнае для каланізатараў атаясамленне іх з нямымі жывёламі.

Адным з першых паспрабаваў знайсці выйсце з гэтай сітуацыі каталіцкі біскуп Чыяпасу Барталамэ дэ лас Касас, моцна ўражаны зверствамі суайчыннікаў у адносінах да абарыгенаў. Ён сцвярджаў, што індзейцы не проста людзі, а нашчадкі так званых «страчаных дзесяці каленаў (плямёнаў) ізраілевых». Сапраўды, у Бібліі ёсць згадка пра тое, што пасля захопу Ізраільскай дзяржавы Асірыяй (прыкладна ў VIII ст. да н. э.), дзесяць з дванаццаці габрэйскіх плямёнаў трапілі ў палон і потым кудысьці зніклі. Шмат пра якія народы пісалі, што яны нашчадкі гэтых плямёнаў. Сярод іх згадвалі аддаленыя групы габрэйскай дыяспары – напрыклад, бухарскіх і нігерыйскіх габрэяў, караімаў, якіх вывеў з Крыму і пасяліў у Троках у канцы XIV ст. вялікі князь Вітаўт; скіфаў і кімерыйцаў (карэнных жыхароў Крыма), курдаў, ірландцаў, народ цянь у Кітаі і г. д. Таму прапанова дэ лас Касаса, падтрыманая яшчэ адным біскупам, Дыега дэ Ланда, выглядала цалкам слушнай. Прызнанне індзейцаў людзьмі значыла, што ў іх ёсць душа. Гэта, у сваю чаргу, стварала вялікія магчымасці для павелічэння колькасці хрысціян і адпаведны фронт дзейнасці для каталіцкіх святароў.

Менавіта таму Барталаме дэ лас Касас і звярнуўся ў 1515 г. да іспанскага караля, а потым і да Папы з прапановай ліквідаваць рабства і прызнаць індзейцаў людзьмі. Зразумела, што супраць яе выступілі тыя, хто атрымліваў шалёныя даходы з новых іспанскіх калоній. І, каб неяк задаволіць і іх інтарэсы, дэ лас Касас палічыў магчымым замест індзейцаў выкарыстоўваць рабоў, завезеных



*Барталамэ дэ лас Касас*

з Афрыкі. Чаму гэтых нашчадкаў Ноя ён палічыў магчымым трымаць у жывёльным становішчы, сёння сказаць цяжка. Пазней дэ лас Касас выступаў супраць усіх формаў рабства. Аднак ужо было позна: ужо ў 1518 г. іспанскі кароль Карл V даў першы дазвол на дастаўку ў Ямайку 4000 рабоў з Афрыкі.

Славуты аргентынскі пісьменнік Хорхэ Луіс Борхес такім чынам вызначыў сутнасць і, галоўнае, неверагодныя вынікі гэтай падзеі: «У 1515 годзе айцу Барталомэ дэ лас Касасу стала вельмі шкада індзейцаў, якія знемагалі ад невыноснай працы ў пекле Антыльскіх залатых капальняў, і ён прапанаваў імператару Карлу V завозіць неграў – каб ад невыноснай працы ў пекле Антыльскіх залатых капальняў знемагалі негры. Гэтаму цікаваму вычварэнню пачуццяў філантропа мы абавязаныя незлічонымі наступствамі: адсюль блюзы Хэндзі, поспех у Парыжы мастака Усходняга берагу Педра Фігара, выдатная проза, прысвечаная рабам-уцекачам, іншага ўругвайца, дона Вінсэнтэ Росі, міфалагічная веліч Авраама Лінкальна, пяцьсот тысяч загінулых у вайне паміж Поўначчу і Поўднем, тры мільярды трыста мільёнаў, выдаткаваных на вайсковыя пенсіі, статуя ўяўнага Фалуча, уключэнне дзеяслова «лінчаваць» у трынаццатае выданне Акадэмічнага слоўніка, гарачая кінастужка «Алілуя», магутная штыкавая атака Салера на чале яго «смуглых» і «чорных» у Серыта, хараство пэўнай сеньярыты, негр, які забіў Марціна Ф'еро, пахабная румба «Эль Маністэра», перапынены і заточаны напалеонаўскі парыў Тусэна Луверцюра, крыж і змяя на Гаіці, кроў коз, заколатых нажом папалоа, хабанэра, як маці танга, танец кандомбе».

Па кожным з гэтых прыкладаў можна было б напісаць асобную кніжку, і я прапаную чытачам самастойна, зразумела, з дапамогаю



*Уільям Крыстафер Хэндзі*

«гугла», разблытаць гэты інтэлектуальны вузел. Спынюся толькі на самім пачатку ніткі – «блюзы Хэндзі». Гаворка ідзе пра Уільяма Крыстофера Хэндзі, славутага афраамерыканца, заснавальніка, «бацьку блюза».

Борхес невыпадкова пачынае свой пералік з джаза – магутнага феномена, які спалучыў музычныя традыцыі Афрыкі, Еўропы і Амерыкі і з якога, урэшце, паходзяць практычна ўсе без вынятку жанры і плыні сучаснай папулярнай музыкі. Шляхі гэтага спалучэння былі не простымі і пакручастымі. Чаму, напрыклад, у джазавай музыцы ці не найбольш папулярныя інструменты – гэта труба, саксафон, трамбон і гелікон? Усё вельмі проста: пасля той самай вайны, якую згадвае Борхес, якая каштавала ЗША паўмільёна ахвяраў, войска было дэмабілізаванае. Вайсковы рыштунак, у тым ліку неверагодная колькасць музычных інструментаў, што былі на ўзбраенні палкавых аркестраў, распрадавалі на аўкцыёнах. Кошты былі настолькі мізэрныя, што набыць іх маглі нават учарашнія рабы. І, як потым высветлілася, авалодалі яны імі куды лепш, чым іх белыя гаспадары.

А ў 1939 годзе пачатак Другой сусветнай вайны парадаксальным чынам спрычыніўся да пашырэння джаза ў Беларусі. Звязана гэта было з унікальнай асобай – джазавым музыкантам, якога лічылі «белым Луісам Армстрангам» ці «другой джазавай трубой свету», Эдзі Рознерам. Ён нарадзіўся ў Берліне, у сям'і польскіх габрэяў-эмігрантаў. У пачатку 1930-х, добра разумеючы, што значыць прыход нацыстаў да ўлады, Рознер пераехаў у Польшчу, дзе стварыў свой аркестр. А ў верасні 1939 года, музыкі паспелі трапіць у Беласток. Па іроніі лёсу, тагачасны партыйны кіраўнік Беларусі Панцеляймон Панамарэнка аказаўся фанатам джаза, і ў 1940 годзе быў створаны дзяржаўны джазавы аркестр БССР. Ён тады быў адным з двух у СССР.



*Эдзі Рознер і яго аркестр*

Да чаго ўсё гэта? Да таго, што развіццё культуры шмат у чым

абумоўленае магчымасцямі сінтэзу, зліцця разнастайных культурных традыцый. Каб музычныя традыцыі Афрыкі, Амерыкі і Еўропы былі аднолькавымі, мы б ніколі не пачулі не толькі Ульяма Хэндзі, але і Майкла Джэксана. «Культурная разнастайнасць у той самай ступені неабходная для сацыяльнай эвалюцыі, як генетычная – для біялагічнай», – сцвярджае даклад Рымскага клуба 2018 года. Я дадаў бы, што культурная разнастайнасць ёсць не толькі ўмовай развіцця – яна з’яўляецца неабходнай умовай паспяховай адаптацыі, інакш кажучы, выжывання чалавецтва. А дзеля яе захавання патрэбныя дзве рэчы: па-першае, прызнанне каштоўнасці «іншага», які́м бы дзіўным і нязвыклым яно не выглядала, а падругое, прызнанне каштоўнасці «свайго». Паважай чужое, шануй і барані сваё. Пра гэта і ўся мая кніга.

# Літаратура

Арутюнов, С. А., Рыжакова, С. И. Культурная антропология. – Москва: Весь мир, 2004. 216 с.

Бенедикт, Р. Хризантема и меч. Модели японской культуры / пер. с англ. – Москва: РОССПЭН, 2004. 256 с.

Геаграфія культуры Беларусі. Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў. *Рэжым доступу:* www.adu.by/images/2016/07/fz-geo-kult-bel-10kl.doc

Геннеп, А. Обряды перехода. Систематическое изучение обрядов / пер. с франц. –Москва: «Вост. литература», РАН, 1999. 198 с.

Гирц, К. Интерпретация культур / пер. с англ. – Москва: РООСПЭН, 2004. 560 с.

Говард, М. Сучасная культурная антрапалогія / пер. з англ. Навук. рэд. П. Церашковіч. – Мінск: БФС, 1995. 478 с.

Дуглас, М. Чистота и опасность / пер. с англ. – Москва: Канон-пресс-Ц и др., 2000. 288 с.

Леви-Брюль, Л. Сверхъестественное в первобытном мышлении / пер. с франц. – Москва: Педагогика-пресс, 1994. 608 с.

Леви-Стросс, К. Структурная антропология / пер. с англ. – Москва: Наука, Гл. ред. вост. лит., 1985. 536 с.

Леви-Стросс, К. Печальные тропики / пер. с фр. – Москва: АСТ и др., 2010. 441 с.

Малиновский, Б. Избранное: динамика культуры / пер. с англ. – Москва: Центр гуманит. инициатив, 2015. 464 с.

Малиновский, Б. Избранное: Аргонавты западной части Тихого океана / пер. с англ. – Москва: Центр гуманит. инициатив, 2015. 560 с.

Мид, М. Культура и мир детства / пер. с англ. – Москва: Наука, Гл. ред. вост. лит.,, 1988. 429 с.

Митин, И. И. Культурная география в СССР и постсоветской России. *Рэжым доступу:* http://gumgeo.ru/public/files/MitinMJIK.pdf

Морган, Л. Г. Лига ходеносауни, или ирокезов / пер. с англ. – Москва: Наука, 1983. 301 с.

Мос, М. Общества. Обмен. Личность: Труды по социальной антропологии / пер. с франц. – Москва: Вост. литература, 1996. 360 с.

Рагаўцоў, В. І. Мовы свету. Энцыкл. даведнік. – Магілёў: УА «МДУ імя А. Куляшова», 2009.
Рагулина, М. В. Культурная география: теории, методы, региональный синтез. – Иркутск: Сиб. отделение РАН, 2004. 171 с.
Редклифф-Браун, А. Р. Метод социальной антропологии / пер. с англ. – Москва: Канон-пресс-Ц и др., 2001. 416 с.
Сервье, Ж. Этнология / пер. с франц. – Москва: АСТ, Астрель, 2004. 158 с.
Тайлор, Э. Б. Первобытная культура / пер. с англ. – Москва: Политиздат, 1989. 57 с.
Уайт, Л. Избранное: эволюция культуры / пер. с англ. – Москва: РОССПЭН, 2004. 1064 с.
Фрезер, Д. Д. Золотая ветвь / пер. с англ. – Москва: Политиздат, 1986. 703 с.
Церашковіч, П. Глабальныя праблемы чалавецтва. Нарысы эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі сучаснасці. – Мінск: Зміцер Колас, 2018.
Цітоў, В. С. Народная спадчына: Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994.
Цітоў, В. С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура. – Мінск: Беларусь, 2001.
Эванс-Причард, Э. Э. Нуэры / пер. с англ. – Москва: Наука, 1985. 235 с.
Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве / Т. А.Навагродскі [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2009. 335 с.
Bollinger, D. E. Cultural Geography. – BJU Press, 2015.
Ferraro, G., Andreatta, S. Cultural anthropology. An applied perspective. – Wadsword Publishing, 2011. 480 p.
Haviland, W. A. Cultural Anthropology. – Harcorurt Brace College Publishers, 2007. 480 p.
Horton, J., Kraftl, P. Cultural Geographies: an introduction. – RoutledgeTaylor & Francis, 2018. 328 p.
Kottak, C. F. Cultural Anthropology. Appreciating cultural diversity. – McGraw-Hill, 2011. 512 p.
Mathews, M. Cultural Geography, student’s text. – BJU Press, 2008.
The Dictionary of Anthropology. Blackwell Publishers, 1997.

# ЗМЕСТ


УСТУП ........ 5
Пралог: гісторыя адной гравюры ........ 7

Раздзел 1. Канцэпцыя культуры ў культурнай геаграфіі і антрапалогіі ........ 13
Вызначэнне паняццяў «культура» і «культурная геаграфія» ........ 13
Культура як сродак задавальнення праблем чалавечага існавання ........ 15
Культура як форма адаптацыі. Прагматычнае і сімвалічнае значэнне культурнага ландшафту ........ 19
«Свае» і «чужыя»: адаптацыя да сацыяльнага асяроддзя ........ 21
Асноўныя метадалагічныя прынцыпы: універсалізм і культурны рэлятывізм ........ 22
Раздзел 2. Геаграфія біялагічнай разнастайнасці чалавецтва: расы ........ 28
Расавыя прыкметы ........ 28
Экватарыяльная, або негроідная, раса ........ 31
Амерыканска-азіяцкая, або мангалоідная, раса ........ 33
Еўразійская, ці еўрапеоідная, раса ........ 35
Пераходныя расавыя тыпы ........ 37
Ізаляваныя расы ........ 39
Раздзел 3. Лінгвістычная разнастайнасць чалавецтва ў геаграфічным вымярэнні ........ 43
Індаеўрапейская моўная сям'я ........ 45
Сіна-тыбецкая моўная сям'я ........ 51
Раздзел 4. Стратэгіі жыццезабеспячэння ........ 58
Паляванне і збіральніцтва ........ 58
Хорцікультура (гародніцтва), або ручная апрацоўка зямлі ........ 62
Пастаралізм ........ 65
Агракультура, або плужная (ворыўная) апрацоўка зямлі ........ 67
Індустрыялізаваная стратэгія жыццезабеспячэння ........ 68
Раздзел 5. Геаграфія традыцыйных формаў эканамічнай актыўнасці чалавецтва ........ 72
Кантроль рэсурсаў ........ 72

Вытворчасць ........ 74
Падзел працы ........ 76
Размеркаванне ........ 77
Раздзел 6. Геаграфія і эвалюцыя формаў сацыяльнай стратыфікацыі ........ 84
Эгалітарныя грамадствы ........ 85
Рангавыя грамадствы ........ 86
Каставыя грамадствы ........ 87
Класавыя грамадствы ........ 89
Гендарная стратыфікацыя ........ 92
Раздзел 7. Геаграфія традыцыйных палітычных сістэм ........ 99
Абшчынныя грамадствы ........ 100
Племянныя грамадствы ........ 101
Правадырствы ........ 103
Дзяржавы ........ 106
Раздзел 8. Геаграфія традыцыйных формаў сацыяльнага кантролю ........ 113
Раздзел 9. Геаграфія традыцыйных формаў шлюбу і сямейных стасункаў ........ 126
Вызначэнне і функцыі шлюбу і сям'і ........ 126
Табу інцэсту ........ 129
Экзагамія і эндагамія ........ 132
Крос-кузенны шлюб. Левірат і сарарат ........ 132
Эканамічныя аспекты шлюбу ........ 134
Тыпы сям`і паводле лакалізацыі месцажыхарства ........ 136
Колькасць сужэнцаў ........ 137
Паліандрыя ........ 140
Гістарычныя формы шлюбу і сям'і ........ 141
Раздзел 10. Геаграфія традыцыйных формаў сваяцтва ........ 147
Не-унілінейныя сваяцкія групыё ........ 153
Сістэмы сваяцтва ........ 154
Раздзел 11. Геаграфія традыцыйных формаў рэлігійнага жыцця ........ 160

Замест заключэння ........ 178
Літаратура ........ 183